WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

31 СНЕЖНЯ 2009 г.
ЧАЦВЕР
№ 250
(26608)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

# Свята там, дзе мы!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

Белы Тыгр 2010 года крочыць па зямлі ў пушыстым снежным футры — дзякуй, нябесная канцылярыя, за выдатныя дэкарацыі. Адыходны год, якім бы складаным і цяжкім ён ні быў, завяршаецца прыгожа. Зусім хутка праб'е гадзіннік, зазвіняць застольныя келіхі і затахкаюць яскравыя феерверкі ў гарадах і мястэчках. Але толькі ад нас залежыць, стане навагодняя ноч рамантычным цудам ці толькі ранішнім галаўным болем, прыйдзе ў дом Тыгр драпежным Шэр-Ханам або ласкавай коткай. Бо свята — гэта не штосьці вонкавае, не чараўнік у блакітным верталёце і нават не запрошаны Дзед Мароз з мехам падарункаў. Свята — гэта мы з вамі, нашы эмоцыі, пачуцці і ўчынкі. Прадчуванне свята стаіць на парозе і толькі чакае, каб яго ўпусцілі ў сэрцы. Раз, два, тры... Запускаем? Запрашаем!

Калі навагодні нумар атрымаўся цікавым і прымусіў вас дзе ўсміхнуцца, а дзе задумацца — для нас гэта таксама свята. Давайце несці яго адзін аднаму і ў наступным годзе, і разам мы пераадолеем любы шлях. Са святам вас, сябры! Моцы вам фізічнай і душэўнай, дасягнення ўсіх пастаўленых мэтаў, здароўя і дабрабыту. З Новым годам! Няхай ён будзе светлым і чыстым, як палоскі ў поўсці белага Тыгра.

**Вашы звяздоўцы.**

# Аляксандр ЛУКАШЭНКА: «РАСХОДЫ НА САЦЫЯЛЬНУЮ СФЕРУ

**Напярэдадні навагодніх святаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з прадстаўнікамі цэнтральных і рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі Беларусі. Прэс-канферэнцыя праходзіла ў прамым эфіры, а ўдзел у ёй праз тэлемасты змаглі ўзяць каля 250 журналістаў з розных рэгіёнаў краіны. Падчас больш як чатырохгадзіннай гутаркі былі закранутыя пытанні як вынікаў няпростага для сусветнай і беларускай эканомікі года, так і планаў на 2010 год. «Задачы амбіцыйныя, але выканальныя», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, запрашаючы да шчырай размовы. Менавіта такой яна і атрымалася — свае пытанні, часам даволі вострыя, змаглі задаць прадстаўнікі як дзяржаўных, так і недзяржаўных СМІ.**



Фота БЕЛТА.

## АБ ДЭВАЛЬВАЦЫІ

Беларусь змагла засцерагчы народ ад крызісу, адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Я бываў шмат у якіх краінах у перыяд крызісу. Я, вядома, не ўпіваюся гэтым, не ганаруся, крызіс закрануў і нас, але там мне кажуць так: «Мы зайздросцім вашаму народу, паколькі вы змаглі, наколькі гэта магчыма, засцерагчы яго ад гэтага крызісу, каб ён не адчуў гэты крызіс». Мы стараліся гэта зрабіць. Дрэнна мы зрабілі ці добра — гісторыя рассудзіць», — сказаў Прэзідэнт.

У прыватнасці, гаворачы аб праведзенай у пачатку 2009 года дэвальвацыі беларускага рубля, кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што гэта было звязана з эканомікай, з экспартам прадукцыі: «Наша эканоміка адкрытая, экспартаарыентаваная, таму мы іншай палітыкі не маглі дапусціць. Я вымушаны быў ісці на гэта, паколькі тады гэта было аб'ектыўна, каб не загнаць сябе ў кут».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што зніжэнне курсу беларускага рубля ў пачатку 2009 года было абумоўлена выключна аб'ектыўнымі прычынамі. «Не ў нас гэта прычына, не ў нашай плоскасці ляжалі прычыны дэвальвацыі нацыянальнай валюты. Гэта пытанне абсалютна аб'ектыўнага развіцця сітуацыі ў 2009 годзе, — падкрэсліў ён. — Пачалося гэта яшчэ ў сярэдзіне 2008 года, калі даў аб сабе знаць сусветны фінансавы крызіс. Затым ён прыйшоў да нас. Мы, скажу шчыра, нават спазніліся з дэвальвацыяй нацыянальнай валюты. Гэта трэба было зрабіць у канцы 2008 года».

«Мы абяцалі людзям у 2008 годзе адпаведны калідор, і мы ўтрымаліся ў гэтым калідоры. Мы маглі б, напэўна, і не дэвальваваць нацыянальную валюту, але сёння мы не гаварылі б аб прыкладна пяцімільярдным золатавалютным запасе», — дадаў кіраўнік дзяржавы. Расійская Федэрацыя да гэтага часу мела дэвальвацыю ўжо 25 працэнтаў або нават больш. Гэта адбывалася і ў іншых краінах.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў: «Міжнародныя фінансавыя арганізацыі нам гэта таксама рэкамендавалі. Але калі хтосьці лічыць, што Лукашэнку нехта нешта прадыктаваў, у тым ліку і МВФ, то гэта проста памылковая думка. Ніхто ніколі ні мне, ні нашай краіне нічога не дыктаваў. Калі мы ішлі насустрач нашым партнёрам з Расійскай Федэрацыі, Кітая, Амерыкі, ЕС, міжнародных арганізацый, значыць, у нас была або бязвыхадная сітуацыя, або нам аб'ектыўна гэта трэба было».

Паводле слоў Прэзідэнта, перад старшынёй праўлення Нацыянальнага банка Пятром Пракаповічам тады была пастаўлена адна задача — задаволіць попыт насельніцтва на валюту. І нават калі ў нас менш за $1 млн золатавалютных рэзерваў застанецца, усё роўна аддаць яе ў абменнікі. Гэта было зроблена. У выніку ўжо праз тры месяцы валюта стала вяртацца ў банкі.

## АБ ТАРЫФАХ ЖКГ

Узровень пакрыцця насельніцтвам затрат на паслугі ЖКГ у 2010 годзе не перасягне 35 працэнтаў, заявіў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што сёння насельніцтва пагашае расходы на паслугі ЖКГ прыкладна на 30 працэнтаў, тады як раней гэты паказчык складаў 52 працэнты. Паводле слоў Прэзідэнта, дрэнна, што ёсць такое падзенне, бо ў перспектыве кожны павінен у поўным аб'ёме аплачваць паслугі, якія спажывае. «Але ў нас сацыяльная дзяржава, мы сацыяльна абараняем сваіх людзей. Узнікае пытанне: ці могуць людзі 100 працэнтаў заплаціць? Не могуць, тым больш у крызіснай сітуацыі», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў 2008 годзе ў краіне быў забяспечаны добры ўзровень зарплаты. Разам з тым, сёлета рэальная заработная плата павялічылася толькі на 0,1 працэнта. «У гэтым годзе мы заработную плату толькі ўтрымалі на ўзроўні мінулага года. Узнікае пытанне, а ці змогуць усе заплаціць гэтыя 55 працэнтаў. Таму ў наступным годзе, я ўраду адкрыта заявіў, калі мы атрымаем пакрыццё 35 працэнтаў, то гэта будзе нармальна. Мы так і запланавалі. Будзе магчымасць у чалавека больш заплаціць, заплаціць больш, але пакуль я гэтага не бачу», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, Урад Беларусі ўносіў прапанову аб павелічэнні платы за паслугі ЖКГ на 7 долараў на працягу першага паўгоддзя. «Як бы людзі ні перажывалі, гэта было б пад'ёмна. Але з іншага боку, мы атрымліваем ад гэтага павышэння ўсяго толькі Br77 млрд, тады як бюджэт на наступны год — Br52 трлн. Ці трэба з народам, груба кажучы, сабачыцца за гэтыя Br77 млрд», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Вось калі мы ўбачым тэндэнцыю, што людзі маюць магчымасць заплаціць, за Лукашэнкам не заржавее, я ўтрыманцаў цярпець не магу», — дадаў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў неабходнасць аптымізацыі затрат і ў саміх жыллёва-камунальных службах. Ён адзначыў, што яму часта скардзяцца на недастатковую колькасць сродкаў у ЖКГ. «А вы палічылі, па якіх тарыфах мы прапануем насельніцтву электрычнасць, за якую цану смецце вывозім, капітальны рамонт робім, колькі там раскрадаецца і гэтак далей? Тры гады ва ўрадзе лічылі, і нарэшце прыйшлі і сказалі, што на 30 працэнтаў скарацілі запатрабаванні ЖКГ, — сказаў Прэзідэнт. — А калі яшчэ прыціснуць? Можа, яшчэ на 30 працэнтаў скароцяць. І тады тарыфы, па якіх вядзецца падлік, будуць зусім іншыя.

## АБ ПАДТРЫМЦЫ І ПРОДАЖЫ ДЗЯРЖПРАДПРЫЕМСТВАЎ

Дзяржава не будзе падтрымліваць дзяржпрадпрыемствы, якія неэфектыўна працуюць, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што размова ідзе менавіта аб прадпрыемствах, якія неэфектыўна працуюць, не выконваюць свае абавязацельствы. Што датычыцца падтрымкі дзяржпрадпрыемстваў у цэлым, то яна павінна аказвацца. «Ні ў адной краіне няма таго, каб з бюджэту не падтрымлівалі прадпрыемствы. Гэта нармальная практыка, што ўласнік укладае сродкі ў іх развіццё, — сказаў Прэзідэнт. — Мы проста абавязаны падтрымліваць прадпрыемствы, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці. Калі ты не можаш іх падтрымліваць, імі кіраваць, то лепш, напэўна, з імі расстацца, знайсці інвестара, прадаць. Але калі гэта дзяржпрадпрыемствы, іх трэба падтрымліваць, а за дзяржаўныя грошы трэба патрабаваць».

Тлумачачы сітуацыю на НВА «Інтэграл», Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што было сказана заканчваць падтрымку такіх прадпрыемстваў з бюджэту, бо ў свой час «Інтэграл» не выканаў узятыя на сябе абавязацельствы па стварэнні сучаснай вельмі складанай субмікроннай вытворчасці. «Паабяцалі, што пры фінансаванні, па-мойму, Br200 млрд у выглядзе крэдытаў, бюджэтнай дапамогі і г.д. на працягу некалькіх гадоў выйдуць на дакладную і складаную субмікронную вытворчасць, — сказаў Прэзідэнт. — Настаў час — там не выканалі, тут не зрабілі. Мала таго, трэба яшчэ Br50 млрд, або вось столькі мільярдаў. Якая павінна быць рэакцыя Прэзідэнта? Я сказаў: нагі вашай больш у бюджэце не будзе. Не выканалі — будзеце адказваць». Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта датычыцца і ўсіх іншых прадпрыемстваў, якія папрасілі ў доўг у дзяржавы, з дзяржбюджэту, але не выканалі сваіх абавязацельстваў.

Продаж беларускіх прадпрыемстваў будзе весціся толькі на выгадных краіне ўмовах і па прымальных цэнах. «Пытанне толькі ў адным — колькі заплаціце. Мы даўно пайшлі на прыватызацыю таго ці іншага прадпрыемства, на якое паклалі вока многія і ў Амерыцы, і ў Еўропе, і РФ. Але нам пакуль не далі тую цану, якую мы хочам. Будзе нармальная цана, будуць выкананы нашы ўмовы — мы на гэта пойдзем», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Усяго пры прыватызацыі павінна выконвацца каля 20—25 умоў. У прыватнасці, заработная плата за 3 гады на прадпрыемстве павінна павялічыцца як мінімум у 2 разы, ні адзін чалавек не павінен быць выкінуты з вытворчасці, падаткі неабходна павялічыць мінімум у 1,5-2 разы, мадэрнізаваць вытворчасць.

Напрыклад, у мадэрнізацыю «Нафтана» беларускім бокам было ўкладзена больш як $0,5 млрд. Чаму нашы заводы такія прывабныя для расіян? Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, яны канкурэнтаздольныя, вырабляюць добры тавар. У Расіі няма заводаў з такой глыбінёй перапрацоўкі нафты. У комплекс «Нафтан-Палімір» трэба ўкласці яшчэ $1,5 млрд. «Нафтан» гатовы былі забраць, а «Палімір» не. Я кажу не. Гэта прычэп. Не намі створаны. Нікуды ад гэтага не дзенешся. Там таксама людзі працуюць. Яны ў цеснай звязцы павінны працаваць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Мы будзем прыватызаваць, але так, як прынята ў нас. Не агулам, а канкрэтна прадпрыемства. Ёсць цікавасць да прадпрыемства — прыходзьце, сядзем за стол, будзем абмяркоўваць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

## АБ ЗНЕШНІХ ПАЗЫКАХ

Беларусь акуратна праводзіць палітыку знешніх пазык. «Калі мы мадэрнізуем якое-небудзь прадпрыемства (а цяпер гэты працэс шырока разгорнуты, гэта адзін з важнейшых напрамкаў дзейнасці ўрада), мы запазычваем у замежнікаў, купляючы ў іх абсталяванне, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Калі прадпрыемства нармальна працуе, яно здольна вярнуць гэтыя крэдыты».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што «мы дзейнічаем вельмі акуратна, вельмі асцярожна». «Нашы валавыя дзяржаўныя пазыкі ў цэлым складаюць каля 30 працэнтаў ад ВУП. Мы кантралюем гэты працэс і не хочам залезці ў даўгі настолькі, каб потым не выкарабкацца з іх, — сказаў Прэзідэнт. — Што датычыцца продажу БПБ-Банка Ашчаднаму банку Расіі, нам добра заплацілі за гэты банк, гэта вельмі ўдачная здзелка. Больш за тое, калі Расія сваімі рашэннямі заблакіравала прасоўванне ў нейкай ступені нашай прадукцыі на расійскі рынак, мы пачалі крэдытаваць і льгатаваць крэдыты для куплі нашай тэхнікі ў Расіі, Ашчадны банк падставіў сваё плячо, а ён дзейнічае па ўсёй Расіі. Мы вельмі добра правялі перагаворы з расійскім Ашчадным банкам, і я лічу гэта ўдачнай рэалізацыяй актываў і для нас вельмі выгаднай у гэтай сітуацыі».

## АБ БУДАЎНІЦТВЕ АЭС

Беларуская АЭС будзе пабудавана на Астравецкай пляцоўцы, паведаміў кіраўнік дзяржавы. «Атамную станцыю мы будаваць будзем. Будзем будаваць яе ў Астраўцы. Гэта адназначна. Рашэнне аб гэтым, пісьмова ці вусна, будзе прынята ў найбліжэйшы час», — заявіў Прэзідэнт.

Узнімаючы пытанні бяспекі будучай АЭС, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Кожны крок, перш чым зрабіць, вывяраецца дзясяткі разоў. Мы пабывалі і ў Японіі, і ў Францыі, і ў Амерыцы, і ў Германіі, і ў Кітаі, і ў Расіі — на ўсіх лепшых у свеце атамных станцыях. Мы паглядзелі розныя праекты, каб засцерагчы ад небяспекі наш народ і атрымаць нармальны ўнікальны аб'ект у цэнтры Еўропы, з добрым танным прадуктам у будучыні». Акрамя таго, Прэзідэнт нагадаў, што Беларусь па перыметры акружана АЭС, а сама не мае таннай, экалагічна выгаднай энергіі, якую дасць станцыя.

«Будаўніцтва новай станцыі нявыгадна еўрапейцам, магчыма, нават расіянам. Таму што мы пачынаем вырабляць свой танны тавар. А гэта значыць, страта рынку. Калі мы атрымаем на 20 працэнтаў больш сваёй энергіі, то гэту колькасць мы не купім у Расіі і ва Украіне. А там лішак гэтага тавару», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што цяпер ідуць неабходныя тэхнічныя працэдуры, вядзецца работа з МАГАТЭ, суседнімі краінамі. У Астраўцы пачата ўжо будаўніцтва інфраструктуры. Як лічыць Аляксандр Лукашэнка, будаўніцтва АЭС на гэтай пляцоўцы — добрая перспектыва для названага рэгіёну.

Кіраўнік дзяржавы таксама дадаў, што ў Беларусі будзе прадоўжана развіццё і касмічных праграм, і атамных тэхналогій для таго, каб даць магчымасць спецыялістам працаваць на высокіх тэхналогіях і не страціць напрацаваную школу.

## АБ ВЫБАРАХ

У Беларусі пройдуць сумленныя і прыстойныя выбары, заявіў Аляксандр Лукашэнка. «Мы правядзём выбары сумленна і прыстойна. Як яны пройдуць, ужо было сказана ў свой час на нарадах у Прэзідэнта, у тым ліку па лібералізацыі выбарчага заканадаўства», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Я не хвалююся ў сувязі з выбарамі, ці гэта выбары ў парламент, ці мясцовыя або прэзідэнцкія. Пытанне ў тым, будзе нармальна развівацца эканоміка, выканаем мы тое, што абяцалі, людзі падтрымаюць уладу, дзеючага Прэзідэнта (калі ён захоча выбірацца на наступны тэрмін) і падтрымаюць канструктыўна настроеных дэпутатаў. Не будзе гэтага, будуць іншыя людзі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым ён запэўніў, што ні на мясцовых выбарах, ні на іншых ніякага націску не будзе, асабліва на прэзідэнцкіх.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, надышоў той перыяд, калі ніякай барацьбы з яго боку не павінна быць — ні за прэзідэнцкую пасаду, ні за тое, каб адміністрацыйна ўплываць на гэты працэс. Людзі самі павінны вырашыць.

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб першых выбарах, калі яго выбіралі. «Адна з прычын маёй перамогі была ў гэтым жудасным націску людзей, якія былі не першы год на чале ўлады. Такая сітуацыя і ў мяне: любы націск будзе мець адваротны эфект», — лічыць Прэзідэнт. Таму, паводле яго слоў, «мы будзем сумленна, адкрыта ісці на выбары да людзей».

Што датычыцца ролі і месца мясцовых Саветаў, то яны дакладна вызначаны Канстытуцыяй. Аляксандр Лукашэнка даў высокую ацэнку дзеючай мясцовай уладзе: «Мяне задавальняе тое, як працуюць сёння мясцовыя Саветы. Я ім павінен сказаць дзякуй не дзеля прыгожага слоўца, а за тое, што яны сталі тварам у твар перад людзьмі. Яны прымаюць асноўныя ўдары, крытыку, часам нават незаслужана». Таму пытанні стабільнасці і парадку шмат у чым залежаць ад мясцовых органаў улады, найперш мясцовых Саветаў. У гэтым роля і значэнне мясцовых Саветаў, дадаў кіраўнік дзяржавы.

## АБ «МАЛОЧНЫМ» ПЛЯЧЫ ДЛЯ РАСІІ

Беларусь гатова дапамагчы Расіі ў пераадоленні дэфіцыту малочных прадуктаў. «Калі расійскае кіраўніцтва і расіяне хочуць павелічэння патоку малочных прадуктаў у Расійскую Федэрацыю — трэба вярнуцца да пытання ўсялякіх забарон, сесці за стол перагавораў. І дамовіцца аб аб'ёме і цане з тымі 30 прадпрыемствамі, якія сёння могуць павялічыць пастаўкі малочных прадуктаў і малака на расійскі рынак, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы гатовы да гэтага і гатовы падставіць сваё плячо расіянам».

Каментуючы інфармацыю аб тым, што некаторыя буйныя расійскія гарады адчуваюць дэфіцыт малочнай прадукцыі, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што магчымасць дапамогі ў вырашэнні гэтага пытання з боку Беларусі залежыць перш за ўсё ад расійскага, а не ад беларускага боку. «Калі ў гэтым годзе пачалася так званая малочная вайна, калі каля дзвюх соцень рэфрыжэратараў са скорапсавальнай прадукцыяй былі спынены на мяжы, я сказаў кіраўніцтву Расійскай Федэрацыі, што дарэмна яны пайшлі на повадзе некаторых карпарацый, якія перапрацоўваюць малако ў Расіі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Я сказаў, што не патрэбна нам гэта канфрантацыя па малаку, таму што прыйдуць зімнія месяцы і тады будзе моцны дэфіцыт малака і малочных прадуктаў у Расіі. Але мяне паслухалі і зрабілі па-свойму».

Прэзідэнт падкрэсліў, што беларуская прадукцыя таннейшая і значна вышэйшай якасці, паколькі ў краіне мадэрнізавана ўся перапрацоўка. У выніку расійская прадукцыя, у тым ліку малочная, стала проста неканкурэнтаздольнай у параўнанні з беларускай. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка таксама прапанаваў кіраўніцтву Расіі перавярнуць цэнавую піраміду і зрабіць так, каб хаця б 30 працэнтаў, як і ў Беларусі, сяляне атрымлівалі ў цане за малако.

## АБ САЦЫЯЛЬНАЙ СФЕРЫ І ЛЬГОТНЫХ КРЭДЫТАХ

Расходы на сацыяльную сферу ў 2010 годзе ў Беларусі скарочаны не будуць. «Ні пра якое скарачэнне размовы быць не можа, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Людзям у сувязі з гэтым няма чаго хвалявацца».

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў 2010 годзе бюджэт не будзе значна скарочаны, а захаваны на ўзроўні мінулых гадоў. Прырост ВУП чакаецца на 11-13 працэнтаў. «Мы гэта можам зрабіць, — перакананы Прэзідэнт. — Калі мы гэта выканаем, то будзем мець прыстойны бюджэт, нават больш, чым планавалі».

# Ў 2010 ГОДЗЕ НЕ БУДУЦЬ СКАРОЧАНЫ»

Базавыя галіны сацыяльнай сферы — ахова здароўя, адукацыя, сацыяльная палітыка — будуць забяспечаны бюджэтнымі асігнаваннямі з ростам да паказчыкаў 2009 года. Так, рост у сферы аховы здароўя і адукацыі запланаваны на ўзроўні 107 працэнтаў, сацыяльнай палітыкі — 114 працэнтаў. Сярэднямесячны памер пенсіі па ўзросце ў 2010 годзе складзе каля Br510 тыс. У цэлым пенсіі павінны вырасці на 9,2 працэнта. Дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў у наступным годзе будзе даведзена да 100 працэнтаў пражытковага мінімуму.

Што датычыцца заработнай платы, то Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што на працягу наступнага года яна дасягне $500. «У нас ёсць абавязацельствы перад народам. Гэта лічба святая. Яна прынята на Усебеларускім сходзе 5 гадоў таму. Гэта паказчык пяцігодкі, і мы павінны выконваць яго», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Акрамя таго, па-ранейшаму немалая ўвага будзе надавацца будаўніцтву жылля, а таксама сацыяльна-культурных і спартыўных аб'ектаў, «як бы складана і цяжка ні было», сказаў Прэзідэнт. Ён лічыць, што будаўніцтва — гэта той лакаматыў, які цягне ў цяжкі час эканоміку.

«Гэта мінімальныя паказчыкі, якіх мы павінны дасягнуць. Для гэтага мы ўсё маем», — адзначыў Прэзідэнт. «Людзям у сувязі з гэтым няма чаго хвалявацца. Тым больш, што нас падганяе і год палітычны. У пачатку года — выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў, а праз год — прэзідэнцкія выбары. Таму мы вымушаны будзем бегчы хутчэй, чым беглі раней», — дадаў ён.

На пытанне карэспандэнта «Звязды» аб тым, ці захаваецца ў наступным годзе дзяржаўная палітыка выдзялення ільготных крэдытаў, кіраўнік дзяржавы адказаў адназначна.

«Палітыка выдзялення льготных крэдытаў грамадзянам не толькі будзе захавана, але і істотна пашырана», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў 2009 годзе ўжо былі прыняты шэраг рашэнняў у гэтай галіне. Так, зніжана з 3 працэнтаў да 1 працэнта стаўка пры крэдытаванні будаўніцтва жылля шматдзетным сем'ям, малазабяспечаным грамадзянам выдзяляюцца льготныя крэдыты на тэрмін да 3 гадоў у беларускіх рублях на набыццё тавараў айчыннай вытворчасці па зацверджаным урадам пералікам з выплатай 10 працэнтаў гадавых.

Як паведаміў Прэзідэнт, цяпер рыхтуецца праект указа, які значна палепшыць умовы крэдытавання пры будаўніцтве або набыцці жылля. У прыватнасці, плануецца знізіць працэнтныя стаўкі па льготных крэдытах грамадзянам, якія пражываюць у населеных пунктах з колькасцю насельніцтва да 20 тыс. чалавек, з 3 працэнтаў да 1 працэнта. Акрамя таго, павялічацца аб'ёмы выдачы льготных крэдытаў пры набыцці жылля з 70 працэнтаў да 90 працэнтаў для ўсіх катэгорый грамадзян і з 90 працэнтаў да 100 працэнтаў для шматдзетных сем'яў. Плануецца 100-працэнтнае крэдытаванне кошту жылога памяшкання тыпавых спажывецкіх якасцяў з улікам нарматыўнай плошчы жылля на кожнага члена сям'і для асобаў з правам на атрыманне льготнага крэдыту пры будаўніцтве або рэканструкцыі жылля.

«Таму мы не толькі не згорнем усе праграмы льготнага крэдытавання, а будзем прымаць дадатковыя меры. Нават у самыя цяжкія часы нашай гісторыі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Дзяржпадтрымка малазабяспечаных і шматдзетных сем'яў у 2010 годзе захаваецца і стане яшчэ больш важкай і дакладнай.

Плануецца, што ў наступным годзе дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу ў Беларусі атрымаюць больш за 310 тыс. чалавек, а выдаткі на яе ўзрастуць да Br100 млрд. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ўвойдзе ў сілу ўказ аб дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамозе, згодна з якім штомесячная сацыяльная дапамога будзе выдзяляцца малазабяспечаным сем'ям, у якіх сярэднедушавы даход ніжэйшы за бюджэт пражытковага мінімуму. Таксама ў выглядзе аднаразовай дапамогі будзе аказвацца падтрымка сем'ям у выпадку цяжкай жыццёвай сітуацыі. Прадугледжана ўвядзенне новага віду дапамогі — дапамогі на аплату тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі для пэўных груп грамадзян. Будзе ажыццяўляцца дзяржпадтрымка і шматдзетным сем'ям, у тым ліку ў выглядзе льгот на будаўніцтва жылля, падатковых ільгот і г.д. «Па гэтых напрамках мы нават прыбавім. Там паглядзім, як будзе развівацца эканоміка, але галоўнае — гэта дзеці. Хочаце дапамогі — нараджайце траіх і больш дзяцей», — заклікаў Прэзідэнт.

Ён паведаміў таксама, што ў будучыні можа быць зніжана льготная стаўка па крэдытах на будаўніцтва жылля для тых, хто пражывае ў буйных гарадах. Цяпер у Мінску і абласных цэнтрах ільготная стаўка па крэдытах на будаўніцтва жылля складае 5 працэнтаў. «Адзін працэнт і пяць — гэта што, вялікая розніца? У цяперашніх умовах, калі стаўкі па крэдытах даходзяць да 20 працэнтаў, 5 працэнтаў — гэта вельмі вялікая льгота. Гэта, наогул, на страту, без падтрымкі дзяржавы ніводны банк не даў бы. Але будзе сітуацыя лепшая ў эканоміцы, мы, магчыма, прыйдзем і да двух, трох ці аднаго працэнта», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

## АБ МОВАХ

«Пытанні моўныя раз і назаўсёды ў краіне вырашаны. Прынамсі, у той перыяд часу, пакуль я буду Прэзідэнтам. Па-другое, гэта пытанне беларусы адназначна вырашылі на рэферэндуме. І я не збіраюся ўносіць нейкія дапаўненні і новаўвядзенні. Жадаеце размаўляць на беларускай мове — размаўляйце, хочаце гаварыць на рускай мове — калі ласка, гаварыце», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, мова — тая сфера, якая не церпіць гвалту. «Я прыхільнік таго, каб у краіне не было ніякіх забарон. Людзі павінны самі вывучаць і вырашаць, як ім жыць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў тэндэнцыю значнага росту колькасці абітурыентаў, якія хочуць здаваць экзамены на беларускай мове, і перш за ўсё ў вядучых ВНУ краіны.

«Менш гэту тэму трэба мусоліць. Як толькі мы пачынаем яе абмяркоўваць, яна дывідэндаў нікому не прыносіць — ні прыхільнікам, ні праціўнікам гэтага працэсу. Давайце спакойна, ціха навучым усіх размаўляць на нашай роднай, сакавітай беларускай мове», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

## АБ АРМІІ

Колькасны склад беларускай арміі будзе скарачацца паступова. «Нашы сістэмы бяспекі, абаронка і іншае — гэта добрая прыбаўка да абароны Расіі. На захадзе ў Расіі, акрамя нас, практычна нікога няма. І спадзявацца сёння толькі на стратэгічную зброю... Няма сёння такіх вар'ятаў, якія націснуць на кнопку ядзерных ракет і г.д. Калі штосьці і будзе, то, напэўна, высокадакладная зброя. Гэта не фронт на фронт, як было ў Вялікую Айчынную вайну. Мы будуем сваю абарону зыходзячы з гэтага», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Таму, адзначыў Прэзідэнт, беларуская армія, па прызнанні заходніх экспертаў, з'яўляецца самай лепшай на постсавецкай прасторы і ў былым сацыялістычным лагеры. «Нам 150 тыс. (колькасны склад арміі) не трэба было. Таму 10 гадоў таму было пачата паступовае скарачэнне арміі. Сёння ў нас каля 70 тыс. вайскоўцаў. Гэта таксама мнагавата, але крыўдзіць людзей у пагонах нельга. Мы будзем паступова скарачаць, каб нікога не выкінуць на вуліцу. Спынімся дзесьці на 55—60 тыс.», — праінфармаваў Аляксандр Лукашэнка.

«Але галоўнае — гэта тэхніка і мадэрнізацыя. Мы гэта зрабілі за свой кошт. І я часта папракаю расійскіх кіраўнікоў: што вы там нашай апазіцыі падаяце факты, што паўтара мільярда датацый кожны год і іншае. Дык мы ж трацілі грошы на ППА і ВПС — састаўную частку агульнай абароны. Сёння я не перастаю гаварыць, што гэта вялікая паслуга Расіі, за якую трэба плаціць. Не непасрэдна. Але калі вы (Расія) цэны ніжэйшыя трымаеце для нас на газ, чым, напрыклад, для Украіны, дык няўжо няма розніцы для вас паміж Украінай і Беларуссю — прамое пытанне», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

## АБ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫЦЫ

Беларусь не збіраецца з Захадам сябраваць супраць Расіі, а з Расіяй — супраць Захаду, заявіў Прэзідэнт. «Мы не маем вялікіх праблем з Расіяй у плане таго, што ў нас нармалізуюцца адносіны з Захадам. Але пэўнае напружанне ёсць. Дапусцім, Усходняе партнёрства. Але мы ж не супраць Расіі пайшлі ва Усходняе партнёрства. Нам прапанавалі канкрэтныя, выгадныя з пункту гледжання эканомікі, праекты. Вядома, мы з гэтым згадзіліся, і справа тут нават не ў грошах. Скажу адкрыта, вельмі важна, што гэта садзейнічала той палітыцы, якую мы праводзілі апошнім часам, — палітыцы нармалізацыі адносінаў з Захадам, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — І раптам нейкая напружанасць. На маю думку, да канца года мы знялі ўсю гэту насцярожанасць, але мы ніколі за спінай у свайго найбліжэйшага саюзніка нічога не рабілі».

«Наша становішча такое, што з усімі мы павінны мець добрыя, пажадана дружалюбныя адносіны. Так і будзем дзейнічаць», — дадаў кіраўнік дзяржывы.

## АБ МЫТНЫМ САЮЗЕ

Мытны саюз будзе садзейнічаць прытоку інвестыцый у Беларусь, лічыць Аляксандр Лукашэнка. «Наша эканоміка адкрытая. Мы шмат купляем і амаль усё прадаём. Мы максімум 20 працэнтаў спажываем прадукцыі, выробленай у Беларусі, а 80 працэнтаў мы прадаём. Мы можам быць закрытыя? Не. Адкрытая эканоміка штурхае нас да інтэграцыі», — сказаў Прэзідэнт.

У якасці прыкладу ён прывёў Казахстан, які вельмі зацікаўлены ў развіцці супрацоўніцтва з Беларуссю ў розных сферах. «Дрэнна толькі адно: каб прадаць наш трактар у Казахстане, трэба правезці яго праз Расію, і ён становіцца ў паўтара раза даражэйшы — тарыфы вельмі высокія. Мы здымаем гэта пытанне ў адзінай мытнай прасторы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Хіба дрэнна, што замежныя інвестары, лічачы Беларусь самай некарумпаванай краінай постсавецкай прасторы, ідуць да нас і гатовыя тут развіваць вытворчасць? «Але ў Мытным саюзе, Адзінай эканамічнай прасторы, якую, я спадзяюся, пабудуем на працягу двух гадоў, мы будзем гандляваць не толькі ў Беларусі, дзе рынак 10 млн чалавек, — заўважыў Прэзідэнт. — А калі будзе задзейнічаны рынак амаль у 200 млн чалавек — гэта ўжо для інвестараў добра».

Вядома, давядзецца пайсці на кампраміс па нейкіх пытаннях. «Дык і яны ж пайшлі на кампраміс па 632 адчувальных пазіцыях. Ім таксама не падабаецца, але яны з гэтым пагадзіліся. Паверце, мы не на злом галавы кінуліся ў гэты Мытны саюз», — падкрэсліў беларускі лідар, запэўніўшы, што на гэтым этапе, у сувязі з дасягнутымі дамоўленасцямі, «мы зусім нічога не страчваем і можам толькі набыць».

Разам з тым, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, застаецца яшчэ шмат праблем. «Расія не хоча развітвацца са сваімі козырамі ў галіне прыроднага газу, паставак і гандлю нафтапрадуктамі. Гэта складаны працэс, і нам яшчэ нямала трэба будзе крыві сапсаваць з расійскага і з нашага боку, каб дамовіцца. Хіба ж Расія згодзіцца, каб мы заўтра нафту або прыродны газ куплялі ў Казахстане, а не ў Расіі. Таксама пытанне, якое хвалюе Казахстан, але яго трэба будзе вырашаць», — сказаў Прэзідэнт Беларусі

## ПРА БЕЛАРУСКІ ЛЕГКАВІК

Пытанне кошту для беларускага насельніцтва аўтамабіляў ва ўмовах адзінай мытнай прасторы Беларусі, Расіі і Казахстана можа быць вырашана дзякуючы стварэнню ўласнай вытворчасці аўтамабіляў, лічыць кіраўнік дзяржавы. «Цана аўтамабіляў заключаецца ў стварэнні сваёй вытворчасці ў Беларусі», — сказаў ён.


Фота БЕЛТА.

Прэзідэнт адзначыў, што цяпер каля паловы насельніцтва Беларусі хвалюе магчымасць павышэння для фізічных асобаў мытных пошлін на ўвоз аўтамабіляў з ліпеня 2010 года. Пры гэтым для расійскай дзяржавы ўвоз аўтамабіляў з'яўляецца адчувальнай пазіцыяй. «Калі мы не згодзімся, то праз Беларусь пойдзе паток аўтамабіляў на ўсю мытную прастору. Таму трэба знаходзіць кампраміс, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Яны ўступілі нам не па адной пазіцыі, мы згадзіліся з пошлінамі для юрыдычных асобаў. А па фізічных асобах, мы сказалі, што будзем садзіцца за стол перагавораў. Гэта датычыцца не толькі аўтамабіляў, але і іншых таварных груп, па якіх мы павінны паўгода дамаўляцца, бо гэта адчувальныя пазіцыі».

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што цяпер беларусы ў асноўным набываюць на Захадзе патрыманыя аўтамабілі, не заўсёды якасныя. «Сядайце і падумайце, ці варта плаціць за гэту патрыманую машыну, якую вы ўвезяце, тры месяцы да зімы паездзіце і потым будзеце сядзець на станцыі тэхабслугоўвання і ўжо за запчасткі будзеце плаціць утрая даражэй, — сказаў Прэзідэнт. — Мы ўвозім гэты хлам, замест таго каб паставіць жорсткія бар'еры. Калі разглядаць гэта пытанне з дзяржаўнага пункту гледжання, то даўно трэба было стварыць уласную вытворчасць».

Гаворачы аб сумеснай з іранскім бокам спробе стварыць у Беларусі вытворчасць аўтамабіляў «Саманд», Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэтага не ўдалося дасягнуць з-за шэрагу прычын, у тым ліку абмежаванага аб'ёму ўнутранага рынку. «Я разумею, самім сёння цяжка, паспрабуй дагані сёння школы ў Германіі, у Амерыцы, якія рушылі наперад, — сказаў ён. — Але, можа, гэтым трэба было заняцца. І хоць бы на ўнутраны рынак штосьці прапанаваць якаснае і надзейнае. Але не зрабілі гэта. Я не здымаю з рахункаў пытанне стварэння ў Беларусі завода па вытворчасці аўтамабіляў — надзейных, якасных». Акрамя таго, беларусы змогуць набываць і аўтамабілі расійскай вытворчасці.

## АБ СВЯТКАВАННІ НОВАГА ГОДА

У апошні дзень адыходнага года Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка са сваімі сынамі наведае дзіцячы дом.

Адказваючы на пытанні аб тым, як праходзяць навагоднія святы ў сям'і кіраўніка дзяржавы і які падарунак ён хацеў бы атрымаць у новым годзе, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «У новым годзе я хачу, каб дзеці былі здаровыя — гэта перш за ўсё. Па-другое, каб мы вярнуліся да дакрызіснага перыяду. Я гэта папрасіў бы ў Бога».

**Сяргей ПРОТАС.**

Casino Royal

## ОТЧЕТ О ПРОВЕДЕНИИ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «КОРОЛЕВСКОЕ РОЖДЕСТВО»

В период с 1 сентября 2009 года по 24 декабря 2009 года (включительно) проводилась рекламная игра **«Королевское рождество»**. В игре участвовал 31 человек. В момент проведения рекламной игры изменения в правила проведения рекламной игры, состав комиссии по ее проведению не вносились.

В результате проведения розыгрыша призовой фонд, который составлял легковой автомобиль **«Мерседес-Бенц ML 280 CDI 4MATIC»** был разыгран.

Победителем рекламной игры, согласно протоколу проведения розыгрыша, признан **Иванов Юрий Валерьевич.**

Приз в виде легкового автомобиля **«Мерседес-Бенц ML 280 CDI 4MATIC»** был передан победителю по товарной накладной № 0272571 от 30 декабря 2009 года.

Организатором рекламной игры «Королевское рождество» являлось ООО «Дакарай».

Правила проведения рекламной игры, состав комиссии по ее проведению, размер и состав призового фонда были зарегистрированы Министерством торговли Республики Беларусь – свидетельство о государственной регистрации правил проведения рекламной игры № 1517 от 25 августа 2009 года».

*Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления деятельности в сфере игорного бизнеса № 02310/0277901 от 08.06.2005 г. Свидетельство о государственной регистрации № 190617507 от 18.04.2005 г.*

*Свидетельство о государственной регистрации правил проведения рекламной игры № 1517 от 25.08.2009 г., выданное Министерством торговли Республики Беларусь. УНП 190617507.*

Тыгрыны дзённік

# СВЕТЛАЯ ПАЛАСА

*Парламентарыі-«тыгры» загадваюць жаданні на ўсіх беларусаў*

**Народжаным у год Тыгра, кажуць, налета будзе нерэальна шанцаваць. Шчасце літаральна само пойдзе ў рукі, поспех будзе чакаць на ўсіх франтах, а пажаданае — ажыццяўляцца. Іх год, маўляў, — ім і карты ў рукі. Вось мы і вырашылі скласці аптымістычныя міні-прагнозы паводле жаданняў палітыкаў. З роспытамі мы звярнуліся да дэпутатаў-«тыграў», каб усю моц іх жаданняў скіраваць на... здзяйсненне! Дык вось налета нас чакае...**

## ВЫХАД З КРЫЗІСУ



**Галіна ПАЛЯНСКАЯ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі,** лічыць Новы год хатнім святам і адзначаць яго будзе дома разам з самымі блізкімі сябрамі.

— У рэстаране не атрымліваецца той утульнасці, той цёплай душэўнай атмасферы, як дома, — мяркуе народная абранніца, — а ў кавярні пасядзець можна і потым, не ў навагоднюю ноч!

Яна абажае рабіць падарункі — гэта цудоўная магчымасць падзяліцца святочным настроем з навакольнымі, — і пачынае запасацца рознымі прыемнымі воку і душы дробязямі задоўга да Новага года. Гэта само па сабе ўзнімае настрой, творцамі якога павінны быць мы самі, — перакананая Галіна Палянская. І вось яе рэцэпт свята «сваімі рукамі»:

— Усё вызначае ўласны настрой. Каб ён быў святочным, нават насуперак нейкім перыпетыям, трэба быць дастаткова моцным і памятаць, што ты — сярод людзей. Сваім настроем ты вызначаеш і іх душэўны стан, а значыць, усё дрэннае, складанае, цяжкае трэба пакідаць унутры сябе. І дзяліцца з навакольнымі пазітывам.

Сёлета дэпутат больш за ўсё запомнілася тым, што ініцыявала парламенцкія слуханні па жыллёвым крэдытаванні. Сярод рэкамендацый народных абраннікаў — укараненне сістэмы жыллёвых будаўнічых зберажэнняў з прэміяваннем іе ўдзельнікаў. Магчыма, гэта палегчыць беларусам вырашэнне жыллёвага пытання. Ну а пад Новы год, карыстаючыся сваёй «тыгрынай» перавагай, Галіна Палянская пажадала, каб 2010-ы абазначыў выхад з крызісу. Гэтыя б словы ды Богу ў вушы!

## ПАЦЯПЛЕННЕ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІНАЎ


Фота БЕЛТА.

**Ніна МАЗАЙ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы** пажадала не проста пацяпленння адносінаў Беларусі з іншымі краінамі, але і каб «усе мы дружна працавалі на тое, каб нашу краіну паважалі, былі адказныя за гэта». І галоўнае, каб усім нам ставала сілаў і жадання ствараць дабрабыт для сваёй сям'і, а значыць і для краіны. Сустракаць Новы год сенатар будзе разам з бацькамі.

— Яны разам ужо 67 гадоў, і мне вельмі хацелася б, каб кожная сям'я, якая цяпер бярэ пачатак, змагла б пражыць разам гэтак жа доўга і шчасліва. Ад гэтага будзе добра ўсім нам, — мяркуе Ніна Мазай.

А стварыць святочны настрой, нават калі абставіны не на вашу карысць, на яе думку, цалкам рэальна:

— Чым больш складанае становішча, тым больш уважліва і клапатліва мы павінны ставіцца адно да аднаго і да справы, якую мы робім. Пераважваць цяжкасці лепш разам — пры шчырым жаданні дапамагчы, моцнай падтрымы і разуменні.

## ЭКАЛАГІЧНАЕ СПРЫЯННЕ



**Іван БАГАТКА, дэпутат Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанні,** Новы год сустрэне, як і заўжды, у коле сям'і. Гэтай традыцыі, кажа, не здрадзіць. Сваіх хатніх народны абраннік парадуе каронnай стравай — гатаваць бабку (з бульбы і сялянскай каўбасы) таксама стала ўжо традыцыяй у гаспадара сям'і. Святочны настрой, на яго думку, кожны стварае сабе сам. І зрабіць гэта няцяжка — варта толькі знайсці нагоду для ўсмешкі. А калі табе самому на душы хораша, значыць і астатнім добра будзе, — упэўнены народны абраннік. І напярэдадні «свайго» года ён загадаў:

— Каб прырода была чыстай, і кожнаму беларусу знаходзілася месца для адпачынку целам і душой. Каб заўжды ў нас была хвілінка палюбавацца хараством прыроды.

**Ала МАЧАЛАВА.**

# НА ПРАЦУ ЯК НА СВЯТА

**Што стане з пенсіямі? Як зменяцца зарплаты? Увогуле, якіх зменаў у сацыяльнай сферы чакаць беларусам? Пра гэта расказала Валянціна КАРАЛЁВА, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі.**

### НАМІНАЛЬНАЯ НАЛІЧАНАЯ ЗАРПЛАТА СКЛАДЗЕ 500 ДОЛАРАЎ

— Намінальная налічаная заработная плата ў студзені—кастрычніку 2009 года павялічылася, у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, на 13,7 працэнта. І склала ў кастрычніку 1 млн 26,2 тыс. рублёў. Зарплата працаўнікоў бюджэтнай сферы павялічылася на 11,4 працэнта, што складае 761,4 тыс. рублёў, — паведаміла Валянціна Каралёва.

Рэальная заработная плата ў студзені—кастрычніку 2009 года вырасла ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 0,1 працэнта, а ў працаўнікоў бюджэтнай сферы зменшылася і склала 98,1 працэнта.

— Праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2006—2010 г.г. плануецца павысіць намінальную налічаную заработную плату працаўнікам у канцы 2010 года да 500 долараў, — расказала Валянціна Каралёва.

### ДАПАМОГА ПА БЕСПРАЦОЎІ СТАНЕ ДЫФЕРЭНЦЫЯВАНАЯ

— Цяпер прапрацоўваецца пытанне аб узмацненні сацыяльнай абароны грамадзян, якія засталіся без працы, — кажа Валянціна Каралёва. — Будуць павялічаны дапамогі па беспрацоўі. Пры гэтым мы прапаноўваем памер дапамогі вылічваць не ад базавай велічыні, як гэта робіцца цяпер, а ад велічыні БПМ. У дадатак дыферэнцыяваць яго ў залежнасці ад прычыны, па якой чалавек стаў беспрацоўным. Калі чалавек стаў беспрацоўным у выніку ліквідацыі прадпрыемства, памер яго дапамогі па беспрацоўі павінен быць вышэйшым, чым таго, хто стаў беспрацоўным па ўласнай ініцыятыве.

### РЭАЛЬНАЯ ПЕНСІЯ ПАВЯЛІЧЫЦЦА НА 8,5—11 ПРАЦЭНТАЎ

— З 1 лістапада гэтага года было праведзены перараз-лік працоўных пенсій, пасля якога памер сярэдняй пенсіі павялічыўся на 9,5 працэнта, — кажа спадарыня Каралёва. — Сярэднямесячная пенсія па ўзросце ў лістападзе гэтага года склала 449,4 тыс. рублёў. Рэальны памер пенсіі па ўзросце знізіўся і стаў 96 працэнтаў. У 2010 годзе плануецца павялічыць аб'ём пенсій на 18 працэнтаў на працягу года, што складзе каля 492 тыс. рублёў. Рэальная пенсія па ўзросце павінна ўзрасці на 8,5—11 працэнтаў. Дарэчы, першы крок у гэтым накірунку зроблены: чарговае павышэнне працоўных пенсій адбудзецца з 1 студзеня.

У лістападзе на выплату пенсій было затрачана 1 трлн 90 млрд рублёў. Цяпер у Беларусі 2,5 мільёна пенсіянераў. З іх 570 тыс. пенсіянераў працуюць. Павышаць пенсійны ўзрост пакуль не плануецца.

### ДАПАМОГА НА ДЗЯЦЕЙ ДА 3 ГАДОЎ ПАВЯЛІЧЫЦЦА

— Прэзідэнцкай праграмай «Дзеці Беларусі» і Нацыянальнай праграмай дэмаграфічнай бяспекі прадугледжана павялічэнне памеру дапамогі на дзяцей да трох гадоў да 100 працэнтаў БПМ. Адпаведнае рашэнне ўжо прынятае: павялічаная дапамога будзе выплачвацца з 1 студзеня, — кажа Валянціна Каралёва.

За дзесяць месяцаў 2009 года ў Беларусі нарадзілася 92,6 тысячы дзяцей, што на 2,2 % больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года.

### ДАПАМОГА ІНВАЛІДАМ III ГРУПЫ

— Указам Прэзідэнта ад 14 верасня 2009 года павялічаны крытэрый патрэбы да 150 працэнтаў БПМ пры прадастаўленні аднаразовай адраснай дапамогі дзецям, — адзначае Валянціна Каралёва. — З'явіўся і новы від дзяржаўнай дапамогі — дапамога для аплаты тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі інвалідаў III групы, а таксама дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, не прызнаных інвалідамі, але якія маюць патрэбу ў такіх сродках рэабілітацыі.

Гэтым відам дапамогі можна будзе скарыстацца з 1 студзеня 2010 года.

**Настасся ЗАНЬКО.**

## ПАМІЖ НАМІ, ТАТАМІ...


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# У ПЕРШЫ ДЗЕНЬ НОВАГА ГОДА НЕЛЬГА ЛАЯЦЦА, УСПАМІНАЦЬ ЧОРТА І РАБІЦЬ ДРЭННЫЯ ЎЧЫНКІ

**Новы год не за гарамі. Пра тое, як у Беларусі было прынята адзначаць гэта свята, расказала старшы навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі Таццяна КУХАРОНАК.**

У гэтых адносінах адметным быў першы дзень новага года. Народныя традыцыі беларусаў забаранялі ў гэты дзень лаяцца, успамінаць чорта, гаварыць пра смерць, рабіць дрэнныя ўчынкі, бо лічылася, што так і будзе ўвесь год. Па гэтай прычыне ўсе стараліся рабіць адно для аднаго толькі прыемнае. Раніцай кожны гаспадар абыходзіў свае гаспадарчыя пабудовы і рассыпаў ва ўсе бакі пшаніцу, авёс, ячмень, каб увесь год быў ўрадлівым. А пажылыя людзі стараліся не хадзіць да абеду ў госці, каб свойская жывёла не ўцякала з двара.

З надзеяй і трывогай чакалі першага госця ў дом. Бо лічылася, што ў новым годзе пашанцуе ва ўсіх гаспадарчых і сямейных справах тым, да каго ў госці першым прыйдзе мужчына. А каб быць здаровым, бадзёрым і актыўным на працягу ўсяго года, неабходна ўстаць вельмі рана, прынесці вады з калодзежа і памыцца ёю. У першы дзень новага года сачылі за надвор'ем, каб даведацца яго прагноз на будучыню. Згодна з прыкметамі, калі ішоў снег, чакалі снежную зіму і багаты ўраджай. Усходні вецер прадказваў гарачае і сухое лета, заходні — мокрае, паўночны — халоднае з градам, а паўднёвы вецер — цёплае і ўрадлівае.

А вось напярэдадні Новага года ў Беларусі дзяўчаты пачыналі варажыць аб замужжы, характары будучага мужа і сямейным жыцці. Варажылі і хлопцы, але радзей. Найбольш папулярным у вясковай моладзі быў спосаб варажбы на розных прадметах — цот або няцот. Парны лік сімвалізаваў сямейную пару, а няпарны — адзіноту. Напрыклад, выходзілі ў двор і набіралі дроў. Прынёсшы іх у дом, лічылі, цотная або няцотная колькасць. З гэтай жа мэтай абхоплівалі дошкі ў штыкетніку. І зноў цотны лік або няцотны азначаў альбо блізкае вяселле, альбо наадварот. Практычна ўсюды сустракаўся і такі звычай: пасярод дома насыпалі кучку збожжа і пускалі пеўня падзяўбаць, а рэштку пералічвалі.

Акрамя таго, згодна з павер'ем, у навагоднюю ноч сняцца прарочыя сны. Каб убачыць у сне будучага мужа, дзяўчына брала са святочнага стала крыху куцці і, загарнуўшы яе ў хусцінку, клала пад падушку. На Піншчыне і ў заходніх раёнах Беларусі дзяўчаты і хлопцы ставілі ў гэту ноч пад ложак, на якім спалі, гаршчок з вадою і зверху ўкладвалі крыж-накрыж лучыну. Той, хто ў сне пераходзіў па гэтым «мастку», і павінен быў стаць жаніхом або нявестай. У святочную ноч дзяўчаты клалі пад падушку грабеньчык: будучы жаніх павінен быў у сне прычасацца ім.

**БЕЛТА.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Стаўкі ў звязцы з узростам

**У адзіным Мытным саюзе Беларусь захавае на ранейшым узроўні 75 працэнтаў цяперашніх мытных ставак. Адначасова, як паведаміў начальнік упраўлення мытнага рэгулявання і мытных плацяжоў Дзяржаўнага мытнага камітэта Сяргей ПОЛУДЗЕНЬ, 18 працэнтаў ставак зніжаецца, а 7 працэнтаў — павялічваецца.**

Ці не найбольш адчувальнай пазіцыяй павелічэння станоць легкавыя аўтамабілі: стаўкі на некаторыя з іх узрастаюць утрая, а на іншыя — нават у 10 разоў. Разам з тым Сяргей Полудзень адзначыў, што тут будзе дзейнічаць дыферэнцыяваны падыход. Так, найбольш рост павінен датычыцца аўтамабіляў ва ўзросце больш за 5 гадоў.

Пры гэтым у ДМК нагадваюць: новыя стаўкі датычацца толькі аўтамабіляў, што ўвозяцца юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Пытанне наконт фізічных асобаў плануецца вырашыць пазней.

**Сяргей ГРЫБ.**

## «Міраж» стаў рэальнасцю

**30 снежня ў Краснаполлі адчыніўся новы маладзевы цэнтр культуры і вольнага часу «Міраж».**

Яго пабудавалі на аснове будынка былой крамы «Дзіцячы свет» у самым цэнтры Краснаполля. Рэканструкцыя доўжылася год, і вось напярэдадні Новага 2010 года цэнтр адчыніў дзверы перад моладдзю сельскага раёна.

У «Міражы» ёсць танцавальная зала, інтэрнэт-кавярня, зала харэаграфіі, студыі вакалу і выяўленчага мастацтва, відэасалон. У 2010 годзе абяцаюць абсталяваць і модны боўлінг.

— Новы моладзевы цэнтр сапраўды робіць уражанне, — пракаментавала **намеснік старшыні Краснапольскага райвыканкама Тамара КАВАЛЕНКА.** — Раней у нас для маладых людзей была толькі невялікая танцавальная зала пры раённым Доме культуры. Мы хочам, каб наша моладзь магла рэалізаваць свае творчыя здольнасці і далучыцца да культурнага і змястоўнага адпачынку.

**Ілона ІВАНОВА.**

# «У КОСМАСЕ СНІЦЦА ДОМ, А ДОМА — КОСМАС»

**Першы беларускі касманаўт распавёў «Звяздзе», як лятаў на арбіту з нашым журналісцкім пасведчаннем, даглядаў «хатнюю жывёліну», і ці бачыў сляды НЛА**

**СЯДЗЕЦЬ побач з жывой легендай — гэта дзіўнае адчуванне. Голаў кружыць, як у крэсле самалёта пры наборы вышыні, і ты, затаіўшы дыханне, слухаеш успаміны суразмоўцы як дзівосныя казкі, і думаеш толькі: як бы не перабіць недарэчным пытаннем... Мяне яшчэ не было на свеце, калі гэты чалавек здзейсніў свой трэці — міжнародны — палёт у космас. Але сёння мы з двойчы Героем Савецкага Саюза, былым лётчыкам-касманаўтам, а цяпер дарадцам беларускага пасольства ў Маскве па пытаннях навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва Пятром Клімуком узгадваем першы, які адбыўся ў снежні 1973-га — дарэчы, пры гэткім жа анамальным надвор'і, як сёлета.**

— Я і забыўся было на гэту дату — 18—26 снежня 1973 года, — з усмешкай узгадвае Пётр Ільіч, — каб не патэлефанавалі спачатку сябар, потым сын з Англіі: «Віншуем!». «З чым?!» — здзіўляюся. «Ну як жа — з першым палётам!».

...Той палёт планаваўся значна раней, на восень 1971-га, але з-за шэрагу няўдалых стартаў, аварый, і ў тым ліку гібелі некалькіх савецкіх касманаўтаў — Дабравольскага, Воўкава і Пацаева — быў адкладзены. Дый парадкавы нумар карабля — «Саюз-13» — не дадаваў аптымізму яго экіпажу, Пятру Клімуку і Валянціну Лебедзеву.

— Безумоўна, і розныя нюансы былі, і свае прымхі. Мы можам колькі заўгодна разважаць пра Матросава, які пайшоў на амбразуру грудзямі, і пра пачуццё патрыятызму, але, з іншага боку, жыць кожнаму хочацца... У нас, шчыра скажу, таксама перажыванні былі, бо нас перавялі з дублёраў у асноўны экіпаж літаральна ў Байкануры, падчас апошняй дзяржкамісіі — як беларусы кажуць, знянацку, і мы проста не паспелі настроіцца маральна. Дый 13-ы нумар, «чортавы тузін», не радаваў — я потым распытваў Уладзіміра Шаталава, які быў 13-м савецкім касманаўтам, і ён таксама пацвердзіў, што адчуваў сябе перад палётам ніякавата. Але ў нас усё абышлося нармальна, нейкіх крытычных сітуацый, дзе цяжка было выблытацца, ні разу не здаралася.

## ЗЯМЛЯ Ў ІЛЮМІНАТАРЫ І ДРАЗАФІЛА НЮРКА

— Вопытныя касманаўты расказвалі, што нічога добрага ў выхадзе на арбіту няма — спярша думкі больш займае не бязважкасць, а ўласныя вестыбулярныя разладжанні, і табе не да любавання Зямлёй. А мне найбольш запомнілася — дагэтуль — калі мы ляцелі над Афрыкай: бачым, штосьці ўнізе літаральна палае: на вялізным участку сушы прабягаюць бліскавіцы агню і ўспышкі святла. Спачатку крыху спалохаліся, але на другім—трэцім абароце зразумелі, што гэта магутныя навальніцы — у тропіках аблокі збіраюцца вельмі высока, кіламетраў на 18 ад зямлі, і іх добра відаць з космасу.

На ўсе роспыты цікаўных — «а ці бачылі вы ў космасе сляды НЛА?» — Пётр Клімук звычайна ўзгадвае свой другі палёт з Віталем Севасцьянавым: усё ішло ў штатным рэжыме, як раптам касманаўты заўважылі ў ілюмінатары нейкі металічны прадмет, відавочна штучны. Доўга гадалі — што гэта, адкуль, чаму ляціць за караблём? — пакуль не скемілі, што «неапазнаны аб'ект» — гэта іх уласны кантэйнер з адходамі, які аддзяліўся ад карабля. «Так што шукальнікаў сенсацый суцешыць не магу, кантакту з іншапланецянамі ў нас не адбылося», — усміхаецца генерал-палкоўнік авіяцыі.


Меню ў цяперашніх касманаўтаў іншае, а вось «касмічны посуд» — цюбікі — прыжыліся і ў нялётным асяроддзі.

— Другі палёт быў самы працяглы — амаль 63 сутак, самы складаны па навукова-тэхнічнай частцы (напрыклад, нам першым уначы трэба было ў ручным рэжыме стыкавацца з арбітальнай станцыяй), але і самы выніковы і цікавы. Шмат эксперыментавалі з вадой, таксама вялі біялагічны эксперымент па вырошчванні мух дразафіл. Адна з іх пражыла вельмі доўга — мы з Віталем назвалі яе Нюркай і лічылі сваёй касмічнай «хатняй жывёлінай». Назіралі, назіралі — але ж урэшце і яна здохла. Віталь кажа: «Бачыш, як доўга мы лятаем — усе мухі перамерлі, толькі мы з табой засталіся». Пачуццё адзіноты і дэпрэсіі моцна ўплывала, трэба сказаць. У той час якраз здзяйсняўся першы міжнародны палёт «Саюз-Апалон», да яго былі прыкутыя ўсе позіркі, і на нас амаль што не звярталі ўвагі, мы маглі па некалькі дзён на сувязь не выходзіць, хіба што перагаворваліся з удзельнікамі міжнароднага экіпажа Аляксеем Лявонавым і Валерыем Кубасавым. Калі яны сваю праграму выканалі, Лявонаў з намі развітаўся: «Ну, усё, паварочваем рухавікі дадому і праз гадзіну будзем на Зямлі». А нам яшчэ месяц лятаць, селі і ледзьве не расплакаліся абодва... Гэта цяпер па паўгода і даўжэй палёты — звычайная з'ява, а тады мы іх толькі адпрацоўвалі і правяралі на сабе сродкі прафілактыкі, усякія прыстасаванні — лёгкія, вагой усяго ў 10 кіло, выратавальныя скафандры, касцюмы, бегавыя дарожкі і іншыя спартыўныя трэнажоры, вакуумныя ёмістасці і г.д.


Пётр КЛІМУК і Валянцін ЛЕБЕДЗЕЎ. Той самы першы палёт (1973 год).

Летам 1978 года, шчасна завяршыўшы сумесную інтэрнацыянальную праграму «Інтэркосмас» (у ёй, дарэчы, удзельнічаў і яшчэ адзін беларус, Уладзімір Кавалёнак), Пётр Клімук паставіў кропку ў гісторыі сваіх уласных касмічных палётаў. Але ў сне, прызнаецца, «стартаваў» яшчэ доўга:

— У космасе сніцца дом, а дома — космас, усё як у вядомай песні. Так і ў мяне засталося адчуванне чагосьці недаробленага, незавершанага, жаданне рухацца наперад і пастаянная незадаволенасць вынікамі. Мне здаецца, гэта павінна быць у кожнага чалавека, у кожнай прафесіі — дапытлівасць, цікаўнасць, імкненне зрабіць яшчэ больш, несупакоенасць на дасягнутым. Інакш які ты работнік, калі табе больш нічога ў тваёй прафесіі нецікава, усё задавальняе?

## ПРА «ЧЫРВОНКУ» Ў КОСМАСЕ І ГЕНЕТЫЧНУЮ ПАМЯЦЬ

Карыстаючыся выпадкам, правяраю рэдакцыйную легенду:

**— Пётр Ільіч, а праўда, што вы аднойчы ляталі ў космас з рэдакцыйным пасведчаннем журналіста «Чырвонай змены»?**

— Было-о, — расплываецца ва ўсмешцы знакаміты касманаўт. — Праўда, не памятаю дакладна, у другі ці трэці палёт — пэўна, усё ж у другі. Я з беларускімі карэспандэнтамі вельмі добра быў знаёмы, і адзін з іх напаўжартам выпісаў мне гэту камандзіроўку. Дарэчы, я тады па-руску і размаўляў дрэнна, для мяне гэта была як замежная мова — у нас на Брэстчыне, ведаеце ж, увогуле свой асаблівы дыялект — некалькі моў намяшана...

**Віталь кажа: «Бачыш, як доўга мы лятаем — усе мухі перамерлі, толькі мы з табой засталіся».**

**— Яшчэ ведаю, што з Брэста вы з'ехалі ў 17 гадоў, і потым доўгі час бывалі там толькі падчас водпуску. Родную мову не забыліся яшчэ?**

— Ды не, як можна — не забыў! — пераходзіць на чыстую беларускую Клімук. І, хітра падміргнуўшы, з месца ў кар'ер выдае... байку Крапівы:

*— Таму ўжо будзе, мусіць, з год.*
*Вучэбную стральбу*
*праходзіла пяхота.*
*Дык вось,*
*страляў аднойчы ўзвод,*
*Ці, можа, нават рота.*

Ёсць памылкі?

**— Няма, — канстатую з задавальненнем.**

— Вось, бачыце, я і цяпер гутарку з землякамі падтрымаць змагу! Хоць цяпер, прыязджаючы ў Беларусь, бачу, што збольшага гавораць усе па-руску.

Чыстай праўдай аказалася і іншая байка пра Пятра Клімука. У бытнасць сваю кіраўніком Цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў (а абавязкі гэтыя наш зямляк выконваў амаль чвэрць стагоддзя) ён прыходзіў на службу, аддаваў кіцель дзяжурнаму і ішоў у свой кабінет... на руках. Нічога сабе зарадка? «Форму падтрымліваць заўжды трэба!» — каментуе Пётр Ільіч.


Пасольскі кабінет Пятра ІЛЬІЧА — зусім не чыноўніцкі, утульны і адначасова працоўны.

**— У 60-я—70-я гады мінулага стагоддзя хлопчыкі пагалоўна марылі стаць касманаўтамі, а потым усё больш — бізнэсменамі... Як цяпер справы з маладым папаўненнем?**

— Яго стала менш. Цяперашнія хлопцы змяніліся, натуральна. Раней казалі: «Найперш думай аб Радзіме, а потым аб сабе», і людзі былі гатовыя працаваць за ідэю, за сяброў, але і пра сябе не забываліся. Цяпер жа, напэўна, ідэалогія змянілася — у аснову асноў пакладзеныя грошы, уласны дабрабыт, недавер да іншых людзей... Мне здаецца, гэта няправільна, і выйдзе з гэтага пшык.

## МАЛЕНЬКАЯ ЁЛКА І ВЯЛІКІЯ ПЛАНЫ

Бадай, адна з найбольш вядомых традыцый касманаўтаў — перадпалётная разрадка з дапамогай фільма «Белае сонца пустыні». Пасля сеансу экіпажы трымалі цэлы экзамен: якой сістэмы гранаты былі ў мытніка?; як звалі ўсіх жонак Абдулы?; якую ікру еў Верашчагін?.. Аднак былі ў Зорным гарадку, узгадвае Пётр Клімук, і іншыя традыцыі — у тым ліку навагоднія.

— Святкаванне Новага года было ў нас сур'ёзным мерапрыемствам, якое збліжала ўсіх касманаўтаў, незалежна ад стажу палётаў ці яго адсутнасці, стварала адчуванне сапраўднай вялікай сям'і. Прыкладна за месяц да свята мы пачыналі рыхтаваць розныя інтэрмедыі, складаць праграму канцэрта. Жонкі дапамагалі афармляць памяшканне для свята, малявалі афішы і плакаты. У рэстаранах не гулялі, хоць мы і былі забяспечаныя вельмі добра па савецкіх мерках — але самі гатавалі, накрывалі сталы. Бывала, на паляванне ездзілі на дзікоў — словам, кожны год прыдумлялі нешта новае, каб было цікава. Напрыклад, Аляксей Лявонаў быў не толькі знаным мастаком, але таксама добра здымаў фільмы, і штогод ён прадстаўляў новую работу, а мы шукалі ў фільме сябе... Праўда, з развалам Саюза тыя традыцыі паступова былі страчаныя.

Новы, 1974 год Пётр Ільіч, які толькі паспеў вярнуцца з палёту, сустрэў таксама ў Зорным гарадку — адным з першых трымаў слова ва ўрачыстай частцы праграмы, потым ад душы весяліўся разам з іншымі ў зале, а на наступны дзень павёў сына на «касмічны» ранішнік. А вось у самога Клімука ранішнікаў у дзяцінстве не было:

— Бацька ў 1944-м загінуў на фронце, мы жылі даволі сціпла, нават бедна, і, па шчырасці, тады было не да святаў. Ёлку, праўда, пастаянна ставілі. Я нават памятаю, як аднойчы хадзіў за ёй у лес з суседам — былым франтавіком, якога камісавалі па раненні. Мне чамусьці вельмі хацелася вялікую ёлку, але, зразумела, сам яе не дацягнуў бы — і атрымалася, што дарослы мужчына нёс для мяне вялікае дрэва, а я для яго — маленькае...

Загадзя не прынята казаць пра свае жаданні — маўляў, не спраўдзяцца. «Трэба не ў найвышэйшых сілаў нешта прасіць, енчыць, а спадзявацца на сябе і нястомна працаваць, імкнуцца да мэты — тады ўсё атрымаецца», — лічыць Пётр Клімук. Але па нашай просьбе першы беларускі касманаўт усё ж пагадзіўся «загадаць жаданне» — раскрыць планы на 2010 год:

— Я займаюся цяпер навукова-тэхнічнымі пытаннямі, і асноўнае з іх у наступным годзе — гэта спадарожнік, які дазволіць займацца картаграфіяй, геадэзіяй, вызначаць залежы карысных выкапняў, адсочваць тэхнагенныя небяспекі... Такіх спадарожнікаў робіцца два — для Беларусі і для Расіі: платформа расійская, а ўжо на беларускіх прадпрыемствах ідзе зборка асноўнай апаратуры. Яшчэ хацелася б — і на гэты конт мы мелі перамовы з кіраўніком дзяржавы і са старшынёй НАН Беларусі — мець беларускі спадарожнік сувязі, які вельмі патрэбны нашай краіне. Гэта не толькі пытанне прэстыжу, не толькі істотныя тэхналагічныя зрухі, але і неабходны крок для самастойнай краіны, хоць праект і вельмі дарагі, яго кошт каля 200 мільёнаў долараў... Але справа вельмі цікавая і патрэбная — застаецца пажадаць, каб усё ў нас атрымалася, нягледзячы на сусветны крызіс, каб не адсталі мы ад часу, ад цывілізаванага свету. Вам, землякі, таксама гэтага жадаю — каб ажыццявіліся вашы намеры і каб усё ва ўсіх атрымалася!

Хочаце — верце, хочаце — не, а ў маскоўскім Музеі касманаўтыкі кажуць, што аўтографы касманаўтаў — рэч шчаслівая. Многія экскурсанты нават завялі традыцыю: фатаграфавацца побач з дзвярыма з гасцініцы «Байканур», на якіх сярод двух дзясяткаў роспісаў касманаўтаў ёсць і подпіс Клімука. Мы ж вырашылі не цягнуць дзверы на шчасце, а пайсці іншым шляхам:


Дорогие друзья, земляки!
Сердечно поздравляю вас
с Новым 2010 годом!
Желаю Вам доброго здоровья,
счастья и благополучия.
Пусть каждому из вас он
принесет заслуженное, радость и
исполнение реальной мечты.
Удачи Вам во всех Ваших
делах.
С уважением
летчик-космонавт СССР
дважды Герой Советского Союза
П. Климук.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

** «Выбачайцеся перад чытачамі, што пажаданне пішу па-руску, — наказаў на развітанне Пётр Ільіч, — але ж баюся, нараблю памылак — сорамна будзе».*

## Звяздоўскі Год роднай мовы

# ДОБРАЕ СЛОВА ЯК ЛЕПШАЕ СВЯТА

**Слова можа даць надзею, зрабіць моцным. Яно можа сагрэць дабрынёй ды і проста стварыць настрой. Наўрад ці знойдзецца чалавек, які не адчуў аднойчы славутую сілу слова. І гэта адна з самых вялікіх таямніц існавання, бо з біблейскіх часоў вядома, што слова, якое было спачатку, шмат тысячагоддзяў таму ўтварыла жыццё. І адкрыла сэнс рэчаў чалавецтву — кожнаму з народаў у нейкай адмысловай сугучнасці. Не дзіўна, што ў нейкія самыя важныя моманты кожнаму чалавеку бываюць патрэбныя словы яго родных людзей, сказаныя так, як могуць толькі яны. Тыя словы, якія прыходзілі ў сям'ю ад папярэдніх пакаленняў.**

**Яны яднаюць нас і зараз — важна тое, што вялікая частка жыхароў Беларусі ўсведамляе гэта. Роўна год таму «Звязда» прапанавала сваім чытачам засведчыць любоў да роднай зямлі канкрэтным дзеяннем: размаўляць па-беларуску. І шмат герояў нашых публікацый 2009 года ўласным прыкладам сцвярджалі, што родныя словы гучаць натуральна і прыгожа.**

**Не выключэнне і нашы сённяшнія героі. Іх злучыла любоў да роднай зямлі, а на роднай мове яны сказалі адно аднаму самыя чароўныя словы кахання, з якімі кожны дзень становіцца святам.**



# У ПЛЫНІ МРОЯЎ

### 1. Мроя панначкі

Не, гэта быў не баль. Звычайная сяброўская вечарынка — прыемная кампанія, цёплая размова. «Але чаму б і не баль?..» — не пагадзі-лася панначка Іна. Бо вочы яе спыніліся, а сэрца затрымцела. Звычайны пакойчык раптам рассунуўся да памераў вялікай залы, дзе кружыцца б і спяваць. Але на вачах у кампаніі адбывалася нешта абсалютна супрацьлеглае: рэзкія погляды ды колкія слоўцы ляцелі ад яе ў бок светлавалосага хлопца, якога яна ўбачыла першы раз. І зачапіла яго з-за нейкай дзіўнай крыўды.

Іна пайшла ў госці з сяброўкай Юляй, шыкоўнай бландзінкай. Колькі яны ні сябравалі, заўсёды ўся мужчынская ўвага была скіраваная на лёгкую, смяшлівую Юлю. І незразумела: чаму разважлівых дзяўчат, якія нечым цікавяцца, абыходзяць увагай? Вось і Сяргей... І пакуль ён паглядаў на сяброўку, Іна звярнула ўвагу на яго: старалася падчапіць, нешта яму сказаць, пажартаваць. Ён спачатку цярпеў, а пасля пачаў ёй адказваць. Напэўна, так, на мяжы флірту і завязалася іх першая размова. І адразу ж пачалі разумець адно аднаго з паўпогляду ці з паўслоўца. Тым больш што размаўлялі яны на адной мове: па-беларуску. І высветлілася, што хадзілі яны ўжо доўга па адных шляхах, жылі аднымі інтарэсамі, але не перасякаліся і нічога не ведалі адно пра аднаго. І каб не гэтая кампанія, то, магчыма, так і не сустрэліся б. З вечарыны ў Арцёма ў іх пачалося прыцягненне адно да аднаго. Выявілася, што яны аднолькава любяць падарожжы...

І ўсё магло б скончыцца, калі ўсе разышліся па дамах. Але напрыканцы вечарыны дамовіліся сабрацца ўсёй кампаніяй і паехаць у вандроўку — на прыроду, з намётамі. Ранкам на месцы сустрэчы былі ўсяго чатыры чалавекі з васьмі. Іна, яе сяброўка з братам. І Сяргей.

Дзень пачаўся ўдала — спачатку было вельмі горача. А ўначы пачалася навальніца. Гэта злучыла яшчэ больш. Яны сядзелі ў намёце, было ніякавата, і высветлілася, што гэтая задзірыстая, энергічная дзяўчына насамрэч вельмі баіцца маланкі. Ад жаху раставалі словы. Грымеў гром, а яны заглушалі яго вершамі! Па чарзе — адно аднаму чыталі. Выявілася, што яна ведае шмат вершаў, якія ведае ён. Іне падабаюцца лірычныя «Трыялеты» Багдановіча, і ў той момант яна, адчуўшы моцнае плячо, смела вымаўляла:

*Падымі ў гару сваё вока,*
*І ты будзеш зноў як дзіця.*
*І адрынуць далёка-далёка*
*Усе турботы зямнога жыцця...*

### 2. Мроя беларускі

Словы беларускіх вершаў у сэрцы дзяўчынкі сталі гучаць песняй, калі яна задумалася пра тое, што не выпадкова прыйшла ў жыццё ў гэтай сям'і і ў адной канкрэтнай кропцы вялікага зямнога шара, у гэтай краіне. Аднойчы Іна пачула, як файна гучыць беларуская мова, і пачала размаўляць па-беларуску свядома з 10-га класа школы. Дагэтуль, як і ўсе, размаўляла на трасянцы. Хоць вучылася ў вясковай беларускай школе. Але ў іх вёсцы Янавічы, што ў Клецкім раёне, амаль усе размаўлялі мовай мяшанай, нават настаўнікі. І ў сям'і дзяўчыны размаўлялі больш па-руску. Бабуля яе ў школе выкладала рускую мову, перадала яе дачцэ, Інінай маці. Хіба што ад дзядулі, таксама настаўніка, чулі ўнучкі беларускія казкі.

У рэальную казку — беларускую гісторыю — Іна трапіла, калі перачытала Караткевіча, які стаў яе любімым пісьменнікам. І так глыбока прыняла яго словы пра родны край, што вырашыла пакінуць сваю мару пра медыцыну. Стала рыхтавацца да паступлення на філалагічны факультэт у педуніверсітэт, абраўшы спецыяльнасць з дзвюма мовамі: англійскай і беларускай.

Няўрымслівая і апантаная, яна ва ўніверсітэце стала праводзіць сустрэчы з пісьменнікамі. А на 4-м курсе Іна пачала весці моладзевы дыскусійны клуб па-беларуску. Нельга сказаць, што гэта давалася проста: амаль усе ва ўніверсітэце гаварылі па-руску. За імі часам і яна пераходзіла, але сяброўкі яе тут жа спынялі: «У цябе настолькі ненатуральна атрымліваецца, бо абсалютна беларускае вымаўленне». Хацелася пераканацца, і аднойчы Іна запісала на касету сябе, як чытае па-руску... Усё стала на свае месцы: трэба быць сабой у любых абставінах.

— Я прытрымліваюся такой пазіцыі: калі я жыву ў Беларусі, то павінна размаўляць па-беларуску, — гаворыць Іна . — Пасля ўніверсітэта я працавала ў Клецкай школе — выкладала англійскую мову, але па-беларуску. Спачатку вучні абураліся, ім было складана, і мне самой было складана. Ва ўніверсітэце нас ніхто не вучыў выкладаць англійскую па-беларуску. Даводзілася шукаць адпаведнікі, тэрміналогію беларускую. Увогуле, у мяне няма такога, што я звычайна размаўляю па-беларуску, а ў краме, напрыклад, пераходжу на рускую.

У Клецку гэтую дзяўчыну ўжо ведалі, і кожны раз людзі шчыра імкнуліся зразумець, чаго ж яна просіць. Напрыклад, што значыць: «Дайце паўкіло разынак»? Яна цярпліва загадвала наступную шараду: «Калі вінаград пасушыць, то атрымліваюцца разынкі.» Замест простага перакладу яна падкідвала простыя тлумачэнні: «асадка» — тое, чым пішуць. Людзі пакрысе прызвычаіліся і з цікавасцю пачыналі з ёй размаўляць, каб адчуць: што за чалавек так гаворыць? У тым жа Мінску больш складана, і на кірмаш яна звычайна ідзе да тых гандляроў, якія ветліва размаўлялі ў мінулыя разы. Бо часам здараецца «моўны экстрым». Іна лічыць, што некаторыя людзі не столькі на яе злуюцца, колькі на саміх сябе — што так не могуць.

— У нашым грамадстве няпроста жыць з беларускай мовай. Але мне яна не прыносіла непрыемнасцяў, а дапамагала жыць. У беларускамоўных людзей бываюць свае «бонусы». Беларускай мовай карыстаюцца больш людзі адукаваныя. У мяне з-за мовы пашыраецца кола знаёмых — запрашаюць на нейкія сустрэчы, кантактую з іншымі людзьмі. Вось жа ў транспарце, калі размаўляла па тэлефоне, колькі разоў кампліменты чула: «Як хораша вы гаворыце па-беларуску!» Казала ў адказ: «І вы таксама можаце». На што людзі пачыналі распавядаць пра свае праблемы і надзеі. А часам карысталася беларускай мовай наўмысна: каб звярнуць на сябе ўвагу. Напрыклад, каго-небудзь з хлапцоў...

### 3. Мроя экстрэмалаў

Сяргей адчуў, што Іна не гуляе ў словы — яны ў яе натуральныя і шчырыя. Гэта разумееш адразу, асабліва калі сам прыйшоў да беларускай мовы даўно, у той час, калі з беларускай мовай у грамадстве было больш складана. Ён нават сваю дыпломную працу па эканоміцы пісаў па-беларуску. З таго часу яна застаецца ў жыцці і прафесіі — ён працуе галоўным бухгалтарам і вядзе ўсю бухгалтэрыю па-беларуску!

І для яго гэта было натуральна. Матуля-настаўніца выкладала гісторыю. Яна гаварыла на літаратурнай беларускай мове. У іх хаце вялікая бібліятэка беларускіх кніг. І касетаў з запісамі беларускіх гуртоў — першых, выробленых яшчэ саматужным чынам. Аднак жа вось як бывае: малодшы брат Сяргея гаворыць па-руску. І калі Сяргей і Іна чарговы раз набываюць нешта беларускае, падсмейваецца: «Купляйце беларускае!..» Што зробіш: паколькі закаханыя карыстаюцца адной мовай, то ім падабаецца адно і тое ж: канцэрты, кнігі.

Сяргей — аматар футбола. Іна таксама ўцягнулася, але падчас матчаў ёй цікава назіраць за тым, як ён выказвае свае эмоцыі. Не так, як усе — таму што па-беларуску. Калі трэба выкінуць энергію, ён крычыць: «Якога ліха!...». Так лішні раз і падумаеш: якая цудоўная наша мова, без усялякіх экстрэмальна-непрыемных словаў.

Экстрым на сваю галаву яны знаходзяць самі. Пасля паэтычных чытанняў пад грымоты з маланкамі ім спадабалася падарожнічаць разам. Ездзілі разам на Нёман. Спачатку спецыяльна рушылі ўдваіх, каб выбраць месца, куды можна прыйсці з вучнямі Іны. Потым атрымалася ўдалая вандроўка — дзеці і цяпер узгадваюць былую настаўніцу добрым словам.

— Некаторыя людзі ўсё жыццё жывуць дзеля таго, каб зрабіць рамонт, набыць шафу, памяняць падлогу, а ў нас прыярытэт такі: калі ёсць нейкія грошы, лепш з'ездзім куды-небудзь.

Мінулым летам яны вырашылі паехаць у Карпаты, у вёску Крывstatic, што на мяжы Украіны з Румыніяй, там найвышэйшыя горы. Гэта вёска-музей, дзе можна пабачыць гуцульскія абрады, суаднесці іх з беларускай культурай. Аднак калі выбраліся, там была жудасная паводка, рака разлілася, шмат населеных пунктаў было разбурана. Беларускія турысты прыехалі адразу пасля бедства. Усё страшнае, у прынцыпе, мінула. Аднак галоўным было — знайсці месца, дзе жыць. Трэба было прайсці праз рэчку Чорны Чарамош. І ўсё б нічога... Але пасля паводкі засталася толькі частка моста, далей была лесвіца, за ёй проста накідалі камянёў. Так і пералазілі праз раку — у цемры... Пасля ехалі ўздоўж ракі на машыне — дык адна вузкая паласа засталася ад дарогі, здавалася, пойдзе кола трошкі ўбок, а там бездань... Другім разам Іна туды ехала смялей, але дарогу так і не аднавілі да гэтай пары. Аднак паглядзець усё адно было што: яны, у адрозненне ад звычайных турыстаў, якія хочуць пагрэцца на сонейку і разняволіцца, выбіраюць складаныя шляхі. У гэтым ёсць асаблівая рамантыка. Як у Роберта Бёрнса. Сёлета перад вандроўкай у горы яны разам зрабілі пераклад яго верша «Маё сэрца ў гарах». Іна не ўмее рыфмаваць радкі, але зрабіла падрадковы пераклад з англійскай мовы, якую не ведае Сяргей, ён зрабіў вершаваны пераклад на беларускую. Цяпер у іх ёсць супольны набытак — верш.

### 4. Мроя закаханых

— У нас шмат любімых паэтаў, — кажа Іна. — Цяпер я чытаю вершы Караткевіча. Падабаецца нам Сыс. І яшчэ Уладзімір Дубоўка — яго мы вельмі любім чытаць разам. Сяргей кажа: «Як трэба было ведаць беларускую мову, каб перакласці Шэкспіра ў той час, калі яго ўласнае жыццё было пад пагрозай». Нам цікава, як гучаць замежнікі па-беларуску.

Іна лічыць, што Сяргей ведае мову значна лепш, чым яна. Ён дапамагае авалодваць новымі словамі, удасканальвацца ў мове. І робіць гэта заўсёды з гумарам. Неяк яна сказала: «Цягнуць жарабя». Замест «жэрабя». Ён пасмяяўся: «Цягнулі жарабя, а выцягнулі каня...»

Ёсць у яе словы, якія засталіся ад матулі. У свядомасці дзяўчыны засталося, што «вяршкі» — гэта смятана. Таму і магла спытаць: «Будзеш сліўкі?» Ён адвучваў: «І слівкі, і вішанькі, і чарэшні...» Сваёй каханай Сяргей падараваў кнігу «Наша страва». А бывае, што Іна прыходзіць дадому пазней, і яе ўжо чакае гарбата, у калідоры і на кухні гараць свечкі, гучыць песня «Арыстакратка кахання». А яшчэ ён прысвячае ёй свае вершы.

— Я не магу зразумець сваю сяброўку, якая выйшла замуж у Германію, — разважае Іна. — Для іх мова зносінаў — англійская, хоць яго родная арабская, а ў яе — фактычна руская. На якой мове будзе гаварыць іх дзіця? Я, напрыклад, хоць і вучыла англійскую, усё адно не магу дакладна перадаць усе свае пачуцці так, як на роднай мове. У нас ёсць прыклад знаёмых, якія карыстаюцца беларускай мовай у сям'і, і для іх дзяцей гэта сапраўды родная мова, бо на ёй былі іх першыя словы: «татачка» і «матулька». Гэта так хораша гучыць! Я разумею, што сям'ю трэба ствараць з чалавекам, які родны табе па душы, адчувае твае нават патаемныя думкі. Я заўсёды думала, што мой першы моўны цэнтр — рускі. Аднойчы Сяргей сказаў: «Не, напэўна. Бо калі ты размаўляеш у сне, то словы гучаць па-беларуску...»

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# МУЗЫКА СЛОЎ




Так пісала Канстанцыя Буйло ў адным з вершаў. Па-жаночы шчыра прызналася пра тое, што значыць музыка слоў каханага чалавека. І гэтае вялікае чараўніцтва прыдумалі і стварылі людзі. Чаму ж ім часам так цяжка падабраць тыя самыя словы, якія здольныя разбіваць камяні?..

А можа і не так ужо і цяжка, калі рабіць гэта па-беларуску? Бо наша мова проста створана для пяшчоты, якая з веку ў век, з пакалення ў пакаленне перадавалася ў вібрацыях гукаў, мягкасці, мілагучнасці выразаў. І нездарма пяшчотай напоўнены самыя цёплыя словы — тыя, якімі мы ласкава называем блізкіх: татка, матулечка, бабулька, дзядок, братачак, сястрыца.

Нават звычайныя звароты да чужых людзей беларусы ператваралі ў прыклад найвышэйшай пашаны. Нашы людзі здаўна любілі ўжываць словы з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі, якія здольныя рабіць цуд, яднаючы розных людзей: браток ты мой, даражэнькі, кахыненькія-родненькія, сяброўвачка (сябручок), суседачка, спадарынька. Гэтыя выразы прыйшлі ў беларускую літаратуру, якая з'яўляецца сапраўднай скарбніцай ласкавых слоў.

Але асабліва дапаможа гэтая скарбніца закаханым. І калі пачытаць беларускіх паэтаў, то пяшчота стане часткай душы, якая назапасіць ласкавых прыгожых слоў на кожны новы дзень. Як называць ЯЕ? Князёўна, панначка, ясачка, ласачка, красуня, бярозка, ластаўка легкакрылая, зорачка спагадная, сонейка яснае, шыпшына, кветачка, лілея, гаспадынька... Ці хоць бы працытаваць словы Караткевіча: «Ты — нечаканая радасць. Ты — ночы ласкавай крок».

Знойдуцца словы і для ЯГО: міленькі, любы, каханы, галубочак мой, анёл ясны, саколік, князюхна, ясакар, ясны пан, уладар, волат, гаспадар, галава...

Нашы продкі тонка вызначалі пачуцці, таму і не задаволіліся адным словам «люблю», а стварылі сваё адмысловае «кахаю». Любіць можна ўсіх, а вось кахаць: дзяўчыну, хлапчыну, сваю палавіну.

Дарыце ім радасць прыемных слоў штодня, і вы зразумееце, якую чароўную сілу мае ласкавае слова, калі яно сказана на роднай мове! Можаце нам паверыць — на слова.

**Звяздоўцы.**

# АЎТОРАК, 5 СТУДЗЕНЯ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
6.05, 0.25 Дзень спорту.
6.10, 7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 0.20 Зона Х.
7.30, 8.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.30 «Беларускі спорт. Паўналецце».
9.05 Дак. цыкл «Мая праўда». «Апошні палёт Ігара Сорына».
10.00, 16.45 Меладрама «Сёстры па крыві».
10.50, 17.50 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
11.40 «Прыручыце тыгра».
12.10 Прэмія «Оскар». Анімацыйны фільм «У пошуках Нэма».
13.45 «OFF STAGE LIFE».
14.05 Ток-шоу «Ход у адказ».
15.15, 19.15 Навіны рэгіёна.
15.25 Дак. цыкл «Нябачны фронт».
15.55 Меладрама «Каханне як матыў». 1-я серыя.
19.30 Сфера інтарэсаў.
19.50 Серыял «І ўсё-такі я кахаю».
21.00 Панарама.
21.50 Камедыя «На мора!».
0.00 Дзённік Каляднага міжнароднага турніру аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.55, 1.35 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Чакай мяне.
10.05, 11.10 Камедыя «Чалавек з бульвара Капуцынаў».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 0.10, 1.50 Навіны спорту.
12.00 «Малахаў+».
13.10 «Зразумець. Дараваць».
13.40 «Модны прысуд».
14.45 Мультфільмы.
15.15 Серыял «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева».
16.15 Серыял «Монтэкрыста».
17.10 «Няхай гавораць».
18.20 Серыял «Мая цудоўная нянька».
18.55 Серыял «Рыжая».
20.00 Час.
21.05 Камедыя «Нясцерпная жорсткасць».
22.55 «Георгій Данелія. Пасля 10 гадоў маўчання».
0.15 Серыял «Жанатыя... з дзецьмі».
1.10 Серыял «У захапленні ад цябе».

7.00 ЛАДная раніца.
8.00 «Прыстанак душы».
8.30, 16.30 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
9.25 У гэты дзень.
9.30, 18.00 Серыял «Каханне як каханне».
10.30 Баявік «Піраты ХХ стагоддзя».
11.55 «Страсці па культуры».
12.40 Хакей. Формула гульні.
13.05 Кінапробы.
13.30 Мультфільмы.
14.00 Мультсерыял «Аладзін».
14.45 Пазакласная гадзіна.
15.00 Свая кампанія.
15.45, 0.05 Серыял «Камісар Мегрэ».
17.30 Простыя практыкаванні з Ю. Афанасьевым.
19.00 Хакей. КХЛ. Амур (Хабараўск) — Дынама (Мінск). У перапынку: Калыханка.
21.20 Беларуская часінка.
22.25 Дак. фільм «Валерый Харламаў. Дадатковы час».

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10 «СТБ-спорт».
8.30 Маст. фільм «Там, дзе жыве каханне».
10.05 «Пяць гісторый».
10.40 Серыял «Анёл-ахоўнік».
12.40, 18.30 Серыял «Былая».
13.50 «Крокі да поспеху».
14.40 Маст. фільм «Дзве гісторыі пра каханне».
16.50 «Рэпарцёрскія гісторыі». Лепшае.
17.30 «Званая вячэра».
20.00, 22.55 «Сталічныя падрабязнасці».
20.20 «Добры вечар, малы».
20.30 Аўтапанарама.
20.50 Маст. фільм «Мая старэйшая сястра».
23.00 «Надзвычайныя гісторыі».
23.55 Серыял «Рэдакцыя».

5.00 Маст. фільм «Навагодняя мужчыны».
7.00 «Цік-так».
7.15 М/ф «У некаторым царстве».
7.45 Маст. фільм «У пошуках капітана Гранта».
9.10 М/ф «Прыгоды пінгвіняняці Лола».
9.45, 22.30 Маст. фільм «Майстэрства жыць у Адэсе».
11.30 «Смачны свет».
12.00, 18.00 Навіны Садружнасці.
12.10 М/ф «Прыгоды Бураціна».
13.40 Серыял «Старшакласнікі».
14.10, 3.30 «Даведнік».
14.50, 0.30 «Асабістыя рэчы з Андрэем Максімавым».
15.50 Маст. фільм «Каралева».
18.20, 4.00 Серыял «Махляры».
19.20, 1.30 Маст. фільм «Адчыніце, паліцыя 2».
21.00 Канцэрт «Легенды Грузіі».
22.00 Простыя лічбы. «Ала Сігалава: танцам жывая».

7.00 «К-гульні».
7.10, 10.55, 23.35 «Надвор'е».
7.15 Маст. фільм «Востраў Нім».
9.00 «Клуб-700».
9.30 «Праз 30 гадоў».
9.50 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».
11.00 Трылер «Невідзімка».
13.00 Тэлечацік.
13.30 «ВосьМыла».
14.30 «Навагодні гараскоп».
15.30 «Час віншаваць».
16.00 «Мультпарад».
16.20 «Ін-фармацыя».
16.30 Серыял «Альф».
17.00 «Музычны апельсін».
17.30 «Навіны кіно».
17.45 Серыял «Кіраўнік дзяржавы».
18.45 Камедыя «Канвой».
20.50 «Вечарніца».
21.05 «К-гульні — «Лайт».
21.15 Драма «Яе звалі Нікіта».

7.00 Маст. фільм «З новым шчасцем!».
9.20, 19.20 Серыял «Аднойчы будзе каханне».
10.10 «Эдзіта П'еха». Дак. фільм.
11.00, 14.00, 19.00 Весткі.
11.20 «Нічога асабістага».
11.35 Маст. фільм «Звычайны цуд».
13.50, 16.50, 18.50, 22.40 Навіны — Беларусь.
14.20, 20.20 Серыял «Сваты».
17.00 «Смяяцца дазваляецца».
17.55 Серыял «Кармеліта. Цыганская страсць».
22.50 Камедыя «Бландзінка за вуглом».
23.55 «Калядныя сустрэчы Алы Пугачовай».

6.20 Серыял «Аўтобус».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.20 «Рускія сенсацыі».
9.00 «Кватэрнае пытанне».
10.20 Серыял «Расклад лёсаў».
11.55 «Следства вялі...».
12.40 «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
13.20 «Суперстар» прадстаўляе: Валерый Лявонцьеў. Кніга лёсу».
15.05, 16.20 Серыял «Масква. Цэнтральная акруга».
19.25 Серыял «Братаны».
23.10 Серыял «Павуціна».

5.00 «Жыццё і прыгоды робата-падлетка». Мультсерыял.
5.30 «Дзікая сямейка Торнберы». Мультсерыял.
6.00, 6.30, 6.55 «Нікеладэон».
7.25, 11.00 «Пінгвіны з Мадагаскара». Мультсерыял.
7.45 «Нашы песні». Л. Міловіч.
8.00, 3.00 «Невытлумачальна, але факт».
9.00 «Кароль серфераў». Камедыя.
11.30, 1.10 «Сябры». Серыял.
12.00, 18.00 «Жаночая ліга: хлопцы, грошы і каханне». Камедыя.
13.00, 17.00 «Шчаслівыя разам». Камедыя.
14.00, 19.00 «Універ». Сіткам.
15.00 «Норт». Камедыя.
20.00 «Comedy Woman».
21.00 «Камедзі Клаб».
22.00, 2.05 «Дом-2».
23.30 «Не тыя дзверы».
0.00 «Забойная ліга».
1.45 «Шоу камедыянтаў».
3.55 «Начныя гульні».

КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00 Навіны культуры.
9.20, 0.50, 1.50 Праграма перадач.
9.30 «Гаспадыня гасцініцы». Маст. фільм.
11.00 Фокус у фокусе. «Маніпулятары».
11.30 «Таямніца снежнай каралевы (казка пра казку)». Маст. фільм.
13.50, 0.55 «Лемуры і хамелеоны Мадагаскара». Дак. фільм. 1-я серыя.
14.40 Канцэрт ансамбля народнага танца «Жок» (Рэспубліка Малдова).
15.40 «Узрост кахання». Маст. фільм.
17.25 Хазаншчына. «Армія: да службы не прыдатны».
18.10 «Д'Артаньян і тры мушкецёры». Маст. фільм
19.25 «Сусветныя скарбы культуры». Дак. фільм.
19.45 «Я і сцэна...» Вечар Фёдара Чэханкова ў Цэнтральным акадэмічным тэатры Расійскай Арміі.
20.55 «Канцэрт для Еўропы». Іграе Венскі філарманічны аркестр.
22.15 «Лагардэр». Маст. фільм.
0.00 «Трыумф джаза».
1.45 «Лютніст». Караваджо». Дак. фільм.

НОСТАЛЬГИЯ

6.00, 10.00, 15.00, 20.00, 1.00 «Прайшоўшы ЧАС».
6.50, 9.45, 14.45, 5.45 «Ералаш».
7.10, 3.10 «Што? Дзе? Калі?». Фінальная гульня 1980 года.
8.30, 13.30, 18.25, 4.30 Серыял «Дзень за днём».
10.00 «Быў ЧАС».
11.00 «Гукавая дарожка» ў Крамлі».
12.00 «Кінапанарама».
16.00, 21.00 «Народжаныя ў СССР».
17.00 «Віншаванні «Навагоднаму Агеньчыку». 1981 год.
17.30 «Рана раніцай».
19.45, 0.45 «Дабранач, малыя!».
22.15 «Госць». Кароткаметражны фільм.
22.40 «Я кахаю цябе, жыццё...».
1.45 «Чатыры інтэрв'ю з зімой».

НАШЕ КИНО

6.30, 12.30 Маст. фільм «Развітанне з Пецярбургам».
8.30, 14.30 Меладрама «Адзіная...».
10.30, 16.30 Драма «Калі святыя маршыруюць».
18.30, 0.30 Драма «Чужыя лісты».
20.30, 2.30 Камедыя «Тарцюф».
22.30, 4.30 Дэтэктыў «Мяне гэта не датычыцца».

3.00, 11.00, 19.00 Серыял «Жанчыны ў гульні без правілаў».
3.45 Маст. фільм «Адзінокая жанчына з дзіцем».
5.40 Камедыя «Іван Васільевіч мяняе прафесію».
7.10 Дэтэктыў «Шукайце жанчыну».
9.35 Казка «Варвара-краса, доўгая каса».
11.45 Маст. фільм «Бронзавая птушка».
14.55 Камедыя «Вясельны падарунак».
16.15 Маст. фільм «Белыя Росы».
17.40 Меладрама «Аднойчы праз дваццаць гадоў».
19.45 Маст. фільм «Незакончаны ўрок».
21.15 Камедыя «Адзінокім даецца інтэрнат».
22.40 Маст. фільм «Вертыкаль».
23.55 Трагікамедыя «Допінг для анёлаў».
1.20 Меладрама «Гарадскі раман».

ТВ XXI

9.00, 17.00, 1.00 Драма «Сэрцы трох».
10.00, 18.00, 2.00 Драма «Каханне любіць кампанію».
11.35, 19.35, 3.35 Меладрама «Вясновая казка».
13.25, 21.25, 5.25 Драма «Усё яшчэ наперадзе».
15.20, 23.20, 7.20 Баявік «Апусканне ў бездань».

TV 1000

3.00, 21.00 Драма «Чытай па вуснах».
5.00 Драма «Вяртанне».
7.00 Драма «Аднойчы ў Сярэдняй Англіі».
9.00 Трагікамедыя «Усход ёсць Усход».
11.00 Баявік «Мумія».
13.00 Драма «Нерэальная поўнач».
15.00 Камедыя «Марнатраўцы жыцця».
17.00 Камедыя «Караліна».
19.00 Камедыя «Даверся мужчыну».
23.00 Камедыя «Жыгала».
1.00 Трагікамедыя «Сіроты».

ТВ3

5.00 Маст. фільм «Поўнач супраць поўдня».
6.50 М/ф«Чарапашкі ніндзя».
7.15 М/ф «Каспер».
7.40 М/ф «Прыгоды мульцяшак».
8.05 М/ф «Гарэзлівыя анімашкі».
8.30 М/ф «Бэтмэн: Рыцар Гатэма».
10.00, 23.00 «Дзясятае каралеўства». Серыял.
12.00, 20.00 Дак. фільм «Таямніцы вялікіх магаў».
13.00 «Светлячок: зорная адысея». Серыял.
21.00 Маст. фільм «Васіліск — цар змей».
1.00 Спартыўны турнір «Покер пасля паўночы».
2.00 «Дзікія пальмы». Серыял.
3.00 Маст. фільм «Карназаўр-3. Першабытныя стварэнні».

zone romantica

7.00, 18.40, 5.20 «Рэванш-II».
7.55, 2.40 «Жанчына Ларэна».
8.50, 14.10, 0.55 «Жонка Іуды».
9.45, 15.05, 3.35 «У пошуках бацькі».
10.40, 20.30 «Плата не па заслугах».
11.30, 16.55, 21.20 «Стол на траіх».
12.25, 1.50, 6.10 «Тайна Лауры».
13.20, 23.05, 4.30 «Сямейная сувязь».
16.00, 19.35, 22.10 «Ніколі не позна?».
0.00 «Казачны прынц».

Sci Fi Channel

7.35 «Прырода звера». Камедыя.
9.10, 12.30 Квантавы скачок.
10.00, 14.10, 17.30 Прытворшчык.
10.50, 18.20 Цёмны анёл.
11.40, 19.10 Зорны крэйсер «Галактыка».
13.20, 16.40 Якія слізгаюцца.
15.05 «Ваўчаня». Фэнтэзі.
20.00 «Апола 13». Драма.
22.20 «Толькі мёртвыя ведаюць». Драма.
23.50 Склад № 13.
0.40 Пункт прызначэння — праўда. Дак. серыял.
1.30 Кароткаметражныя фільмы.

5.00, 9.00, 13.00, 15.00 Маст. фільм «Тры талеры».
5.55, 9.55, 13.55 Мультсерыял «Кацяня па імені Гаў». М/ф: «Бабры ідуць па следзе», «Хачу бадацца!», «Дагані-вецер», «Упартае цеста».
7.00, 11.00 М/ф «Бібігон», «Навагодні вецер», «Сланяня пайшло вучыцца», «Казка пра чужыя фарбы».
8.00, 12.00 Мультсерыял «Сандакан. Два тыгры». М/ф: «Заяц Коська і крынічка», «Не люба — не слухай», «Жарты».
15.55 Мультсерыял. «Кацяня па імені Гаў». М/ф: «Будзь здаровы!», «Як гэта здарылася», «Спартландыя», «Жыхарка».
17.00 М/ф: «Адважны заяц», «Пра вярблюдзяня», «Канец чорнай багны», «Дзе я яго бачыў?».
18.00 Мультсерыял «Сандакан. Два тыгры». М/ф: «Алёшкавы казкі», «Мы за сонейкам ідзём».

ЗДОРОВОЕ ТВ

5.00, 15.25 Клінічны гіпноз.
5.30, 15.55 Панацэя.
6.00, 16.25 Я чакаю дзіця.
6.30, 16.55 Курс лячэння.
7.30, 8.55, 1.50 Увага, ежа!
7.55, 20.30 Будзем здаровыя.
9.20, 22.20 Дзіця нарадзілася.
10.20, 13.30, 23.20 Правілы здароўя.
10.45, 12.20, 23.45 Набалелае пытанне.
11.25, 0.25 Колькі вам гадоў?
13.00, 2.30 Як не страціць здароўе.
13.55, 19.00, 3.35 Пазнай сябе.
14.25, 19.30, 4.05 Нетрадыцыйная медыцына.
14.55, 20.00, 1.20 Школа розуму.
18.45, 2.15 Энцыклапедыя памылак.
3.00 Здароўе.

6.00, 10.50, 11.50, 12.50, 15.50, 17.50, 18.50, 22.55 Парады ТДК.
6.35, 14.00 Усё лепшае, для Вас.
7.35, 10.00, 17.00, 1.00 Красуня.
8.00 Добрай раніцы, Каханая!
9.00 Культ наяўнасці.
11.00, 2.00 Нашы дзеці.
12.00, 18.00, 5.00 Ваш доктар.
13.00 Сакрэты прыгажосці і здароўя.
13.30, 22.30 Серыял «Гвадэлупэ».
15.00 Маю права.
16.00, 3.00 Гісторыі поспеху.
16.50 Прыгажосць і здароўе.
19.00 Люстэрка жыцця.
20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
21.00 Сэксуальная рэвалюцыя.
22.00 Філасофія здароўя.
23.05 Алоха, Гаваі.
4.00 Твой дом.

Discovery Channel

7.00, 14.45 «Пятая перадача».
7.25, 15.15, 0.00, 4.45 «Маланкавыя катастрофы».
8.20, 16.10, 23.00 Выжыць любой цаной.
9.15, 19.00, 3.50 Разбуральнікі легендаў.
10.10 «Галаваломы».
11.05, 20.00, 5.10 Як гэта працуе.
11.35, 20.30, 5.40 З чаго гэта зроблена?
12.00, 17.05 Ствараючы будучыню.
12.55, 18.00, 1.00 «Круты цюнінг».
13.50 Амерыканскі чопер.
21.00, 2.55 Крутыя выбухі.
22.00 Спецназ «Цяжкія машыны».
23.00 Рукатворныя цуды.
0.30 Якія цудам выратаваліся — крутыя здымкі.
2.00, 6.05 Амерыканскія калымагі.

National Geographic Channel

5.00 «На валасок ад смерці».
6.00, 14.00 «Небяспечныя сустрэчы».
7.00, 12.00 «Ліхтугі за мяжой».
8.00, 13.00 «Байкеры — выратавальнікі жывёл».
9.00, 15.00 «Усё пра змей».
10.00, 16.00 «Сігнал выратавання — чырвоны».
11.00, 19.00, 1.00 «Секунды да катастрофы».
11.30, 19.30, 1.30 «Рэальнасць або фантастыка?».
17.00, 21.00, 0.00, 3.00, 4.00 «Самы цяжкі ў свеце рамонт».
18.00 «Суперзбудаванні».
20.00, 23.00, 2.00 «Цуды інжынерыі».
22.00 «Дзікі сэкс».

travel channel

7.00, 12.00, 16.00, 23.00, 4.00 Сусветны вандроўнік.
8.00 Падарожнічайце сёння.
8.30, 21.30, 2.30 Рудзі Макса падарожнічае па свеце.
9.00 Маляўнічыя чыгункі.
9.30, 17.00 Лыжны свет.
10.00, 13.00, 18.00, 20.30, 1.30 Шэф-кухар за мяжой.
10.30, 14.30, 20.00, 1.00 Смак Мексікі.
11.00 Планета ежы.
13.30, 18.30 Прагны вандроўнік.
14.00 Падарожжа са смакам.
15.30 Святочная Індыя.
17.30 Экстрэмальныя падарожжы.
19.00, 0.00, 6.00 Бясстрашныя вандроўнікі.
22.00, 3.00 Раскошныя падарожжы з Варуном Шармай.
5.00 Па чыгунках Швейцарыі.

Animal Planet

7.00, 11.50, 16.25 «SOS дзікай прыроды».
7.25, 12.15, 15.30 «Ветэрынарная «хуткая дапамога».
7.50 «Тэрыторыя жывёл».
8.45, 12.45 «Самыя забаўныя жывёлы планеты».
9.40, 16.50, 6.10 Выратаванне жывёл у Аўстраліі.
10.05, 17.20, 20.10, 22.55, 3.30 Паліцыя Фенікса — аддзел па абароне жывёл.
10.55 Прагулкі Джэфа Корвіна.
13.40, 19.10, 0.45 «У пячору льва».
14.35, 5.20 Вуліца лемураў.
15.00, 5.45 «Малпіны выхадкі».
15.55, 6.35 «Пашпарт для ўлюбёнца».
18.15, 22.00, 2.35 Сабакі-паліцэйскія.
21.05, 1.40 Дзікія і небяспечныя.

9.30, 12.45, 21.20, 0.00, 1.45 Ралі.
10.15 Хакей. Кубак Шпэнглера.
11.15 Тэніс. Турнір WTA.
13.30 Лыжныя гонкі. Кубак свету.
14.00, 19.05 Тэніс. Турнір АТР.
17.30, 0.45 Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
19.00 Тэніс. Жусцін Энен.
20.00 Футбол. Еўрагалы.
20.10, 21.30 Дартс. Чэмпіянат свету.
23.45 Экстрэмальныя віды спорту.

MTV

5.00, 11.25, 1.30 Новы год з MTV.
6.00 Стэрэа_раніца. The Best.
8.50 Вобыск і спатканне.
9.15 Наступны.
9.40 Тайныя спакусы курортнага гатэля.
10.05 Трэндзі.
10.35, 18.45 «Губка Боб у Квадратных Штоніках».
11.00, 19.10 «Аватар».
12.25, 23.10 Сусветны чарт MTV.
13.20 Мадэльная школа ведзьмы Джэніс.
13.50 Праект «Подыум».
14.45 Сяброўка Пэрыс Хілтан.
15.40 Ужо можна.
16.05 Клініка.
17.00 Тачку на пракачку.
17.20 Дзікуны.
17.45 Рэактыўныя клоўны.
18.15 Страшна цікава.
19.40 Падстава.
20.05 Па дамах: самае раскошнае жыллё.
21.00 Europe Music Awards. Берлін.
1.05 Дзяўчынкі «Плэйбоя».

6.00, 23.00 «PLAY».
7.30, 11.30, 20.00 Серыял «Татавы дочкі».
8.30, 12.30, 19.00 Серыял «Ранеткі».
9.30, 13.30, 21.00 Серыял «Кадэцтва».
10.30, 18.00, 22.00 «6 кадраў».
14.30 «Forward».

ІНТЕР+

7.00, 11.35 Песня года.
8.05, 12.40 Фестываль гумару.
9.35, 16.35 Месца сустрэчы.
11.00 Картата-патата.
14.10 Мюзікл «Фігаро».
18.00 Вячэрні квартал. Лепшае.
20.00, 3.00 «Падрабязнасці».
20.20, 1.25 Мюзікл «Тры мушкецёры».
22.00, 4.55 Вельмі Навагодняе кіно.
23.55 Формула кахання. Р. Быкаў.
0.40 Не першы пагляд.
1.00 Тры мушкецёры — за кадрам.
3.20 Канцэрт Вітаса.

1+1

6.15 «Смешныя песні».
6.15 Казка «Снежная каралева».
9.20 М/ф «Калядныя прыгоды Кеці і Макса».
9.50 М/ф «Скарбы возера чарапахі».
11.15 М/ф «Горад чараўнікоў».
12.35 Казка «Беласнежка».
14.15, 1.15 Меладрама «Прыходзь на мяне паглядзець».
16.15 Камедыя «Прывітанне сям'і».
18.15 М/ф «Віні і Сланатоп».
19.30 ТСН.
20.00 Камедыя «Адкуль бяруцца дзеці».
21.45 Камедыя «Хлопцы з жаночага інтэрната».
23.40 Камедыя «Ніхто не ведае пра сэкс-2».
3.00 Камедыя «12 крэслаў».
5.40 «Караоке на майдане».

## 21.50 ФІЛЬМ ДНЯ

### «НА МОРА!»

(РАСІЯ, 2009 г.)



Камедыя ў духу Бунюэля. Тры рускія сямейныя пары з дзецьмі здымаюць катэдж на беразе мора, каб правесці водпуск на пляжы. Аднак абставіны не дазваляюць ім не тое, каб пакупацца, а нават адным вокам убачыць мора.

Рэжысёр — Яраслаў Чэважэўскі. У ролях: Алёна Бабенка, Павел Дзеравянка, Юрый Калакольнікаў, Інга Аболдзіна.

# «ДА НАС УСЕ ДЗЯДЫ МАРОЗЫ З'ЕХАЛІСЯ ПАД НОВЫ ГОД»

**З такімі словамі штогод дэманструе гасцям незвычайную калекцыю сваіх бацькоў Ваня — унук аўтара аднаго з маіх любімых раманаў «Сэрца на далоні». У калекцыі сям'і Шамякіных, пераканалася на свае вочы, ні многа ні мала каля трыццаці самых розных Дзядоў Марозаў. І практычна да кожнага ёсць Снягурка.**



Адметнасць калекцыі ў тым, што тут прысутнічаюць дзядулі практычна з усіх рэгіёнаў Беларусі. Ёсць ільняны мінскі і крыху меншы слуцкі, белавежскі — з дубу, наадлёўскі — з саломы, добрушскі — з фарфору.

— Дарэчы, апошнюю вельмі арыгінальную парачку набылі не так даўно, — расказвае і адначасова паказвае муж Алесі Іванаўны Шамякінай Сяргей Уладзіміравіч. — На першы погляд, гэта звычайныя фарфоравыя фігуркі. Насамрэч жа каптуркі Дзеда Мароза і яго ўнучкі падымаюцца, і ўсярэдзіну статуэтак можна наліць гарэлку і віно.





Алеся Іванаўна і Сяргей Уладзіміравіч вельмі любяць фарфор, таму нядзіўна, што значная частка фігурак у іх калекцыі зробленая менавіта з гэтага матэрыялу.

— Нам вельмі шкада, што зачыніўся Мінскі фарфоравы завод. Дзед Мароз, выраблены на гэтым заводзе, больш за ўсё адпавядае вобразу, які жыве ва ўяўленнях кожнага з нас з дзяцінства. Там мы набывалі надзвычай прыгожыя статуэткі не толькі ў сваю калекцыю, але і ў якасці падарункаў.

Ёсць у калекцыі і Дзед Мароз у выглядзе падсвечніка, свяцільні, гадзінніка. Акрамя вышэйназваных фігурак з саломы, дрэва, фарфору, ільну, ёсць Дзед Мароз з белага мармуру, крышталю, гліны, тканіны... Большая частка калекцыі — беларуская, але ёсць фігуркі і з Расіі, і з Германіі.

— Нават Санта-Клаус зусім выпадкова да нас завітаў. Хоць нам, шчыра прызнацца, усё ж такі бліжэйшы Дзед Мароз у багатай шапцы і футры да пятаў. Але ж раз падарылі, дык не кідаць жа яго на антрэсолях. Ды і Ваня не дасць нікога ў крыўду, бо з дзяцінства засвоіў, што пра Дзядоў Марозаў трэба клапаціцца, інакш рызыкуеш застацца без падарункаў.

***— А ці ёсць у вас любімы Дзед Мароз?***

— Безумоўна, «Космас», — кажа гаспадар. — Бо з яго ўсё пачыналася. Ён практычна наш равеснік, хутка паўстагоддзя стукне.

***— А чаму «Космас»?***

— Бачыце, на ім напісана слова космас. У тыя часы, калі Гагарын паляцеў у космас, гэта слова пісалі ўсюды. Модна было. Ён перайшоў мне ад бацькоў і цяпер штогод займае пачэснае месца пад ёлкай. Як Ваня падрасце, перададзім «Космаса» сыну. Няхай перадаецца з пакалення ў пакаленне.

— А ў нас дома пад ёлку ставілі ватнага Дзеда Мароза, — уключаецца ў размову Алеся Іванаўна. — У гады, калі ў краіне панаваў дэфіцыт, ён быў вельмі папулярным. Праўда, шкада, што яго няма ў нашай калекцыі. Мае бойкія пляменніцы так патрабавалі ад Дзеда Мароза падарункі, што ад яго нічога не засталося. Але калі б дзе ў антыкварнай краме ўбачылі такога дзядулю, абавязкова набылі б.

***— Алеся Іванаўна, раскажыце, калі ласка, як Вы, калі яшчэ быў жывы Іван Пятровіч, сустракалі Новы год?***

— Гэта было самае любімае свята нашай сям'і. Заўсёды ставілі ёлку да столі, разам яе ўпрыгожвалі. Маці Марыя Філатаўна накрывала святочны стол. Старэйшая сястра Таня праводзіла конкурсы, раздавала сувеніры. Напярэдадні бацька набываў усім дзяцям — нас было чацвёра — падарункі. Нават цяпер у мяне захавалася вельмі прыгожая паштоўка, якую тата прывёз аднекуль з-за мяжы і падпісаў ад імя Дзеда Мароза. Не ведаю, як астатнія, але мы першага студзеня вельмі рана ўставалі. Як гэта, першы дзень новага года, а мы будзем спаць? Бацька ж, калі быў жывы, наадварот, спаў да абеду. Ён, сава па натуры, ночы напралёт сядзеў за працоўным сталом, нават калі не пісаў, то чытаў ці глядзеў тэлевізар.







* * *

На развітанне гасцінныя гаспадары выказалі спадзяванне, што нехта важны прачытае публікацыю і ў іх калекцыі ўсё ж такі з'явіцца пастаўскі Дзед Мароз ці, як яго называюць, Зюзя Паазерны — гэта наш беларускі паганскі бог зімы.

— Хай бы хто зрабіў яго з гліны, напрыклад, — кажа Сяргей Уладзіміравіч. — Тады б наша калекцыя ахапіла ўсю Беларусь.

***— Дык у вас нават яшчэ няма і Дзеда Мароза з Гародні...***

— Думаем, што ў хуткім часе з'явіцца. Не так даўно наведалі выставу, дзе ўбачылі Дзеда Мароза са Снягуркай у выглядзе чарак, выраблены Нёманскім шклозаводам. Вось там нам і паабяцалі, што да Новага года яны паступяць у продаж у фірмовую краму.

**Надзея ДРЫЛА.**
**Фота аўтара.**

Шык-шок

# ЗАЦЯГНУЦЬ ПАЯСЫ...





## БЛУЗКІ.

У модзе блузкі з рушамі, якія дадаюць жаноцкасці і рамантыкі ў ваш вобраз. Такія блузкі нададуць жаноцкасці ў строгі дрэс-код бізнес-лэдзі і прыдатныя для дзелавога стылю ў адзенні. Добра выглядаюць гафрыраваныя блузкі з рукавом 3/4, шаўковыя блузкі, класічныя жабо. Такія блузкі можна насіць як пад штаны, так і пад спадніцы-алоўкі. Прыгожа выглядаюць атласныя блузкі ў дыяганальную палоску. Модныя колеры — класічны чорны і белы, сіні, ружовы, ліловы, чырвоны.

## ШТАНЫ.

**Высокая талія.** Адметна, што штаны з завышанай таліяй былі ў модзе ў часы папярэдняга маштабнага эканамічнага крызісу — Вялікай Дэпрэсіі (1920—1930). Вось і сёння дызайнеры прапануюць «зацягнуць паясы».

**Шырокія штаніны** (прамыя ці расклёшаныя). Універсальны трэнд для любога тыпу фігуры, які ўпершыню стаў папулярным у канцы 70-х — пачатку 80-х. Нават дзіўна, што дагэтуль ён так доўга адсутнічаў на подыумах. Сёння практычна ўсе вядучыя дызайнеры зрабілі іх гваздом сваіх калекцый.





**Налёт спартыўнасці.** Сучасныя жанчыны вядуць актыўны лад жыцця і выбіраюць адпаведнае адзенне. Таму нават офісныя мадэлі сёння нярэдка шыюцца са «спартыўнага трыкатажу» (сумесі баваўны і спандэксу, лайкры ці эластану, які добра цягнецца і вытрымлівае нагрузкі, але пры гэтым не губляе форму. Звярніце ўвагу на капры ў спартыўным стылі даўжынёй 3/4 (да сярэдзіны галёнкі) — у наступным сезоне яны стануць сапраўдным хітом.

**У стылі гарэма.** Гэта тэндэнцыя шырока ўвасоблена ў модных калекцыях вясна-лета 2009. У штанах «а-ля гарэм» дапушчальная заніжаная талія (у рэшце рэшт першапачаткова яны прызначаліся для выканання танца жывата). Некаторыя мадэлі выразна падкрэсліваюць сцёгны і звужаюцца да шчыкалатак, іншыя, наадварот, свабодна звісаюць ад самай таліі. Выбар за вамі.

## СПАДНІЦЫ.

**Міні — не актуальна.** Як ні дзіўна, але нью-ёркскія дызайнеры ў 2010 годзе рэкамендуюць модніцам адмовіцца ад міні-трэндаў і звярнуцца да доўгага шыкоўнага адзення. Што і казаць: на галоўны подыум Паўночнай Амерыкі так і не выйшлі паўголыя бізнес-вумен ва ўборах, якія ледзь прыкрываюць самыя цікавыя месцы. Наадварот, гледачы ўбачылі свабодныя, струменістыя, у вольным падзенні сукенкі, спадніцы і штаны, якія, да слова, не мелі ніякага дачынення да вячэрніх туалетаў.

Трыкатажныя сукенкі, якія вяртаюцца ў моду з 80-х, з'явіліся на падмостках сусветных подыумаў усяго некалькі гадоў таму. Аднак нічога не прадракала іх татальнага ўваходжання ў моду. Здавалася б, сучасная разбэшчанасць і цяга да агалення не змогуць «прапусціць» штосьці, што ніжэй за калена. Але ж не! Большасць самых вядомых сусветных брэндаў адзення ўжо запусцілі ў вытворчасць серыі ўльтрамодных ліній доўгіх трыкатажных сукенак сезона вясна-лета 2009.



**Мідзі лепш адкласці.** Варыянт мідзі заўсёды быў самым запатрабаваным фасонам у дзелавым стылі. З'явіцца на працы ў пакарочаным сарафанчыку больш выгадна, чым у супермаленькай спадніцы ці доўгай сукенцы. Менавіта гэту тэндэнцыю ўжо доўгі час выкарыстоўваюць сусветныя куцюр'е ў рабоце над сваімі бізнес-калекцыямі. Але калі меркаваць па шматлікіх мадэлях спадніц і сукенак сезона вясна-лета 2010, мідзі, на расчараванне аматарак такога фасону, адыходзіць у мінулае. Кансерватыўныя сілуэты без асаблівых вынаходніцтваў — ні нізка, ні высока — развітваюцца з модніцамі, гэтак жа як і самыя папулярныя тканіны і фасоны, якія «любяць» мідзі: спадніцы-алоўкі з цвіду і прамыя трыкатажныя спадніцы. А класічнае спалучэнне высокіх боцікаў і спадніц-мідзі зусім знікла з модных падмосткаў, пакінуўшы новы рэвалюцыйны тандэм — доўгая «ў падлогу» сукенка разам з басаножкамі. Увогуле мідзі — адзін з самых сумных памераў спадніцы: ні інтыму, ні глухой завесы. Штосьці нявызначанае, ад чаго вырашылі ў наступным сезоне адмовіцца практычна ўсе модныя дызайнеры.

**Максі — тое, што трэба.** Спадніца максі — адно з найбуйнейшых вынаходніцтваў моднага чалавецтва. Дзякуючы доўгай спадніцы, у дзяўчыны ёсць магчымасць адчуць сябе больш свабодна, лёгка і камфортна. Максі хавае некаторыя хібы фігуры. Адзін з самых важных плюсаў максі — магчымасць візуальнага змянення даўжыні ног за кошт правільна падабранай вышыні спадніцы. Але для гэтага патрэбны вытанчаны густ і стыль. Звярніце ўвагу, што большасць фасонаў максі-спадніц і сукенак пачынаецца вельмі высока, літаральна ў падгруднай зоне, адкуль спускаецца струменістай тканінай па сцёгнах.

## ЖАКЕТЫ.

Жакеты ці пінжакі даўно ўвайшлі ў наша жыццё і сталі неад'емнай часткай нашага гардэроба. У 2010-м пінжакі зноў будуць у модзе, прычым яны становяцца ўніверсальнымі. Іх носяць і ў офіс, і на прагулку, і ў госці да сяброў. Пінжак робіцца ў наступным сезоне больш жаноцкім, элегантным і стыльным. Гэтая дэталь гардэроба ў 2010-м папулярная не толькі ў тых, каму за 35, але і сярод моладзі. Сярод модных пінжакоў можна вылучыць некалькі тэндэнцый. Па-першае, у модзе жакеты з пакарочаным ці проста кароткім рукавом. Выглядаюць такія мадэлі вельмі вытанчана і элегантна, іх носяць з вадалазкамі. Яшчэ адзін модны кірунак у стылі мінімалізму — пінжакі робяцца жылеткамі, якія добра спалучаюцца як з вадалазкамі, так і з блузкамі. Класічныя пінжакі таксама не выходзяць з моды. Калі вы працуеце ў офісе, то без такой рэчы не абысціся. Але і такія рэчы могуць быць універсальнымі і арыгінальнымі, а таксама падкрэсліваць вартасці вашай фігуры. Яшчэ адзін трэнд сезона — модныя вельветавыя пінжакі.

# ...І ЗАБЫЦЬ ПРА МІНІ

# 2010

## Праваслаўны каляндар

**ПАСХА (ВЯЛІКДЗЕНЬ) — 4 красавіка**

**ДВУНАДЗЯСЯТЫЯ СВЯТЫ**

7 студзеня .......... Раждаство Хрыстова
19 студзеня .......... Хрышчэнне Гасподняе
15 лютага .......... Стрэчанне Гасподняе *(богаслужэнне пераносіцца на 14 лютага)*
28 сакавіка .......... Вербная нядзеля
7 красавіка .......... Благавешчанне Прасвятой Багародзіцы
13 мая .......... Узнясенне
23 мая .......... Пяцідзясятніца (Троіца)
19 жніўня .......... Праабражэнне Гасподняе
28 жніўня .......... Успенне Прасвятой Багародзіцы
21 верасня .......... Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы
27 верасня .......... Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга
4 снежня .......... Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы

**ВЯЛІКІЯ СВЯТЫ**

14 студзеня .......... Абразанне Гасподняе і памяць свяціцеля Васілія Вялікага
7 ліпеня .......... Нараджэнне Іаана Прадцечы
12 ліпеня .......... Святых першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла
11 верасня .......... Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы
14 кастрычніка .......... Пакроў Прасвятой Багародзіцы

**ШМАТДЗЁННЫЯ ПАСТЫ**

Вялікі пост.......... з 15 лютага да 3 красавіка
Пятроў пост.......... з 31 мая да 11 ліпеня
Успенскі пост.......... з 14 жніўня да 27 жніўня
Пост перад Раждаством Хрыстовым... з 28 лістапада 2010 года да 6 студзеня 2011 года

**АДНАДЗЁННЫЯ ПАСТЫ**

Серада і пятніца на працягу ўсяго года, за выключэннем усёедных тыдняў і Каляднага перыяду
Навячэр`е Богаяўлення .......... 18 студзеня
Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы..... 11 верасня
Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга.......... 27 верасня

**УСЁЕДНЫЯ ТЫДНІ (ПА СЕРАДАХ І ПЯТНІЦАХ ПОСТУ НЯМА)**

Калядны перыяд.......... з 7 да 17 студзеня
Мытара і фарысея .......... з 25 да 30 студзеня
Сырны (масленічны).......... з 8 да 13 лютага
Велікодны (Светлы) .......... з 4 да 10 красавіка
Троіцкі.......... з 24 да 29 мая

**ТРАПЕЗА Ў СВЯТЫ**

Паводле Царкоўнага статута, у святы Раждаства Хрыстовага і Богаяўлення, калі яны прыпадаюць на сераду і пятніцу, посту няма. У Навячэр`е Раждаства Хрыстовага, Навячэр`е Богаяўлення, у святы Уздзвіжання Крыжа Гасподняга і Усекнавення галавы Іаана Прадцечы дазваляецца ежа з алеем. У святы Стрэчання, Праабражэння Гасподняга, Успення, Нараджэння і Пакрова Прасвятой Багародзіцы, Увядзення Яе ў храм, Нараджэння Іаана Прадцечы, апосталаў Пятра і Паўла, Іаана Багаслова, калі яны прыпадаюць на сераду і пятніцу, а таксама ў перыяд ад Вялікадня да Троіцы ў сераду і пятніцу дазваляецца рыба.

**ДНІ АСАБЛІВАГА ПАМІНАННЯ СПАЧЫЛЫХ**

Субота мясапусная..........6 лютага
Памінанне ўсіх спачылых, што пацярпелі падчас ганенняў за веру Хрыстову..........7 лютага
Субота 2-га тыдня Вялікага посту ..........27 лютага
Субота 3-га тыдня Вялікага посту ..........6 сакавіка
Субота 4-га тыдня Вялікага посту ..........13 сакавіка
Радаўніца ..........13 красавіка
Памінанне спачылых воінаў..........9 мая
Субота Троіцкая ..........22 мая *(памінанне спачылых пераносіцца на 15 мая)*
Субота Дзімітрыеўская..........6 лістапада

**НЕ АДПРАЎЛЯЕЦЦА ВЯНЧАННЕ**

Напярэдадні серады і пятніцы ўсяго года (г.зн. па аўторках і чацвяргах)
Напярэдадні нядзельных дзён (г.зн. па суботах)
Напярэдадні двунадзясятых, храмавых і вялікіх святаў
На працягу пастоў Вялікага, Пятровага, Успенскага і посту перад Раждаством
На працягу Каляднага перыяду (ад 7 да 19 студзеня)
На працягу Сырнага тыдня (масленіцы), пачынаючы з Нядзелі мясапуснай і ў Нядзелю сырапусную
На працягу Велікоднага (Светлага) тыдня
У дні і напярэдадні Усекнавення галавы Іаана Прадцечы — 11 верасня і Уздзвіжання Крыжа Гасподняга — 27 верасня




Родная газета на роднай мове
ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## Каталіцкі каляндар

1 студзеня ........ Святой Багародзіцы Марыі
6 студзеня ........ Аб'яўленне Пана (Тры Каралі)
10 студзеня ...... Хрост Пана
2 лютага ........... Ахвяраванне Пана
17 лютага .......... Папялец (*пачатак Вялікага посту*)
19 сакавіка ....... Святога Юзафа
25 сакавіка ....... Звеставанне Пана
28 сакавіка ....... Пальмовая нядзеля
4 красавіка ....... ВЯЛІКДЗЕНЬ
5 красавіка ....... Велікодны панядзелак
11красавіка ...... Божай Міласэрнасці
13 мая ............... Унебаўшэсце Пана
23 мая ............... Спасланне Духа Святога
30 мая ............... Найсвяцейшай Тройцы
31 мая ............... Адведзіны Найсвяцейшай Панны Марыі
3 чэрвеня .......... Цела і Крыві Хрыста
11 чэрвеня ........ Найсвяцейшага Сэрца Езуса
24 чэрвеня ........ Нараджэнне святога Яна Хрысціцеля
29 чэрвеня ........ Святых Апосталаў Пятра і Паўла
2 ліпеня ............ Найсвяцейшай Панны Марыі Будслаўскай
6 жніўня ........... Перамяненне Пана
15 жніўня .......... Унебаўзяцце Найсвяцейшай Панны Марыі
8 верасня .......... Нараджэнне Найсвяцейшай Панны Марыі
14 верасня ........ Узвышэнне Святога Крыжа
29 верасня ........ Святых Арханёлаў
2 кастрычніка .. Анёлаў Ахоўнікаў
1 лістапада ....... Усіх Святых
2 лістапада ....... Успамін усіх памерлых вернікаў
21 лістапада ..... Хрыста — Валадара Сусвету
28 лістапада ..... Першая нядзеля Адвэнту
8 снежня ........... Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі
25 снежня ......... Нараджэнне Пана
26 снежня ......... Святой Сям'і

## Лютэранскі каляндар

1 студзеня ........ Новы год. Абразанне і нарачэнне імя Ісуса
6 студзеня ........ Богаяўленне, Хрышчэнне Гасподняе
25 студзеня ...... Дзень абарачэння апостала Паўла
2 лютага ........... Стрэчанне Гасподняе
17 лютага .......... Папяльцовая серада, Пачатак Пакутнага часу
5 сакавіка .......... Сусветны дзень малітвы
25 сакавіка ....... Дабравесце
28 сакавіка ....... Вербная нядзеля
1 красавіка ....... Чысты чацвер, Дзень усталявання Прычасця
2 красавіка ....... Пакутная Пятніца
4 красавіка ....... ВЯЛІКДЗЕНЬ
25 красавіка ..... Дзень евангеліста Марка
13 мая ............... Узнясенне Гасподняе
23 мая ............... Пяцідзясятніца, свята сашэсця Святога Духа
30 мая ............... Тройца, свята Святога Трыадзінства
24 чэрвеня ........ Нараджэнне Іаана Хрысціцеля
25 чэрвеня ........ Дзень Аўгсбургскага веравызнання
29 чэрвеня .......... Дзень святых апосталаў Пятра і Паўла
2 ліпеня .............. Дзень наведвання Марыяй Елізаветы
6 жніўня .............. Перамяненне Гасподняе
28 жніўня ............ Дзень памяці ахвяраў палітычных рэпрэсій
21 верасня .......... Дзень апостала і евангеліста Мацвея
29 верасня .......... Дзень архангела Міхаіла і ўсіх анёлаў
3 кастрычніка .... Свята падзякі за ўраджай
18 кастрычніка .. Дзень евангеліста Лукі
30 кастрычніка .. Дзень памінання ахвяраў гвалту, вайны і тэрору
31 кастрычніка .. Дзень Рэфармацыі
17 лістапада ....... Дзень пакаяння і малітвы
21 лістапада ....... Дзень памінання спачылых. Нядзеля вечнасці
24 снежня ........... Куцця
25 снежня ........... Нараджэнне Хрыстова
26 снежня ........... Дзень першапакутніка Стэфана
27 снежня ........... Дзень апостала і евангеліста Іаана
28 снежня ........... Дзень бязвінна забітых немаўлят
31 снежня ........... Пярэдадзень Новага года

## Яўрэйскі каляндар

*Яўрэйскі 5770 год пачаўся 19 верасня 2009 года (1 цішрэя)*

30 студзеня .......... Ту бі-Шват — Новы год дрэў
28 лютага .......... Пурым — свята ў гонар выратавання яўрэйскага народа ад татальнага знішчэння ў Персіі
30 сакавіка — 6 красавіка.... Песах — свята ў памяць аб сыходзе яўрэяў з Егіпта
2 мая.......... Лаг ба-омер — свята ў гонар заканчэння смяротных эпідэмій у Ізраілі
19—20 мая .......... Шавуот — свята ў гонар даравання яўрэям Торы на гары Сінай
9—10 верасня .......... Рош а-Шана — яўрэйскі Новы год
18 верасня.......... Йом Кіпур — Судны дзень
23—29 верасня .......... Сукот — адно з восеньскіх святаў, якое падкрэслівае прызнанне яўрэямі волі Усявышняга
1 кастрычніка .......... Сімхат Тора — свята ў гонар штогадовага завяршэння чытання світкаў Торы ў сінагогах
2—9 снежня.......... Ханука — свята ў гонар перамогі яўрэяў у бойцы з рымлянамі і цуду гарэння Храмавай свяцільні

● Усе яўрэйскія святы пачынаюцца напярэдадні ўвечары.

## Мусульманскі каляндар

*(1431—1432 год ПА ХІДЖРЫ)*

25—26 лютага (11—12 рабі аль-аваля) .. дзень нараджэння Прарока Мухамада — Маўлід ан-Набі
17—18 чэрвеня (5—6 раджаба).......... дзень шлюбу бацькоў Прарока Мухамада — ноч Рагаіб
8—9 ліпеня (26—27 раджаба).......... узнясенне Прарока Мухамада — ноч Міradж
26/27 ліпеня (14/15 шаабана).......... ноч ачышчэння ад грахоў — Лейлят аль-Бараа
11 жніўня (1 рамадана).......... пачатак мусульманскага посту — Ураза
5/6 верасня (26/27 рамадана) .......... ноч Прадвызначэння — Лейлят аль-Кадр
9—11 верасня (1—3 шаваля).......... Свята разгавення — Ураза-Байрам — заканчэнне мусульманскага посту (*святкаванне 3 дні*)
15 лістапада (9 зуль-хіджа) .......... Дзень стаяння на гары Арафат — Дзень Арафата
16—18 лістапада (10—12 зуль-хіджа).... Свята ахвярапрынашэння — Курбан-Байрам — заканчэнне вялікага паломніцтва ў Меку (*святкаванне 4 дні*)
7 снежня (1 мухарама) .......... пачатак новага 1432 года па мусульманскім календары
16 снежня (10 мухарама) .......... дзень Ашура — дзень памінання прарокаў і пасланнікаў Алага

| СТУДЗЕНЬ | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 4 | 11 | 18 | 25 |
| АЎТ | | 5 | 12 | 19 | 26 |
| СР | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| ЧЦ | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| ПТ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| СБ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| НД | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |

| ЛЮТЫ | | | | |
|---|---|---|---|---|
| ПН | 1 | 8 | 15 | 22 |
| АЎТ | 2 | 9 | 16 | 23 |
| СР | 3 | 10 | 17 | 24 |
| ЧЦ | 4 | 11 | 18 | 25 |
| ПТ | 5 | 12 | 19 | 26 |
| СБ | 6 | 13 | 20 | 27 |
| НД | 7 | 14 | 21 | 28 |

| САКАВІК | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| АЎТ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| СР | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| ЧЦ | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| ПТ | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| СБ | 6 | 13 | 20 | 27 | |
| НД | 7 | 14 | 21 | 28 | |

| КРАСАВІК | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 5 | 12 | 19 | 26 |
| АЎТ | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| СР | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| ЧЦ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| ПТ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| СБ | 3 | 10 | 17 | 24 | |
| НД | 4 | 11 | 18 | 25 | |

| МАЙ | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| АЎТ | | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| СР | | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| ЧЦ | | 6 | 13 | 20 | 27 | |
| ПТ | | 7 | 14 | 21 | 28 | |
| СБ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 | |
| НД | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 | |

| ЧЭРВЕНЬ | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| АЎТ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| СР | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| ЧЦ | 3 | 10 | 17 | 24 | |
| ПТ | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| СБ | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| НД | 6 | 13 | 20 | 27 | |

| ЛІПЕНЬ | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 5 | 12 | 19 | 26 |
| АЎТ | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| СР | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| ЧЦ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| ПТ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| СБ | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| НД | 4 | 11 | 18 | 25 | |

| ЖНІВЕНЬ | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| АЎТ | | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| СР | | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| ЧЦ | | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| ПТ | | 6 | 13 | 20 | 27 | |
| СБ | | 7 | 14 | 21 | 28 | |
| НД | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 | |

| ВЕРАСЕНЬ | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| АЎТ | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| СР | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| ЧЦ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| ПТ | 3 | 10 | 17 | 24 | |
| СБ | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| НД | 5 | 12 | 19 | 26 | |

| КАСТРЫЧНІК | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 4 | 11 | 18 | 25 |
| АЎТ | | 5 | 12 | 19 | 26 |
| СР | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| ЧЦ | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| ПТ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| СБ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| НД | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |

| ЛІСТАПАД | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| АЎТ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| СР | 3 | 10 | 17 | 24 | |
| ЧЦ | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| ПТ | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| СБ | 6 | 13 | 20 | 27 | |
| НД | 7 | 14 | 21 | 28 | |

| СНЕЖАНЬ | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| АЎТ | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| СР | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| ЧЦ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| ПТ | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| СБ | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| НД | 5 | 12 | 19 | 26 | |

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Зміцер Вайцюшкевіч прыйшоў на інтэрв'ю з шасцімесячным сынам Язэпам. Але фоткацца з дзіцем адмовіўся — малы яшчэ, прыкмета дрэнная. Нагода для размовы — калядна-навагоднія святы, да якіх Вайцюшкевіч заўжды рыхтуе канцэрт ці новую праграму. Вось і цяпер — 7 студзеня ў канцэртнай зале «Мінск» пройдзе прэзентацыя праграмы «Мой сябра — анёлак» на вершы Арцёма Кавалеўскага.**



# Зміцер ВАЙЦЮШКЕВІЧ: «Я Ж НЁМАНСКІ І ПРАПІСАНЫ НА ХУТАРЫ...»

## «НАРМАЛЬНЫЯ МУЖЫКІ ЦЯПЕР НЯГОЛЕНЫЯ...»

**— Зміцер, у ранейшых праграмах вы паўставалі перад публікай у вобразе такога сабе мача, сэксуальнага спевака, які дзеўкам падабаецца. А цяпер во бараду адпусцілі. Я ўсё не зразумею, каго вы мне больш нагадваеце — Дзеда Мароза ці Дзеда-Барадзеда...**

— Як заўгодна, як хочаце, так мяне і клічце... Пра вобразы тут цяжка думаць — думаеш пра праекты. Лянота займацца галеннем, я не бачу сэнсу ў гэтым. Тым больш, што апошняя тэндэнцыя...

**— ...трохдзённая італьянская няголенасць?**

— Так-так, нармальныя мужыкі цяпер няголеныя! Я не так даўно бачыў Стынга...

**— ?!**

— Ну, не асабіста, а па тэлевізары. Дык ён таксама так бараду адгадаваў. Хочацца думаць, што «пад Вайцюшкевіча»... *(Усміхаецца.)* Мне барада не замінае, я ж нёманскі і прапісаны на хутары, таму барада мне адпавядае. Не магу я быць такім гарнітурным, паголеным, дагледжаным... Пакуль што. Хоць гарнітур маю.

**— А я думаў, можа, гэта забабон такі — пакуль артыст не запіша альбом, не голіцца...**

— Не-не, я ўжо другі год так хаджу. Я, відаць, ужо дасягнуў сваіх мэтаў сэксуальных...

**— Цяпер можна быць любым?**

— Так... Але гэта не азначае, што за сабой не трэба сачыць.

## «СПЯВАЮ ДЗЕЦЯМ, ЖАНЧЫНАМ І САБЕ!»

**— А з гэтых персанажаў навагодніх — Святы Мікола, Дзед Мароз, Зюзя — хто вам найбліжэйшы? Хто вам у дзяцінстве падарункі прыносіў?**

— Ну, я ж нарадзіўся ў савецкі час, там пра Зюзю ніхто не казаў. Тым больш — пра Святога Міколу, пра яго я даведаўся ўвогуле з песні Шалкевіча! Таму, само сабой, гэта быў Дзед Мароз, нейкія падарункі пад ёлку клаліся... Цяпер, калі я ўжо ўсіх ведаю, магу сказаць, што мне найбліжэйшы Зюзя. У мяне нават ёсць пра яго песня, я яе часам спяваю на канцэртах, дзецям яна вельмі падабаецца. Год таму я выйшаў на канцэрт у вобразе Зюзі. Гэтыя ж канцэрты на Каляды — яны традыцыйныя...

**— Алесь Камоцкі робіць штогод канцэрт на свой Дзень нараджэння... Дзень народзінаў, а Вайцюшкевіч — на Каляды. Гэта гаворыць пра расстаноўку акцэнтаў?**

— Абсалютна няправільна! Я першы пачаў рабіць канцэрты на свой Дзень народзінаў! *(Смяецца.)* Камоцкага я люблю — і жадаю яму здароўя, бо ён цяпер у шпіталі... У мяне ўвогуле тры даты ёсць у годзе, такія «стабільныя» — 7 студзеня, 8 Сакавіка і Дзень народзінаў. Дзецям, жанчынам і сабе!.. Бо чаму жанчыны і чаму дзеці? Гэта такая аўдыторыя, як жа яе называюць рэкламшчыкі...

**— Фокус-група?**

— Фокус-група! Брыдкае, бяздушнае слова!

**— Цяжка ствараць песні для дзяцей?**

— У мяне нарадзіўся другі сын Язэп — і мне здалося, што варта яму зрабіць падарунак. Першаму я зрабіў падарунак — праграму «Цацачная крама» на вершы Леаніда Дранько-Майсюка.

**— Такое адчуванне, што станоўчая дэмаграфія падорыць нам шмат добрых дзіцячых вершаў і песень...**

— У нас тыя пісьменнікі, якія могуць нараджаць дзяцей, яны пішуць постмадэрн пра жахі розныя, пра сучаснае мастацтва. Ім не да дзетак. Хоць той жа самы Жыбуль — у яго нарадзіўся сын, і ён па-свойму гэта ўсё пераасэнсоўвае...

## «АНЁЛКІ — НАД УСІМІ: НАЧАЛЬНІКАМІ, МІЛІЦЫЯНЕРАМІ, МІНІСТРАМІ...»

— Дзеля чаго патрэбны праект пра анёлкаў? Усе асобна ў нас робяць праекты, геніяльныя, кожны стараецца выпендрыцца як можа. А ў прынцыпе, для грамады — дык гэта нічога. Анёлкі — гэта для ўсіх. Чарговы супольны праект на Каляды — гэта знак таго, што мы ёсць. Гэта спосаб сказаць, што культура нейкім чынам развіваецца, а не проста кожны ў сваім завуголлі нешта робіць.

**— Гэта было галоўнай прычынай, каб зрабіць супольны праект, а не заспяваць усё самому?**

— Не, гэтую «базу» я ўжо потым прыдумаў, філасофія прыйшла пазней. У нашым свеце чалавеку часта зручней мець сабаку, чым жонку. Ці наадварот. І вось быў праект «Калыханкі». Дык калыханкі — гэта каб чалавека прытуліла. А анёлкі — гэта над усімі, над кожным. Над начальнікамі, міліцыянерамі, пракурорамі, адвакатамі, міністрамі... Над кожным павінен быць анёлак. Часам глядзіш на якога начальніка злоснага і набычанага — і думаеш, што ягоны анёлак ад яго ўцёк. Песні з праекта — гэта простыя песні да свята. Бо як сабе ўяўляецца беларускае свята цяпер? Гэта пэўныя газеты, дзе «зоркі» разышліся-сышліся, хто колькі атрымаў на карпаратывах. Уключаецца тэлевізар — Надзя Бабкіна... І мне здаецца, што людзі ў стане выбраць адзін з тых дыскаў, якія ўжо ёсць. Гэта спосаб навучыцца жыць па-новаму, па-свойму.

**— Дык «Мой сябра — анёлак» — калядны дыск?**

— Дарослыя ўвогуле любяць такія расклады: што калі ўключаць. А гэты дыск трэба слухаць, напрыклад, у дарожных заторах. Вось ты не мог да мяне даехаць — і ўвесь дыск паслухаў.

**— Ну, так. І амаль не злаваўся на надвор'е і тысячы машын...**

— Вось!.. Таму дарослыя хай слухаюць, калі ім захочацца. А дзеці няхай слухаюць, калі ім падабаецца. Я ведаю знаёмых, у якіх дзецям падабаюцца мае дыскі. І дзіця штодня, калі бацька вязе яго ў школу/са школы, патрабуе ўключыць дыск. І бацька шалее, бо яго ўжо задраў гэты Вайцюшкевіч, ён ужо ўсё на памяць ведае! А дзіцяці падабаецца! Ён гатовы гэта нон-стоп слухаць. Таму на дыску, вядома ж, ёсць тэма — ёлкі-анёлкі. Але я думаю, што яго можна слухаць не толькі зімою.

**— А вы не баяліся, што дваццаць адна песня пра анёлкаў — гэта зашмат?**

— Таму я і запрасіў розных салістаў. Бо інакш мяне б зненавідзелі — і дзеці, і бацькі! Я толькі вярнуўся з Амерыкі, дзе зразумеў банальную рэч: хочаш быць шчаслівым — рабі шчасце іншым, рабі нешта для іншых. Таму і на дыску я лепшыя песні іншым аддаў, сам заспяваў тое, што засталося...

## «Я ХАЧУ, КАБ МОЙ СЫН БЫЎ, СКАЖАМ, ГІНЕКОЛАГАМ»

**— А вам у Бярозаўцы што на Новы год дарылі?**

— Цукеркі «Грыльяж»... Апельсіны мараканскія... Сервелат! *(Смяецца.)* Гэта настолькі было смачна, што я ўсё жыццё памятаю... Нейкіх спецыяльных падарункаў не было...

**— А вы што дорыце?**

— Я не самы лепшы ў гэтым сэнсе «дарыльшчык», для мяне гэта пакута. Магчыма, злосны на сваё дзяцінства — па Фрэйду — мауляў, мне нічога не дарылі — і вырас, нічога страшнага.

**— «І вы вырасцеце!»**

— Так-так! З іншага боку, музыка, якую я зрабіў на працягу года — яна таксама можа быць падарункам...

**— Дык гэта — для ўсіх. А персанальна?**

— А персанальна — з подпісам!

**— У песні «Лічылка» дэбютаваў ваш шасцімесячны Язэпка. Выводзіце ў людзі, гадуеце пераемніка?**

— Я называю яго халяўшчыкам, таму што я ў ягоныя гады яшчэ не думаў пра дыскі! *(Смяецца.)* Я не хацеў бы такой «сямейнасці». Я хацеў бы, каб ён быў гінеколагам, напрыклад, — «доктар Вайцюшкевіч». Ці кім заўгодна, галоўнае, каб добрым чалавекам.

**— У вас здараліся цуды на Каляды?**

— Цуд на Каляды быў у 1996 годзе, калі мы сядзелі з Веранікай Кругловай у кватэры — і не было чаго пажраць. І тут раптам патэлефанавалі і сказалі: прыязджайце, у вас халтура, у адным буціку трэба граць карпаратыў. Гэта быў цуд на Каляды, бо мы атрымалі 300 долараў і змаглі годна адзначыць святы.

**— А падарункі вам якія дораць?**

— Мне падарункі дораць не толькі на Каляды, але і проста на канцэртах. Вось партрэт мой падаравалі, вышыты крыжыкам. Прыемна... Цацкі, само сабой...

**— Можа, у вас, як у Леаніда Якубовіча — ёсць «Музей Поля цудаў»?**

— Мне не столькі дораць!.. Я ўвогуле рады, што мяне мала пазнаюць на вуліцах, я магу існаваць, спяваць — і пры гэтым спакойна хадзіць на Камароўку.

**— Вы так часта згадваеце ў інтэрв'ю і на канцэртах свой хутар на Нёмане...**

— Гэта частка майго жыцця, частка маёй энергіі. Я хачу ў пэўным сэнсе збудаваць там ідэальны свет. Я хачу знайсці там тое, што чалавек шукае на працягу жыцця. І калі ўцякаць — то не ў Амерыку, а на Нёман.

**— Калі б не Язэпка, праграма атрымалася б такой жа?**

— Я не думаю, што яна ўвогуле была б. Я прысутнічаў пры родах, усе 10 гадзін быў з жонкай. І мне здалося, варта зрабіць і ёй падарунак, і Язэпу...

Язэп, трэба сказаць, мужна выцерпеў бацькавы развагі пра анёлкаў і Каляды. І мне падалося, што з гэтага малога будзе толк. І не важна, ці будзе ён спяваць, як татка, ці будзе гінеколагам.

**Глеб ЛАБАДЗЕНКА.**
**Фота аўтара.**

### ХТО БУДЗЕ НА КАНЦЭРЦЕ



**У праграме «Мой сябра — анёлак» — 21 песня. Апроч Зміцера Вайцюшкевіча, на сцэне заспяваюць Наста Някрасава (гурт «Рок-фолк»), Алесь Зайцаў (гурт «Босае сонца»), Янка Маўзер (гурт «Маўзер»), Бенька (гурт «Срэбранае вяселле»), Коля Прылуцкі (акцёр тэатра Я. Купалы), Яўгенія Лятун («Дыліжанс»), Ксенія Мінчанка (WZ — Orkiestra), Галя Казіміроўская («Concordia Chor»), Ганна Хітрык (гурт «Дзецідзяцей»).**

### КАЛЯДНЫ АНЕКДОТ АД ВАЙЦЮШКЕВІЧА

**Тэлефануе Стывен Спілберг акцёру Купалаўскага тэатра і кажа:**
**— Дарагі, я запрашаю цябе ў свой новы фільм на галоўную ролю, ганарар — мільён долараў! Здымкі будуць ад сярэдзіны снежня да пачатку студзеня.**
**Акцёр з выбачэннем адказвае:**
**— Даруй, Стыў, не магу — у мяне ёлкі...**

### НЕ ПРАПУСЦІ!

**Дзе: канцэртная зала «Мінск»**
**Калі: 7 студзеня 2010 года**
**У колькі: пачатак а 19.00**

### ПАСЛУХАЙ «АНЁЛКАЎ» ЗАРАЗ!

**Для тых, хто не трапіць на канцэрт ці хоча паслухаць кампазіцыі наперад — сайт http://www.anelak.todar.net, дзе можна пачуць усе песні з дыска, а таксама бясплатна спампаваць іх сабе.**







# ПЯТНІЦА, 8 СТУДЗЕНЯ

7.40 Мультфільм «Дзед Мароз і лета».
7.55 «Добрай раніцы, Беларусь!».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
**9.05 Фільм-казка «Разумныя рэчы».**
**11.20, 23.40 Камедыя «Саламяны капялюшык».**
14.00 Сольны канцэрт групы «Лепрыконсы».
15.10 Навіны рэгіёна.
15.25 Вакол планеты.
16.05 «Таямнічы лес».
**16.20 Серыял «Мяжа. Таежны раман».**
**19.05 Серыял «Сваты».**
21.00 Панарама.
21.40 Урачыстая цырымонія ўручэння прэмій «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтваў.

7.00 «Наша раніца».
8.00, 09.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
**9.05 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».**
9.40 «Анёлы-ахоўнікі».
**10.30 Маст. фільм «Маленькая прынцэса».**
12.15 «Галіна Уланова. Адзіноцтва багіні».
**13.15 Трагікамедыя «Аб бедным гусары закіньце слова».**
16.15, 21.00 Навіны спорту.
16.20 Анімацыйны фільм «Прыгоды Алёнкі і Яромы».
**17.50 Камедыя «Вар'яцкія гонкі».**
19.30 «Поле цудаў». Святочны выпуск.
**21.05 Меладрама «Мільянер з трушчобаў».**
23.20 «Прытулак камедыянтаў».

7.00 Добрай раніцы.
**8.00 Меладрама «Слухаючы цішыню».**
**9.50 Серыял «Месца сустрэчы змяніць нельга».**
**13.05 Меладрама «Дунечка».**
14.55 «Свая музыка. Працяг».
15.25 Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны.
**16.50 Камедыя «Бітлджус».**
18.35 Усё пра бяспеку.
19.05 Пра мастацтва.
19.35 «Рэпарцёр «Беларускі часнік».
**20.25 Меладрама «Вы не пакінеце мяне...».**
22.25 «Марк Першы, формула майстра». Дак. фільм.
23.15 Фестываль «BBC Proms 2009».

7.00 М/ф.
**8.40 Фільм-дзецям «Прыгоды Пятрова і Васечкіна, звычайныя і неверагодныя».**
**10.55 Мюзікл «Вечары на хутары бліз Дзіканькі».**
**12.30 Фільм дзецям «Мост у Тэрабіцію».**
**14.10 Камедыя «Труфальдзіна з Бергама».**
16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
16.40 «Званая вячэра».
17.25 «Аўтапанарама».
17.45 «Кубак чэмпіёнаў КВЗ».
**20.00 Маст. фільм «Біблітэкар».**
21.45, 22.55 «Квартэт І».
23.30 «Гарачы лёд».
**0.00 Маст. фільм «Дзяўчына з Джэрсі».**
1.40 «Відзьма-нявідзьма».

**5.00 Маст. фільм «Клуб шпіёнаў».**
7.00 «Цік-так».
7.15 М/ф «Мільён у мяшку».
**7.45 Маст. фільм «У пошуках капітана Гранта».**
9.10 М/ф «Шайбу, шайбу».
**9.45, 23.00 Маст. фільм «Без панікі, маёр Кардаш!».**
11.30 «Смачны свет».
12.00, 18.00 Навіны Садружнасці.
12.10 М/ф «Казка пра цара Салтана».
13.30 «Удачная пакупка».
**13.40 Серыял «Старшакласнікі».**
14.10, 3.30 «Даведнік».
14.50, 0.30 «Асабістыя рэчы з Андрэем Максімавым».
**15.50 Маст. фільм «Царскае паляванне».**
**18.20, 4.00 Серыял «Махляры».**
**19.20, 1.30 Маст. фільм «24 гадзіны».**
21.00 Канцэрт. Тамара Гвердцытэлі.
22.20 Простыя лічбы «Вячаслаў Зайцаў».

7.00 «К-гульні».
7.10, 10.55, 23.45 «Надвор'е».
**7.15 Камедыя «Крошка».**
9.00 «Дом жывых гісторый».
9.30 «Музычны апельсін».
**10.00 Серыял «Прытворшчык».**
**11.00 Драма «Валянцін і Валянціна».**
12.50 Мультфільм «Ноч перад Калядамі».
**14.00 Камедыя «Міміно».**
16.00 «Мультпарад».
16.20 «Пляткарка».
**16.30 Серыял «Альф».**
17.00 «Адшукваецца адпачынак».
17.30 «Праз 30 гадоў».
**17.45 Серыял «Кіраўнік дзяржавы».**
**18.45 Маст. фільм «Паўночнае ззянне».**
20.50 «Вечарніца».
21.05 «К-відэа для ўсёй сям'і».
**21.15 Маст. фільм «Нічога асабістага».**

### РТР Беларусь

**7.00 Маст. фільм «З новым шчасцем!-2. Пацалунак на марозе».**
**9.15, 19.20 Серыял «Аднойчы будзе каханне».**
10.05 «Мой сярэбраны шар. Галіна Уланова».
11.00, 14.00, 19.00 Весткі.
11.20 «Пакой смеху».
11.35 Міжнародны конкурс дзіцячай песні «Новая хваля-2010».
**14.20 Серыял «Сваты».**
16.15 Юбілейны вечар Аркадзя Арканава.
**17.55 Серыял «Карменіта. Цыганская страсць».**
18.50, 22.35 Навіны — Беларусь.
**20.20 Камедыя «Святая справа».**
**22.45 Камедыя «Карнавал».**

### НТВ Беларусь

**6.20 Серыял «Аўтобус».**
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.15 «Іх норавы».
8.50 Мультфільм.
**10.20 Серыял «Расклад лёсаў».**
12.05 «Следства вялі...».
13.20 «Суперстар» прадстаўляе: «Я застаюся, каб жыць».
**16.25 Трылер «Ваўкадаў».**
**19.25 Камедыя «Заходзь — не бойся, выходзь — не плач...».**
**21.10 Меладрама «Хлопчыкі і дзяўчынкі».**
**22.55 Трагікамедыя «Бесклапотная».**

### ТНТ

5.00 «Жыццё і прыгоды робата-падлетка». Мультсерыял.
5.30 «Дзікая сямейка Торнберы». Мультсерыял.
6.00, 6.30, 6.55 «Нікеладэон».
7.25, 11.00 «Пінгвіны з «Мадагаскара». Мультсерыял.
7.45 «Нашы песні». Л. Міловіч.
8.00, 3.00 «Невытлумачальна, але факт».
9.00 «Прадвеснікі буры». Фантастыка.
**11.30, 1.10 «Сябры». Серыял.**
**12.00, 18.00 «Жаночая ліга: хлопцы, грошы і каханне». Камедыя.**
**13.00, 17.00 «Шчаслівыя разам». Камедыя.**
14.00, 19.00 «Універ». Сітком.
**15.00 «Мацільда». Камедыя.**
20.00 «Comedy Woman».
21.00 «Камедзі Клаб».
22.00, 2.05 «Дом-2».
23.30 «Не тыя дзверы».
0.00 «Забойная ліга».
1.45 «Шоу камедыянтаў».
3.55 «Начныя гульні».

### КУЛЬТУРА

5.00 «Еўранъюс».
9.00 Навіны культуры.
9.20, 0.50, 1.50 Праграма перадач.
**9.30 «Дзелавыя людзі». Маст. фільм.**
10.55 «Кепка ў клетку».
11.25 «Незвычайны матч». М/ф.
**11.45 «Вераніка». Маст. фільм**
13.15, 0.55 «Лясы жыватворнага дажджу». Дак. фільм.
**14.10 «Сватаўство гусара». Маст. фільм.**
15.20 «Сусветныя скарбы культуры». Дак. фільм.
15.40 100 гадоў з дня нараджэння Галіны Уланавай. «Незададзеныя пытанні». Дак. фільм.
16.30 «Рамэа і Джульета». Фільм-балет.
18.10 Смеханастальгія.
**18.40 «Вакзал для дваіх». Маст. фільм.**
20.50 «Лінія жыцця». Эльдар Разанаў.
**21.45 «Сісі — маладая імператрыца». Маст. фільм.**
23.30 75 гадоў з дня нараджэння Элвіса Прэслі. «Прывітанне з Гавайскіх астравоў». Канцэрт.
**0.30 «Кот і клоўн». «Леў і 9 гіен». М/фы для дарослых.**

### НОСТАЛЬГИЯ

6.00, 10.00, 15.00, 20.00, 1.00 «Прайшоўшы ЧАС».
6.50, 9.45, 14.45, 5.45 «Ералаш».
7.15, 12.15, 3.15 «Калядныя сустрэчы». 1993 год.
**8.30, 13.30, 18.30, 23.25, 4.30 Серыял «Дзень за днём».**
11.00, 16.00, 21.00, 2.00 «Народжаны ў СССР».
17.15 «Глыбокія сваякі». Кароткаметражны фільм.
17.45 Навагодняя «Ранішняя пошта».
19.45, 0.45 «Добрай ночы, малыя!».
22.00 «Віншаванні «Навагодняму Агеньчыку». 1981 год.
22.30 «Рана раніцай».

### Наше кино

6.30, 12.30 Драма «Заўсёды са мною...».
8.30, 14.30 Камедыя «Набожная Марта».
10.50, 16.50 Дэтэктыў «Смерць у кіно».
18.30, 0.30 Камедыя «Запасны гулец».
20.30, 2.30 Баявік «Штэмп».
22.30, 4.30 Маст. фільм «Незабудкі».

### 2

3.00, 11.00, 19.00 Серыял «Жанчыны ў гульні без правілаў».
3.45 Маст. фільм «Мама не бядуй-2».
5.30 Меладрама «Ваенна-палявы раман».
6.55 Маст. фільм «Новыя прыгоды Янкі пры двары караля Артура».
9.30 Казка «Як Іванка-дурань па цуд хадзіў».
11.45 Камедыя «Трэст, які лопнуў».
15.00 Маст. фільм «Жорсткі раманс».
17.20 Камедыя «Асаблівасці нацыянальнай рыбалкі».
19.45 Маст. фільм «Арэлі».
21.15 Маст. фільм «Свой сярод чужых, чужы сярод сваіх».
22.50 Меладрама «Дзіўныя дарослыя».
0.05 Камедыя «Чалавек ніадкуль».
1.25 Дэтэктыў «Чорны прынц».

### TV XXI

9.00, 17.00, 1.00 Драма «Сэрцы трох».
10.00, 18.00, 2.00 Меладрама «Лета з сябрам сям'і».
11.35, 19.35, 3.35 Драма «Усе ночы».
13.30, 21.30, 5.30 Камедыя «Клеркі -2».
15.10, 23.10, 7.10 Драма «Справы Назарацяніна».

### TV 1000

3.00 М/ф «Астэрыкс і вікінгі».
5.00 Камедыя «Забіць міс Тынгл».
7.00 Драма «Звар'яцелая і цудоўная».
9.00 Камедыя «Прынцэса Лёду».
11.00 Драма «Эвелін».
13.00 Драма «Хардбол».
15.00 Трагікамедыя «Містэр Адзінота».
17.00 Камедыя «Вялікая белая абуза».
19.00 Драма «Кэндзі».
21.00 Драма «Злучаныя штаты Ліланда».
23.00 Камедыя «Па пакупкі на ноч гледзячы».
1.00 Трагікамедыя «19».

### ТВ 3

5.00 Маст. фільм «Поўнач супраць поўдня».
6.50 М/ф «Чарапашкі ніндзя».
7.15 М/ф «Каспер».
7.40 М/ф «Прыгоды мульцяшак».
8.05 М/ф «Гарэзлівыя анімашкі».
8.30 М/ф «Том і Джэры: Хуткі і пухнаты».
10.00 Маст. фільм «Дынатопія».
12.00, 20.00 Дак. фільм «Таямніцы вялікіх магаў».
13.00 «Наперад, у мінулае!» Серыял.
18.15 Маст. фільм «Грэндэл».
21.00 Маст. фільм «Вядзьмак».
0.00 «Дзясятае каралеўства». Серыял.
2.00 «Клан вампіраў». Серыял.
4.00 Релакс.

### zone romantica

7.00, 18.40, 5.20 «Рэванш-ІІ».
7.55, 2.40 «Жанчына Ларэнса».
8.50, 14.10, 0.55 «Жонка Іуды».
9.45, 15.05, 3.35 «У пошуках бацькі».
10.40, 20.30 «Плата не па заслугах».
11.30, 16.55, 21.20 «Стол на траіх».
12.25, 1.50, 6.10 «Тайна Лауры».
13.20, 23.05, 4.30 «Сямейная сувязь».
16.00, 19.35, 22.10 «Ніколі не позна?».
0.00 «Казачны прынц».

### Sci Fi

7.30 «Блізняты». Камедыя.
9.15, 12.30 Квантавы скачок.
10.05, 14.10, 17.30 Прытворшчык.
10.55, 18.20 Цёмны анёл.
11.40, 19.10 Зорны крэйсер «Галактыка».
13.20, 16.40 Якія слізгаюцца.
14.55 «Сэрца і душы». Камедыя.
20.00 «Дванаццаць малпаў». Фантастыка.
22.10, 23.00 Легенда аб Шукальніку.
23.50 «Беласнежка: Страшная казка». Жахі.
1.30 Кароткаметражныя фільмы.

### Детский мир

5.00, 09.00, 13.00 Маст. фільм «Тры талеры».
5.55, 09.55, 13.55 Мультсерыял «Кацяня па імені Гаў». М/ф: «Пойга і ліса», «Таямніца далёкага вострава», «Хітрая варона».
7.00, 11.00 М/ф: «Чарадзейны пярсцёнак», «Як стаць вялікім», «Прыгоды Чычыкава. Ноздраў», «Сумленнае кракадзілава».
8.00, 12.00 Мультсерыял «Сандакан. Два тыгры». М/ф: «Змей на гарышчы», «Тры зяці», «Вясёлая карусель» №17.
15.00 Казка «Як Іванка-дурань па цуд хадзіў».
16.25 Мультсерыял «Кацяня па імені Гаў». М/ф: «Вясёлая карусель» №1, «Кантакт».
17.00 М/ф: «Апошні пялёстак», «Рукавіца», «Знік Пеця-пеўнічак», «Як мы вясну рабілі».
18.00 Мультсерыял «Сандакан. Два тыгры». М/ф «Страказа і мураш».

### Здоровое ТВ

5.00, 6.35, 15.25, 17.00, 4.05 Набалелае пытанне.
5.40, 16.05 Колькі вам гадоў?
7.15, 17.40 Як не страціць здароўе.
7.45, 15.00, 18.10, 20.05, 3.40 Правілы здароўя.
8.10, 18.35 Пазнай сябе.
8.40, 20.30 Нетрадыцыйная медыцына.
9.10, 21.00 Школа розуму.
9.40, 21.30 Клінічны гіпноз.
10.10, 22.00 Панацэя.
10.40, 22.30 Я чакаю дзіця.
11.10, 23.00 Курс лячэння.
12.10, 13.35 Увага, ежа!
12.35, 0.50 Будзем здаровыя.
14.00, 19.05, 2.40 Дзіця нарадзілася.
4.45 Энцыклапедыя памылак.

### ТДК

6.00, 10.50, 11.50, 12.50, 15.50, 16.50, 17.50, 18.50, 22.55 Парады ТДК.
6.35, 14.00 Усё лепшае, для Вас.
7.35, 10.00, 17.00, 1.00 Красуня.
8.00 Добрай раніцы, Каханая!
9.00 Культ наяўнасці.
11.00, 2.00 Нашы дзеці.
12.00, 22.10, 5.00 Ваш доктар.
13.00 Прыгажосць і здароўе.
13.30, 22.30 Серыял «Гвадэлупе».
15.00, 4.00 Твой дом.
16.00, 3.00 Гісторыі поспеху.
18.00 Дапамажы сабе сам.
19.00 Люстэрка жыцця.
20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
21.00 Сэксуальная рэвалюцыя.
22.00 Мужчынская сіла.
23.05 Алоха, Гаваі.

### Discovery Channel

7.00, 14.45 «Пятая перадача».
7.25, 15.15, 0.00, 4.45 «Маланкавыя катастрофы».
8.20, 16.10, 23.00 Выжыць любой цаной.
9.15, 19.00, 22.00, 3.50 Разбуральнікі легендаў.
10.10, 21.00, 2.55 «Галаваломы».
11.05, 20.00, 5.10 Як гэта працуе.
11.35, 20.30, 5.40 З чаго гэта зроблена?
12.00, 17.05 Народжаны ў катастрофах.
12.55, 18.00, 1.00 «Круты цюнінг».
13.50 Амерыканскі чопер.
23.00 Скрыўленне часу.
0.30 Якія цудам выратаваліся — крутыя здымкі.
2.00, 6.05 Аўтамайстэрні.

### National Geographic Channel

5.00 «Следства па справах драпежнікаў».
6.00, 14.00 «Небяспечныя сустрэчы».
7.00, 12.00 «Бабровая плаціна».
8.00, 13.00 «Мама кабаноў».
9.00, 15.00 «Усё пра гадзюк».
10.00, 16.00 «Сігнал выратавання — чырвоны».
11.00, 19.00, 1.00 «Секунды да катастрофы».
11.30, 19.30, 1.30 «Рэальнасць або фантастыка?».
17.00, 4.00 «Самы цяжкі ў свеце рамонт».
18.00 «Свет драпежнікаў».
20.00, 23.00, 2.00 «З пункту гледжання навукі».
21.00, 0.00, 3.00 «Забароны».
22.00 «Дзікі сэкс».

### travel channel

7.00, 12.00, 16.00, 20.00, 23.00, 1.00, 4.00 Сусветны вандроўца.
8.00, 15.00 Аб галоўным.
8.30 Рудзі Макса падарожнічае па свеце.
9.00 Маляўнічыя чыгункі.
9.30, 17.00 Лыжны свет.
10.00, 13.00, 18.00 Шэф-кухар за мяжой.
10.30, 14.30 Смак Мексікі.
11.00 Планета ежы.
13.30, 18.30 Прагны вандроўнік.
14.00 Вандроўнік са смакам.
17.30 Экстрэмальныя вандраванні.
19.00, 0.00, 6.00 Бясстрашныя вандроўнікі.
21.00, 2.00 У пошуках невядомага.
22.00, 3.00 Бушуючая планета.
22.30 Фотадаследчыкі.
5.00 Па чыгунках Швейцарыі.

### Animal Planet

7.00, 11.50, 16.25 «SOS дзікай прыроды».
7.25, 12.15, 15.30 «Ветэрынарная «хуткая дапамога».
7.50 «Тэрыторыя жывёл».
8.45, 12.45 «Самыя забаўныя жывёлы планеты».
9.40, 16.50, 6.10 Аддзел па абароне жывёл.
10.05, 17.20, 20.10, 22.55, 3.30 Паліцыя Фенікса — аддзел па абароне жывёл.
10.55 Прагулкі Джэфа Корвіна.
13.40 Ільвы і волаты.
14.35, 5.20 Вуліца лемураў.
15.00, 5.45 «Малпіны выхадкі».
15.55, 6.35 «Пашпарт для ўлюбёнца».
18.15, 22.00, 2.35 Пад покрывам ночы.
19.10, 0.45 Ільвы з кракадзілавай ракі.
21.05, 1.40 Дзікія і небяспечныя.

### Eurosport

9.30, 13.45, 21.20, 0.00, 1.45 Ралі рэйд. Дакар.
10.15 Санкавы спорт. Кубак свету.
10.45 Тэніс. Турнір WTA.
12.45, 17.00, 18.45 Тэніс. Турнір ATP.
14.30 Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
15.30, 19.30, 20.10 Біятлон. Кубак свету.
18.40 Тэніс. Жусцін Энен.
20.00 Футбол. Еўрагалы.
20.45, 21.30 Дартс. Чэмпіянат свету.
23.00 Самыя дужыя людзі планеты.
0.45, 1.15 Экстрэмальныя віды спорту.
1.30 Вось гэта дзіва!!!

### MTV

5.00, 11.25, 0.05 Новы год з MTV.
6.00 Стэрэа_раніца. The Best.
8.50 Вобыск і спатканне.
9.15 Наступны.
9.40 Тайныя спакусы курортнага гатэля.
10.05 Трэндзі.
10.35, 18.45 «Губка Боб у Квадратных Штоніках».
11.00, 19.10 «Аватар».
12.25, 22.45 Сусветны чарт MTV.
13.20 Мадэльная школа ведзьмы Джэніс.
13.50 Праект «Подыум».
14.45 Сяброўка Пэрыс Хілтан.
15.40 Ужо можна.
16.05 Клініка.
17.00 Тачку на пракачку.
17.20 Дзікуны.
17.45 Рэактыўныя клоўны.
18.15 Страшна цікава.
19.40 Падстава.
20.05 Па дамах.
21.00 MTV Live Fall Out Boy.
21.25 MTV Live Linkin Park.
23.40 Дзяўчынкі «Плэйбоя».

06.00, 0.00 «PLAY».
10.00 Серыял «Ранеткі».

### ІНТЕР+

7.00, 13.05 Песня года.
8.05, 14.00 Фестываль гумару.
9.40, 18.30 Месца сустрэчы.
11.05 Шыканём.
11.50 Міхаіл Жванецкі.
15.30 Дванаццаць крэслаў — за кадрам.
15.50 Мюзікл «Дванаццаць крэслаў».
20.00, 3.00 «Падрабязнасці».
20.20 Мюзікл «Сарочынскі кірмаш».
22.05 Сарочынскі кірмаш — за кадрам.
22.35 Маст. фільм «Старадаўні вадэвіль».
23.45, 5.05 Святочны канцэрт на Інтэры.
3.20 Мюзікл «Сарочынскі кірмаш».
6.30 Не першы погляд.

### 1+1

6.20 «Дыскатэка 80-х. Лепшае».
10.15 М/ф «Усе сабакі трапляюць у рай-2».
11.40 М/ф «Карлік Нос».
13.10 «Крывое люстэрка. Навагодняе».
15.50 Камедыя «Школьны мюзікл».
17.40 М/ф «Атлантыда: Закінутая імперыя».
19.30 ТСН.
20.00 Камедыя «Рэальны тата».
21.55 Камедыя «Рэальнае каханне».
0.25 Камедыя «Прадаўшчыца».
2.05 «Задорнаў. Вялікая краіна з непрадугледжаным мінулым».
3.50 Маст. фільм «Пагулянемся».
5.25 М/ф «Усе сабакі трапляюць у рай».

## 21.05 ФІЛЬМ ДНЯ

### «МІЛЬЯНЕР З ТРУШЧОБАЎ»

**(ЗША, ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ, 2008 Г.)**

Джамал Малік у адным кроку ад выйгрышу ў тэлевіктарыне «Хто хоча стаць мільянерам?», але як 18-гадовы хлопец без адукацыі, які вырас у трушчобах Мумбая, змог гэта зрабіць? Адказ на гэта пытанне — гісторыя жыцця Джамала, поўная драматычных прыгод і кахання.

**Рэжысёры** — Дэні Бойл, Лаўлін Тандан. **У ролях:** Дэў Патэль, Фрэйда Пінто, Мадхур Міталь.




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЯКІ ВЫ НАВАГОДНІ ПЕРСАНАЖ?

**«Галоўнае — каб касцюмчык сядзеў», — сцвярджалі персанажы адной навагодняй казкі. І мы з імі цалкам згодныя: каб адчуваць сябе на свяце ў сваёй талерцы, трэба не нацягнуць у мітусні касцюмчык з чужога пляча. Хочаце ведаць, які падыдзе менавіта вам? Уявіце: на гадзінніку без пятнаццаці поўнач, а вы...**

**1.** Ведаеце на памяць сто трыццаць тэматычных вершыкаў і прыпевак, адрозніваеце навобмацак найноўшыя мадэлі канструктараў і адценні сукенак лялек, але з цяжкасцю ўзгадваеце, як і дзе правялі апошнія два дні, што за дзяўчынка круціцца ў вас пад нагамі і куды вы абодва цягнецеся скрозь цемрадзь па калена ў гурбах.

**Віншуем! Вы — Дзед Мароз.** Ваш убор традыцыйны і нескладаны: чырвонае доўгае паліто (можна махровы халат), валёнкі, чырвоная шапка (не, купальную нельга, вушы адмарозіце), рукавіцы, доўгая сівая барада (а калі няма — растрыбушыце вяхотку) і абавязкова вялікі мех (можна і з катом, аднак лепш з падарункамі, інакш не нальюць, а паб'юць).




**2.** Ведаеце на памяць не толькі сто трыццаць тэматычных вершыкаў і прыпевак, але таксама змест усіх навагодніх казак і спіс адрасоў, па якіх трэба завітаць да раніцы. Самастойна вы справіліся б з гэтым за гадзінку, аднак, мяркуючы па ўсім, нецвярозага дзеда, які цяжка дыхае ў спіну, давядзецца несці на сабе.

**Віншуем! Вы — Снягурка.** У касцюме вам дазволеныя некаторыя вольнасці — белы, залаты, блакітны кажушок, доўгі ці кароткі — на выбар. Толькі ўлічвайце, што калі абераце кароткі, то неўзабаве станеце не чырвонай дзеўкай, а сіняй. Па штатным раскладзе патрэбныя яшчэ боцікі, рукавіцы і каса да пояса (калі сваёй няма, сцягніце вяхотку ў дзеда з барады — яму ўжо ўсё адно, а вам хоць крыху цяплей).

**3.** Усё навокал нязвычна прыгожае, але цэнтр свята, безумоўна, — вы. На вас усе глядзяць, любуюцца, а можа нават прынюхваюцца з непрыхаваным задавальненнем. І ўсе святочныя пакункі ў шапаткіх абгортках без выключэння ў гэты вечар — ля вашых ног.

**Віншуем! Вы — навагодняя ёлка.** А мо сасна ці піхта, хто ведае. Ваш варыянт — апранаць зялёнае ці белае, а зверху як мага больш бліскучага і зіхоткага, і можна атрымліваць асалоду ад карагодаў і харавых спеваў у ваш гонар. Толькі трымайцеся падалей ад электрапрыбораў і бенгальскіх агнёў, а то пажарныя, ведаеце, таксама святкуюць...

**4.** Вы адзін у чыстым полі, а вакол толькі завіруха і, як у песні, «ні машын ні людзей». На спробы дакрычацца хоць да якой жывой душы ў лепшым выпадку прыбяжыць заяц, у горшым — разбуджаны вашымі гаротнымі лямантамі мядзведзь. Вам яно трэба?

**Спачуваем! Вы — снегавік.** Не важна, што там на вас апранута — па законах жанру давядзецца пакачацца як след у снезе, прымераць вядро на галаву і, заціснуўшы моркву ў зубах (што зробіш — не мы гэта прыдумалі), спадзявацца, што неўзабаве якая-небудзь вясёлая кампанія злепіць вам пару.

**5.** Як без пятнаццаці? Ужо без пятнаццаці? Адкаркоўвайце хутчэй шампанскае! Тэлевізар зрабіце гучней — трэба ж паслухаць, што нам там паабяцаюць. І яшчэ трэба паспець праводзіць адыходны год і загадаць жаданне на наступны... Хто там у дзвярах балабоніць? Дзед Мароз? Давайце яго сюды!

**Віншуем! Вы — чалавек,** нават калі пераапрануты Сняжынкай, Бабай Ягой ці іншым казачным персанажам. Пачастуйце Дзеда Мароза, супакойце Снягурку, уключыце гірлянду на ёлцы, зляпіце снегавіку пару, — і будзе вам шчасце. Праўда-праўда. З Новым годам!

# НАСТРОЙваемся НА СВЯТА



**Пагадзіцеся, бывае: святочная дата ўжо не тое што на парозе — літаральна на носе, а ў цябе ніякага жадання адзначыць, лапы ломіць, хвост адвальваецца, агульная млявасць і абыякавасць да жыцця. Вось і ў перадновагоднім апытанні на сайце «Звязды» нечакана для нас трэць (!) апытаных выбралі варыянт «не рыхтуюся ніяк, нешта ў мяне настрой не святочны». З гэтым трэба штосьці рабіць. Напрыклад, скарыстацца рэцэптамі ад папулярных артыстаў, у якіх мы спыталіся:**

**ЯК СТВАРЫЦЬ САБЕ СВЯТОЧНЫ НАСТРОЙ (НАВАТ КАЛІ ЯГО НЯМА)?**



**Ларыса ГРЫБАЛЁВА, спявачка, гаспадыня ўласнага святочнага агенцтва:**

— Я нядаўна прачытала, што калі прачынаешся, трэба энергічна папляскаць у далоні — як быццам пры гэтым масіруецца мноства нервовых канчаткаў, і ў цябе аўтаматычна ствараецца добры, бадзёры настрой. А яшчэ, мне здаецца, трэба як мага больш кантактаваць з пазітыўнымі, энергічнымі людзьмі, якія не маркоцяцца з любой нагоды — ну і самому пастарацца быць такім чалавекам. Бо многія смуткуюць беспадстаўна і крыху найграна: у нас не прынята казаць, што ў цябе ўсё добра, лепш паскардзіцца, каб ніхто не зайздросціў... Магчыма, варта спыніцца і падумаць — што для вас сапраўды важна, да чаго вы імкнецеся? Грошы, кар'ера, прэстыж? А можа, усё ж моцная сям'я, здароўе, усякія прыемныя дробязі, якія напаўняюць сэнсам кожны наш дзень?



**Алег ГАРБУЗ, акцёр:**

— Святочны настрой? Я гэты, як яго... «голік», і асабіста ў мяне ён узнікае пасля добра зробленай працы. Таму спадзяюся, што пасля таго, як скончацца цяперашнія здымкі, яшчэ якая-небудзь работа падваліць — няхай сабе нават у навагоднюю ноч.



**Вікторыя АЛЕШКА, спявачка:**

— Я заклікаю ўсіх уздымаць сабе настрой самастойна, насуперак усім вонкавым фактарам. Калі засмуткуеце, проста спыніцеся і скажыце сабе: а што гэта я, жыццё ж працягваецца, заўтра будзе лепш! З якім настроем увойдзеш у новы дзень — і тым больш у новы год — так у цябе і будуць ісці справы, не забывайцеся. Так што затрымлівацца ў дэпрэсіі надоўга — сабе даражэй, трэба тэрмінова з яе выходзіць. Мне, напрыклад, дапамагае самаўнушэнне: настроіцца на любімую хвалю, уключыць любімую музыку і зразумець, што людзі, якія зрабілі ці сказалі нейкую гадасць — гэта такая дробязь у маім жыцці, а светлых людзей, добрых і верных сяброў усё адно больш.



**Яўген СМАРЫГІН, тэлевядучы:**

— Запомніце, людзі: у прыроды няма дрэннага надвор'я, а ў чалавека не бывае дрэннага настрою, калі ён сам таго не хоча. Як стварыць святочны настрой? Расплюшчваеце раніцай вочы і кажаце: «Дзякуй, Божа, я прачнуўся, у мяне будзе цудоўны дзень, я шмат змагу!». А вечарам: «Дзякуй, Божа, за гэты пражыты дзень, за тое, што я паспеў зрабіць камусьці штосьці добрае і светлае». Вось праверце на сабе — гэта працуе!

**Рэцэпты збірала Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Шкодныя парады :)

# НОВЫ ГОД: КАНЦЭПЦЫІ

### САВЕЦКІ НОВЫ ГОД

Рэквізіт: хрушчоўка, чорна-белы тэлевізар, тэрма-бігудзі, пластмасавая ёлка з зоркай на верхавіне, лысаваты Дзед Мароз, вялізныя старыя шкляныя цацкі на жалезных прышчэпках.

Меню: аліўе, пюрэ, курыныя ножкі, шпроты, курыныя яйкі з паштэтам, сыры-каўбасы і іншыя разнасолы.

Паліва: Савецкае шампанскае, гарэлка, грузінскія віны.

Праграма: «Іронія лёсу», песні пад гітару, танцы пад магнітафон, сон.

Прывабнасць: танна, злосна, традыцыйна, спакойна — увогуле, нешта ў гэтым ёсць.

### СТУДЭНЦКІ НОВЫ ГОД

Рэквізіт: кватэра/хата аднакурсніка, 5 чалавек на квадратны метр, адсутнасць туалетнай паперы ў прыбіральні, прысутнасць акуркаў на лесвічнай пляцоўцы.

Меню: пры няўхільным захаванні ўсіх патрабаванняў меню студэнцкага Новага года заключаецца ў пельменях, піве ў пластыкавых бутэльках і гарэлцы.

Паліва: гл. вышэй.

Праграма: піць, піць, скакаць, піць, скакаць, піць, гуляць, піць, піць, піць, скакаць (як варыянт — сэкс), піць, тупіць, ванітаваць, спаць.

Прывабнасць: гл. вышэй.

### НОВЫ ГОД У ВЯЛІКІМ ГОРАДЗЕ

Рэквізіт: начны клуб/рэстаран, столік, цёплая кампанія, вячэрнія сукенкі, свечкі, ветлівы персанал, высакародныя яловыя галіны над галавой, прыцемак.

Меню: у залежнасці ад бюджэту мерапрыемства і прыхільнасцяў наведвальнікаў.

Паліва: гл. вышэй.

Праграма: разбітны вядучы, які выкрыквае тосты і праводзіць конкурсы, танцы, аплачаныя Дзед Мароз і Снягурка, запуск петард і іншыя карпаратыўныя радасці.

Прывабнасць: усё «пад ключ», адсутнасць бруднага посуду ў ракавіне і п'яных гасцей на дыванку ў пярэднім пакоі.

### НІГІЛІСТЫЧНЫ НОВЫ ГОД

Рэквізіт: ложак.

Меню: смажаная бульбачка на вячэру.

Паліва: рэланіум.

Праграма: праспаць з 21.00 трыццаць першага снежня да 21.00 першага студзеня.

Прывабнасць: во-о, мара, а не свята...

### ЭРАТЫЧНЫ НОВЫ ГОД

Рэквізіт: паўцёмны пакой, драпіраваны бардовымі тканінамі ў залатых лілеях і ложак з полагам (або любы іншы варыянт — двухспальны тапчан, надзіманы матрац), свечкі ўсіх колераў і памераў, пухнаты вянок з яловых галінак над уваходам, тонкі водар мандарынавага алею.

Меню: зялёныя салаты, фуа-гра, запечаныя тыгровыя крэветкі, сыр з цвіллю, узвар з віяграй (у выпадку неабходнасці).

Паліва: кактэйль з каралька з кампары, фруктовае фрапэ, марціні з кардамонам.

Праграма: сэкс з перапынкам на паесці.

Прывабнасць: усе свае і няма патрэбы ў адзенні.

### ТУПЫ НОВЫ ГОД

Рэквізіт: госці, кватэра, тэлевізар.

Меню: савецкае меню + салата з крабавых палачак і Кока-Кола.

Паліва: гарэлка.

Праграма: «Старыя песні аб галоўным-156», Ургант з Цэкалам і Сярдзючкай.

Прывабнасць: у чатыры раніцы па Рэн-ТБ звычайна пачынаюць паказваць эротыку.

### ВАР'ЯЦКІ НОВЫ ГОД

Рэквізіт: адсутнічае.

Меню: што Бог пашле.

Паліва: гл. вышэй.

Праграма: заваяванне Цянь-Шаня, гулянне па начной Празе, катанне на лыжах, вар'яцкая вечарынка — ніякіх абмежаванняў.

Прывабнасць: Вух! Як Новы год сустрэнеш...




Дачка — бацьку:
— Тата, купі мне касцюм Сняжынкі!
— І куды ты будзеш падаць — з шафы на падлогу?

☺

**Хлопчык-вычварэнец прачытаў Дзеду Марозу з табурэткі ўсяго Пастарнака.**

☺

— Вы на Новы год куды плануеце?
— Тварам у салату!

☺

**Прачынаецца мужык 1 студзеня. Ідзе на кухню, хістаецца, адкрывае кран, прагна п'е...**
**— Жонка! Уставай! Дзяцей будзі! Пакаштуйце, якая вада смачная!!!**

☺

— А перад цяжкім 1-м студзеня не грэх успомніць, што цёмнае піва лепшае за светлую будучыню!..

☺

**Сын — бацьку:**
**— Тата, а чаму ты так высока цукеркі на ёлку павесіў?**
**— А гэта каб ты, малы, іх да Новага года не з'еў.**
**— Дык што ж мне зараз, серпанцін есці?**

☺

Муж пасля гасцей на Новы год завальваецца дадому п'яны і падае. З раніцы жонка гнеўна кажа:
— Што ты ўчора піў? Я не магла адарваць цябе ад падлогі!
Муж, з жахам:
— Няўжо клей?!

☺

**— Тата, а да нас на Новы год прыйдзе сапраўдны Дзед Мароз?**
**— Э, сынок! Сапраўдны цяпер ходзіць на Рублёўку. А да нас прыйдзе кітайскі!**

☺

Увечары 31 снежня ў цырульню заходзіць мужчына і садзіцца ў крэсла, каб пагаліцца. Выходзіць цырульнік, мыліць яму твар, і кліент разумее, што майстар ужо пачаў сустракаць Новы Год.
— Вы п'яны! Я баюся, што вы мяне парэжаце!..
— А ты... ты не бойся... Ты мне толькі пакажы, дзе ў цябе падбародак...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ІНСТРУКЦЫЯ ПА АБЫХОДЖАННІ З ДЗЕДАМ МАРОЗАМ

**У сувязі з усё больш частымі выпадкамі разбойных нападаў Дзядоў Марозаў на людзей, Асацыяцыя Дзядоў Марозаў публікуе «Меры засцярогі пры зносінах з Дзедам Марозам і Снягуркай».**




**П. 1.** Калі ў Дзеда Мароза (надалей Дз.М. ) чырвоны нос, то ні ў якім разе не падпускайце да яго дзяцей і не падыходзьце да яго самі. Схавайце спіртныя напоі, не размаўляйце з ім, не глядзіце яму ў вочы. Усяляк пазбягайце выразаў тыпу «Дзед Мароз — чырвоны нос», «Барада з ваты, ты падарункі нам прынёс», — можаце атрымаць адказ. Ні пры якіх акалічнасцях не запальвайце агні ёлцы, тым больш не запальвайце са Снягуркай, бо Дз. М. вельмі раўнівыя.

**П. 2.** Нават калі нос Дз. М. не чырвоны, прадухіляйце сустрэчы двух Дз. М. у адным месцы, бо яны адразу пачынаюць высвятляць, хто з іх сапраўдны, іх насы чырванеюць, у ход ідуць ёлкі, палкі, кіі, мяшкі з падарункамі, Снягуркі.

**П. 3.** Варта адрозніваць хатніх і дзікіх Дз. М.

**П. 4.** Хатнія Дз. М. з чырвонымі насамі амаль не сустракаюцца, але засцерагацца ўсё ж трэба ( гл. п. 2 ).

**П. 5.** Дзікія Дз. М. звычайна збіраюцца ў зграі, бегаюць па вуліцах і з крыкамі штурмуюць ёлкі горада. Падарункаў яны, як правіла, не носяць. Большасць з іх з чырвонымі насамі, таму... гл. п. 1.

**П. 6.** Размнажаюцца Дз. М. пры дапамозе Снягурак. Дз. М. у сініх кажухах Снягуркам не патрабуюцца.





# КУЛІНАРНЫ ГАРАСКОП-2010

## АВЕН

**Яго дэвіз — гэта экстравагантнасць. Гарачыя стравы, якімі ён частуе сваіх гасцей, выносяцца ўрачыста на вялікіх талерках і падносах. Перад тым як паставіць іх на стол, Авен замірае ў чаканні апладысментаў або хоць бы гучнай пахвалы.**

**ШТО ЕСЦІ**

Авен, як ніхто іншы, павінен прытрымлівацца правільнага, рацыянальнага харчавання. Як ні крыўдна, але больш за ўсё ім падыходзяць разнастайныя кашы, рыба, агародніна — капуста, рэпа, радыска, буракі. На карысць пойдуць пятрушка, кроп і зялёная цыбуля. Прытрымлівайцеся строгага рэжыму харчавання і старайцеся ўстрымлівацца ад свята жывата па начах.

**ШТО ПІЦЬ**

Авен — натура, якая лёгка захапляецца, можа і не заўважыць, як вып'е лішняга. Алкаголь здольны падштурхнуць Авена на безразважныя ўчынкі. Лепш выпіць шампанскага, але не больш за два бакалы.

**КАЛІ ВЫ ЧАКАЕЦЕ Ў ГОСЦІ АВЕНА,**

то лепш прыгатаваць сакавітае мяса з вострымі прыправамі. Не забудзьцеся пра агародніну! На дэсерт падайце экстравагантныя ласункі.

## ЦЯЛЕЦ

**Яго прынцып: чым больш страў на стале, тым лепш. Ён пільна сочыць за тым, каб талеркі ў гасцей заўсёды былі поўныя. І дарэмна адмаўляцца, калі гаспадыня прапануе вам пакаштаваць яшчэ «маленькі» кавалачак.**

**ШТО ЕСЦІ**

Цялец павінен ведаць меру ў ежы, абжорства дабром не скончыцца. Трэба памятаць, што смачнае — не заўсёды карыснае. Арганізм Цяльца мае патрэбу ў разнастайнай садавіне: апельсінах, лімонах, яблыках, слівах, грушах. Цяльцу трэба ўзяць прывычку дапаўняць абед лёгкімі салатамі з морквы і капусты.

**ШТО ПІЦЬ**

Звычайна спакойныя Цяльцы ў п'яным выглядзе могуць раз'юшыцца і ператварыцца ў шалёных быкоў. Аддаюць перавагу гарэлцы. Але Цяльца можна падмануць, падсунуўшы яму келіх лікёру ці наліўкі. Пацягваць салодкія напоі Цялец любіць.

**КАЛІ ВЫ ЗАПРАСІЛІ Ў ГОСЦІ ЦЯЛЬЦА,**

то ён узрадуецца запрашэнню, а яшчэ больш ён узрадуецца традыцыйнай кухні з вялікай колькасцю сытных страў. На першую можна падаць густы суп з сакавітымі кавалачкамі мяса; пасля, зразумела, ялавічыну, тушаную экзатычным спосабам. На дэсерт здзівіце яго разнастайнасцю садавіны, ён гэта ацэніць.

## БЛІЗНЯТЫ

**Гэта эксперыментатары, якія вельмі любяць нацыянальныя стравы, таму ў іх на стале дыміцца ўзбекскі плоў, красуецца піца, прыгатаваная па італьянскім рэцэпце, або апетытнай горкай узвышаюцца венгерскія аладкі з грэцкімі арэхамі.**

**ШТО ЕСЦІ**

Блізнятам ні ў якім разе нельга выкрэсліваць са свайго рацыёну бялковыя прадукты: яйкі, сыр, арэхі, тварог. Чарнасліў, разынкі, курага добра ўздзейнічаюць на нервовую сістэму. Ну, а паласавацца Блізнятам карысна аліўкамі і арахісам. Часам можна пацешыць сябе, любімага, вострымі стравамі з рознымі спецыямі з дзіўных краін.

**ШТО ПІЦЬ**

Блізняты — самы цвярозы знак задыяка. Яны абыякавыя да спіртнога, але з кожнага правіла ёсць выключэнні. Прадстаўнікі гэтага знака такія зменлівыя, што вы не адразу заўважыце розніцу паміж Блізнятамі цвярозымі і ап'янелымі. Яны любяць розныя кактэйлі.

**КАЛІ ВАШ ГОСЦЬ — БЛІЗНЯТЫ,**

то яго цікавіць не колькасць, а разнастайнасць. Няхай будзе ўсяго пакрысе, але асарці з розных краін і кухняў. Яго не цікавіць сытная хатняя ежа, здзівіце яго экзотыкай.

## РАК

**Дзякуючы сваёй інтуіцыі, ён прыроджаны кулінар. Яго канёк — гэта печыва. Так што, прыходзячы ў госці да Рака, развітвацца да таго, як чайны стол будзе накрыты, — гэта не самая лепшая ідэя.**

**ШТО ЕСЦІ**

Рак ад прыроды раб свайго страўніка, і яму неабходна вельмі строга прытрымлівацца дыеты. Яму больш за ўсё рэкамендавана ўстрымацца ад салодкага і мучнога. Спіртное лепш ужываць толькі ў лекавых мэтах. Вось у чым сябе можна не абмяжоўваць — гэта ў кавунах, якія цудоўна ачышчаюць арганізм ад шлакаў. Можна папесціць сябе бабовымі і дарамі мора, але толькі ва ўмеранай колькасці.

**ШТО ПІЦЬ**

Лепш за ўсё было б не наліваць яму наогул, таму што пасля ўжывання спіртнога Рак можа ўпасці ў слязлівы настрой. Ап'янелыя Ракі сумуюць, часта плачуць, успамінаюць рэальныя і надуманыя крыўды, чапляюцца і г.д. Каб пазбегнуць непрыемнасцяў, пачастуйце Рака півам.

**КАЛІ ВЫ ЗАПРАСІЛІ Ў ГОСЦІ РАКА,**

то вам трэба ўлічыць, што для яго ежа — гэты цэлы цырыманіял. Лепш за ўсё частаваць Рака морапрадуктамі. Ён «з задавальненнем» не адмовіцца ад грыбных страў, лёгкіх салатаў з агародніны. Ракі не хаваюць сваю любоў да соусаў. Для дэсерту падыдуць узбітыя вяршкі з садавінай або марожанае.

## ЛЕЎ

**Калі раздаецца званок у дзверы, высвятляецца, што ўсё ж такі адну салату ён зрабіць не паспеў, а шампанскае забыўся ахаладзіць. Аднак грошай на «свецкія прыёмы» гэты гаспадар не шкадуе: у Льва на стале заўсёды стаяць вазачка з ікрой і талерачка з асятрынай.**

**ШТО ЕСЦІ**

Ільвам для нармальнага жыцця карысна харчавацца здабычай з птушкі (індычка, курыца). Але не варта захапляцца. Асаблівую ўвагу, нягледзячы на цягу да мяса, трэба надаць рознай садавіне і сухафруктам. Сярод агародніны варта аддаваць перавагу кабачкам і баклажанам у любым выглядзе.

**ШТО ПІЦЬ**

Шырокая натура Льва не ведае межаў ні ў чым, у тым ліку і ў выпіўцы. Часцяком Ільвы могуць добра набрацца толькі для таго, каб даказаць сваю «круцізну» ці быць у цэнтры ўвагі. Пастарайцеся не заводзіць Льва і не крычыце яму «пі да дна!» — сапсуеце вечар. Пачастуйце Льва добрым каньяком, ён цэніць моцныя напоі і іх якасць.

**КАЛІ ВЫ ЗАПРАСІЛІ Ў ГОСЦІ ЛЬВА,**

то вам давядзецца раскашэліцца на далікатэсы, таму што Львы любяць раскошу. Ікра, палтус, балык або дзічына ў вінным соусе. Дадайце да царскага застолля класічную музыку і ўвагу, вартую каралеўскай асобы.

## ДЗЕВА

**Яна абажае рэцэпты з кнігі «Пра смачную і здаровую ежу». Пасля салаты з агародніны і печаных баклажанаў госці лёгка змогуць устаць з-за стала, дапамогуць прыбраць посуд і нават пасля паўдзельнічаць у захапляльных конкурсах, якія наладзіла гаспадыня.**

**ШТО ЕСЦІ**

Дзевам не пашкодзіла б прытрымлівацца вегетарыянскай дыеты. Забудзьцеся на шашлык. Але калі цяжка адмовіцца ад мяса, то можна часам дазволіць сабе варанае кураня або тушаную цяляціну ў вялікае свята. Вельмі добра на страўнік Дзевы дзейнічаюць яблыкі і зяленіва ў неабмежаванай колькасці.

**ШТО ПІЦЬ**

Злоўжыванне алкаголем можа выклікаць у Дзевы хваравіты стан. Таму моцныя напоі Дзевам можна ўжываць у невялікіх дозах. А дамам можна прапанаваць чарку вермуту ці лёгкі кактэйль.

**КАЛІ ВЫ ЗАПРАСІЛІ Ў ГОСЦІ ДЗЕВУ,**

то расслабцеся. Дзева — не гурман, і стол для яе не павінен ламацца ад страў. Яна з задавальненнем паласуецца салатамі са свежай агародніны. Для асноўнай стравы падыдзе тушаная цяляціна з рысам і абавязкова шмат зяленіва. На дэсерт лепш падаць садавіну.

## ШАЛІ

**Яны вельмі засмуцяцца, калі вы праляеце на белы абрус віно ці адразу з'ясце ружачку з морквы, якой упрыгожана салата. Для Шаляў галоўнае, каб на стале панавалі парадак і гармонія.**

**ШТО ЕСЦІ**

Правіла, якое павінны ведаць Шалі як двойчы два — не набівайце страўнік усім, што трапляе пад руку. З-за схільнасці да сасудзістых захворванняў Шалям рэкамендуецца часнок, чорныя парэчкі і журавіны. Найлепшым сняданкам стануць прарошчаныя расткі злакаў. Шалям варта адмовіцца ад вострых страў. Лепш давайце ў іх разнастайныя соусы і есці вітамінныя салаты.

**ШТО ПІЦЬ**

Шалі заўсёды гатовыя падтрымаць кампанію, таму могуць незаўважна напіцца пад завязку. Запрасіўшы ў госці Шалі, запасіцеся лёгкімі напоямі. Шалі любяць усё арыгінальнае.

**КАЛІ ВЫ ЗАПРАСІЛІ Ў ГОСЦІ ШАЛІ,**

то ім наогул важная не ежа, а атмасфера і пачуццё гармоніі ў працэсе яе прыёму. Ім падабаюцца розныя салаты, далікатныя соусы. Салодкія стравы выклічуць у іх задавальненне.

## СКАРПІЁН

**Хто ходзіць у госці да Скарпіёна, той робіць мудра. Таму што гэты знак ведае толк у кулінарыі. Акрамя таго, яго стол заўсёды сервіраваны па найвышэйшым класе. Абрус падабраны па колеры да талерак, а сурвэткі складзены такім мудрагелістым чынам, што іх шкада і разварочваць.**

**ШТО ЕСЦІ**

Скарпіёнам, нягледзячы на іх любоў да хрэну, гарчыцы і іншай «вастрыні», не варта імі злоўжываць ні ў якім разе. Найлепшыя прадукты з меню Скарпіёна — рэпа, буракі, капуста, морква. Малочныя прадукты карысныя толькі ў абмежаванай колькасці. Папесціць сябе можна морапрадуктамі і рыбнымі далікатэсамі.

**ШТО ПІЦЬ**

Ап'янелы Скарпіён здольны нарабіць нямала бедаў і прынесці зло самому сабе. Даводзіць такога госця да стану ап'янення вельмі небяспечна. Лепш за ўсё пачаставаць Скарпіёна нямоцным грогам ці пуншам на аснове чаю. У чай можна дадаць ром, лікёр, віно і розныя сокі і садавіну.

**КАЛІ ВЫ ЗАПРАСІЛІ Ў ГОСЦІ СКАРПІЁНА,**

то яму падабаюцца вострыя стравы з ярка выражаным смакам. Не бойцеся слёз госця, Скарпіён вельмі любіць гарчыцу, хрэн, воцат. Ён будзе ў захапленні ад супу са смаўжоў, запечаных малюскаў. Закончыць абед можна сырам-грыль.

## СТРАЛЕЦ

**Калі ён штосьці гатуе, то ўкладвае ў працэс варкі, рэзкі і смажання літаральна ўсю сваю душу. Стральцы — гэта сапраўдныя гурманы. І калі яны збіраюць гасцей, то вечарынка па размаху нагадвае банкет на ўвесь свет.**

**ШТО ЕСЦІ**

Стральцам вельмі карысная мінеральная вада. Адна—дзве бутэлькі ў дзень — і добрае самаадчуванне гарантаванае. Стральцу, як нікому, трэба есці больш бабовых — гарох, сою, фасолю. Натуральнае мяса лепш замяніць соевым — думайце не пра смак, а пра карысць. Вось што можна есці без абмежаванняў — гэта зяленіва, асабліва кроп і сельдэрэй.

**ШТО ПІЦЬ**

Стралец з аднолькавым задавальненнем п'е калекцыйны каньяк і самагон. Пры гэтым знаходзіць у п'янстве не толькі задавальненне, але і нейкі асабліва высокі сэнс. Можна пачаставаць госця-Стральца кактэйлем, прыгатаваным на аснове каньяку ці рому.

**КАЛІ ВЫ ЗАПРАСІЛІ Ў ГОСЦІ СТРАЛЬЦА,**

то ён якраз з'яўляецца сапраўдным гурманам. Яму падабаецца любая кухня, ён абажае кулінарныя падарожжы па кухнях народаў свету. Прыгатуйце свініну пад кісла-салодкім соусам. На дэсерт падыдзе здобная выпечка.

## КАЗЯРОГ

**Дэвіз гэтай гаспадыні: якасць пераважае над колькасцю. Таму на стале ў яе заўсёды поўна рознай смакаты, раскладзенай па маленькіх талерачках. Хто з гасцей не паспеў пакаштаваць запечаных малюскаў, той, прабачце, спазніўся.**

**ШТО ЕСЦІ**

Казярогі любяць прыгажосць — прыгожы абрус, сталовыя прыборы з серабра, не кажучы ўжо пра сервіроўку стала і страў. Не трэба змешваць бялкі і тлушчы. Затое Казярогі, здаецца, адзіныя, каму не забараняецца есці ўсё, што душа пажадае.

**ШТО ПІЦЬ**

Калі іншыя знакі задыяка могуць крыху расслабіцца з дапамогай алкаголю, то Казярогу гэта не дадзена. Яго праблемы застаюцца з ім, і чым больш Казярог вып'е, тым больш востра адчувае іх. Таму надайце больш увагі смакавым якасцям напояў.

**КАЛІ ВЫ ЗАПРАСІЛІ Ў ГОСЦІ КАЗЯРОГА,**

то ў яго да ежы адно патрабаванне: ежа павінна быць смачнай. Пацешце яго баранінай па-швейцарску, густым супам з агародніны. На дэсерт падыдуць варэнікі з вішнямі.

## ВАДАЛЕЙ

**Яго стыхія — гэта дэмакратычны фуршэт. Госці прыходзяць не паесці, а пакантактаваць, пераканаўны Вадалей. Ён сам вельмі любіць дробныя апетытныя закускі ў выглядзе тарталетак або чыпсаў, якія не адцягваюць яго ад прыемнай гутаркі і цудоўна перабіваюць апетыт.**

**ШТО ЕСЦІ**

Вадалеі належаць да той катэгорыі людзей, якім варта выключыць з свайго рацыёну ўсё салодкае — тарты, булачкі, цукеркі і піражныя. Самай карыснай садавінай для Вадалея з'яўляецца гранат. Малочныя прадукты стануць добрым снеданнем, а шклянка кефіру цудоўна можа замяніць вячэру. Ніколі не адмаўляйце сабе ў лёгкіх салатах з агародніны.

**ШТО ПІЦЬ**

Прадстаўнікі гэтага знака не валодаюць моцнай нервовай сістэмай, таму злоўжыванне алкаголем можа расхістаць яе яшчэ мацней. Да моцных напояў трэба ставіцца асцярожна, нават каву трэба заварваць крыху слабейшую, чым іншым. Абмяжуйцеся лёгкімі вінамі і кактэйлямі з нізкім утрыманнем алкаголю.

**КАЛІ ВЫ ЗАПРАСІЛІ Ў ГОСЦІ ВАДАЛЕЯ,**

то яму больш даспадобы простая вечарынка, чым званая вячэра. У сваіх кулінарных схільнасцях Вадалей зусім непераборлівы. Прыгатуйце для яго апетытныя закускі, дары мора і лёгкія салаты.

## РЫБЫ

**Іх стыхія — гэта рамантычныя вячэры. Нават калі ў госці чакаюць не каханага-адзінага, а дзясяткі два сяброў, усюды расстаўлены свечкі і грае прыемная музыка.**

**ШТО ЕСЦІ**

На жаль, Рыбы часцей за іншых атрымліваюць харчовыя атручэнні. Рыбам трэба адмовіцца ад кансерваў, вострых прыпраў і смажанага, асабліва ў вялікай колькасці тлушчу. З моцных напояў перавагу лепш аддаць гарэлцы, але ў меру.

**ШТО ПІЦЬ**

Для іх спіртныя напоі — што водная стыхія. Ніводны са знакаў не прывыкае так хутка да стану ап'янення. Госцю, народжанаму пад знакам Рыбаў, можна прапанаваць кактэйль з нізкім утрыманнем алкаголю або сухое віно.

**КАЛІ ВЫ ЗАПРАСІЛІ Ў ГОСЦІ РЫБАЎ,**

то, зразумела, трэба гатаваць рыбу. Але ім падабаюцца рыбы, якія абуджаюць мары аб далёкіх экзатычных краінах. Можна прыгатаваць кітайскія або інданезійскія стравы.




**Сённяшняя страва рыхтуецца, як кажуць, на хуткую руку. Бо многія прыйдуць дадому 31-га ўвечары, пасля працы. Мне ж застаецца толькі павіншаваць усіх з надыходным святам. Дарагія нашы чытачы! Вы ўвесь год былі са «Звяздой», спадзяюся, што і ў наступным годзе, нягледзячы на ўсе крызісы, вы застаняцеся з намі! Хай наступны год будзе лепшы за адыходны, усім здароўя, кахання, поспехаў, шанцавання і добрых навінаў. Міру вам і спакою. Усміхайцеся, весяліцеся і памятайце, што трэба радавацца жыццю — бо пакуль мы ім незадаволены, яно, на жаль, праходзіць!**

## ЗАКУСКА «МАРСКАЯ РАКАВІНА»



*Адразу скажу, што ў якасці начыння можна выкарыстоўваць любую салату, на густ.*

***Нам спатрэбіцца:** 5 круглых булачак, 2 яйкі, 100 г крэветак (адварных), 50 г чырвонай ікры, маянэз, соль, раслінны алей.*

Булачкі разрэзаць удоўж, але не да канца. З ніжняй часткі выняць мякіш, нарэзаць яго кубікамі і пасмажыць на раслінным алеі да залацістага колеру. Крэветкі дробна нарэзаць. Яйкі надзерці на дробнай тарцы. Змяшаць сухарыкі, крэветкі, яйкі, ікру. Заправіць маянэзам. Калі неабходна, пасаліць. Булачкі начыніць салатай. Каб булачкі не закрываліся, паставіць зубачыстку. Для ўпрыгожвання можна выразаць авал з бялка курынага яйка, ён будзе сімвалізаваць жамчужыну.

І напрыканцы некалькі карысных парад для добрага самаадчування.

## КАБ ГАЛАВА НЕ БАЛЕЛА

Напярэдадні Новага 2010 года хочацца яшчэ раз асвяжыць у памяці некалькі народных рэцэптаў, каб навагодняя раніца не стала сапраўдным катаваннем для нашага тленнага цела.

Па-першае, арганізм трэба загадзя падрыхтаваць, гэта значыць за некалькі гадзін да новага, 2010 года «прыняць» не больш за 80 г каньяку або гарэлкі і добранька закусіць. Такая «прышчэпка» патрэбна для выпрацоўкі нейтралізатараў, якія абараняюць мозг.

Непасрэдна перад мерапрыемствам карысна выпіць кубак кавы або гарбаты з цытрынай, бо цытрына добра нейтралізуе алкаголь. Каб адтэрмінаваць ап'яненне, добра б паесці тлустай ежы або выпіць тлустага булёну. Тлушч як бы змазвае страўнік і не дае алкаголю ўсмактацца ў кроў. Галоўнае — не перабраць з тлушчамі, бо стане дрэнна. Пасля гэтага трэба выпіць некалькі таблетак актываванага вугалю, што забярэ алкаголь у сябе. Некаторыя перад ужываннем гарэлкі выпіваюць яйка, але эфект ад гэтага нашмат меншы.

Не забывайце, што алкаголь убіраецца ў арганізм ужо ў роце, таму піць яго лепш «залпам». Падчас навагодняга застолля налягайце на разнастайныя салаты і закускі. Вельмі карысныя квашаная капуста і салёныя агуркі. Для падтрымання балансу вітамінаў і цукру ў крыві добрыя свежая садавіна і сокі, а вось газіроўку лепш наогул выключыць з навагодняга меню.

Яшчэ адна ўмова для палягчэння пахмелля — паменш паліць падчас выпіўкі, лепш пабольш рухацца. А перад тым як паваліцца ў ложак, выпіце яшчэ некалькі таблетак актываванага вугалю, пару таблетак ношпы і таблетку аспірыну.

Але што ж рабіць, калі ўсё гэта вам не дапамагло, і раніцой вас мучыць галаўны боль, а ў рот нейкі гад засунуў кавалак наждачкі? Папрасіце больш устойлівага таварыша па няшчасці зварыць вам моцнага наварыстага булёну. Калі ж таварыша паблізу няма, выпіце нашча кісленькага морсу, цёплага малака або кефіру.

Калі вы ўсё ж дабраліся да кухні, прыгатуйце сабе просты кактэйль, каб прывесці ў норму электралітны баланс арганізма. Рэцэпт яго наступны: на 1 шклянку таматнага соку дадаць соль, перац і 1 яечны жаўток. Выпіць трэба залпам, не змешваючы.

Смагу добра спатоліць мінералка з лімонным сокам і мёдам. Ад пякоткі дапаможа «Алка зельтцар» або раствор пітной соды (1 ч. лыжка на шклянку вады).

Прарабіўшы ўсе гэтыя нехітрыя працэдуры, выбіраемся на марозік хоць бы на паўгадзінкі. Калі рэшткі хмелю канчаткова выветрацца з вашай шматпакутнай галавы, можна прыступаць да астатніх спраў. Хоць якія справы могуць быць у першую раніцу новага года, ці не праўда?

**ХІТ-ПАРАД**

**забойных кактэйляў, якія прыводзяць да хуткага ап'янення**

**1-е месца — гарэлка з шампанскім**

**2-е месца — ёрш**

**3-е месца (усяго толькі) — змешванне віна з гарэлкай.**

**Цікава, што змешванне трох напояў валодае меншым эфектам, чым тая ж колькасць кактэйлю з двух напояў.**

*P.S. Пры неабходнасці ўсё паўтарыць раніцай 2 студзеня!!!*

**Ці ёсць у беларусаў свае традыцыі святкавання Новага года? Мы не выкідваем праз акно старую мэблю. Мы не гатуем якой адметнай стравы. Мы ставім штучныя кітайскія ёлкі, на якія ўсё часцей навешваем замежныя цацкі і гірлянды. У нас няма свайго фільма ці песні, якія б цэлымі днямі круцілі на свята. З малымі мы развучваем, як «В лесу родилась ёлочка». У нас нават тыграў сваіх няма (які жах!), але мы жывём па ўсходнім гараскопе. Так, Новы год у Беларусі стаў папулярным толькі з сярэдзіны мінулага стагоддзя. Але калі зараз для нас гэта найпершае свята, няўжо беларусы не здольныя прыдумаць нешта сваё?**



# ЧАРАЎНІЦТВА СВАІМІ РУКАМІ

### Год зялёнай жабкі

Удзельнікі Паэтычнага тэатра «АРТ. С» (які аб'ядноўвае знакамітых людзей Беларусі, маладых творцаў і прыхільнікаў іх творчасці) распачалі 12-гадовы праект «Святкуйма беларускае!», калі ствараецца адметны, нацыянальны каляндар. Так, 2009 год ва ўсім свеце быў годам простай каровы, а ў нас... божай, або багоўкі. Яго і адзначалі асабліва: вядучыя апраналіся ў касцюмы колеру божай кароўкі, рассыпалі па зале чорныя кропачкі і частавалі ўсіх цукеркамі, ну і, безумоўна, людзі творчыя прысвяцілі ёй свае творы. На 2010 год Багоўка перадае правы Зялёнай Жабцы — чароўнай каралеўне беларускіх балот.

— Можна шмат чаго ствáрыць. На што мы багатыя, дык гэта на ідэі. Беларусы — людзі творчыя, інтэлектуалы, гэта зямля паэтаў, — заўважае ўдзельніца «АРТ.С», пісьменніца (якую, між іншым, апошнія некалькі гадоў вызначаюць сярод лепшых аўтараў, што ствараюць творы для дзяцей) Алена Масла.

Прынамсі, у яе казцы «Каляды з хроснай» выкладзена казачная канцэпцыя святкавання Новага года, але самае чароўнае мы пакінем на дэсерт, таму што перш чым брацца за цуды, хацелася б вызначыць план дзеянняў на наступны год.

### Пажывём па-беларуску?

Такім чынам, беларусы здольныя на многае, праблема толькі ў тым, што пакуль прапанова «чаму б не...» больш падобная на рытарычнае пытанне. Ідэі ёсць, і іх магло б быць болей, але ці патрэбныя яны?

— Напрыклад, чаму б не ствараць па матывах нейкіх нашых літаратурных твораў цукеркі, шакаладкі, мульцікі, фільмы? — пытаецца Алена Сцяпанаўна. — Не адчуваецца цікавасці грамадства, дзяржавы ў стварэнні нацыянальнага прадукту ва ўсіх праяўленнях, не толькі ў сэнсе тэхнікі, пакручванні прамысловых або харчовых брэндаў. Сутнасць у тым, што культура заўсёды першасная, без яе немагчыма існаванне народа, гэта дух нацыі. Чалавек моцны духам. Нават самы нямоглы, разбіты паралічом, але моцны духам, будзе жыць і натхняць на жыццё тых, хто з ім побач. А ёсць людзі здаровыя, багатыя, паспяховыя, якія жыць не хочуць, кажуць, стрыжань у чалавеку зламаўся. Тое ж самае з культурай, традыцыйнымі каштоўнасцямі. Яны наталяюць патрэбу, натхняюць чалавека, гэта рухае ўсё астатняе.

Можа таму нашы інтэлектуальныя напрацоўкі сплываюць за мяжу, бо беларусам нестае гэтай нацыянальнай культуры? Наколькі яны пачуваюцца на сваёй зямлі гаспадарамі? Грэбаваць сваім, хаваць — гэта проста недаравальна!

Наш лёс у нашых руках. На думку Алены Масла, мы зараз перажываем такі перыяд, калі павінен вызначыцца лёс беларусаў, кім мы станем: тэрыторыяй, чыім інтэлектуальным патэнцыялам усе будуць толькі карыстацца, альбо краем, дзе з цікавасцю глядзяць на сваё. Усё ж больш беларусаў выязджаюць за межы рэспублікі і бачаць, што Польшча — гэта Польшча, Германія — Германія, а розным суполкам у замежжы даводзіцца тлумачыць, што такое наша краіна. І тады ўзнікае натуральная патрэба зразумець, а хто ж мы такія.

### Людзі на балоце

— Напісаў Іван Мележ твор «Людзі на балоце» і такое адчуванне, што ён проста геніяльна замацаваў наш партрэт, — заўважае Алена Сцяпанаўна. — Мы ствараем шэдэўральныя прадукты, але яны паглынаюцца «багнай»; тое, што па-за межамі свайго, падаецца нам больш цікавым, смачным, прыгожым. Пакрысе гэта «багнай» засмоктвае не толькі нашы гістарычныя культурныя сляды, але і, падаецца, нас саміх. Бо наша спадчына, этнаграфічная, літаратурная, культурная — гэта зафіксаваны менталітэт, сістэма каштоўнасцяў, якая выпрацоўвалася цягам стагоддзяў, — заўважае пісьменніца. — Беларусы — талерантны народ, добразычлівы, гасцінны, памяркоўны. Столькі цудоўных якасцяў. Але гэта не на пустым месцы ўзнікла, гэта вынік духоўнай працы многіх пакаленняў. Мне пашчасціла яшчэ заспець тое пакаленне беларусаў, маіх дзядуляў і бабуль. Наколькі яны былі далікатныя ў чалавечых праявах, гэта быў не спіты народ, незмацюканы, калі яны і сварыліся, замест мацерных слоў ўжывалі розныя пажаданні кшталту «Каб цябе качкі стапталі». Гэта былі людзі з высокай культурай. Незразумела, што мы за народ, калі хто заўгодна можа ўплываць на нашу свядомасць, мы гатовыя пераймаць якія заўгодна культуры і традыцыі, але чамусьці не карыстаемся сваім. Я думаю, наперадзе яшчэ той час, калі нам стане сорамна за тое, чым мы духоўна «кармілі» сваіх дзяцей.

### Не горш за Пэпі — Доўгую панчоху

І што самае крыўднае, у нас ёсць свае выдатныя творы для дзяцей.

— У Швецыі створаны інстытут, які прапагандуе і рэкламуе шведскі лад жыцця, розныя яго праявы, у тым ліку і дзіцячую літаратуру. Карлсан і Пэпі — Доўгая панчоха — брэнды Швецыі, гэтыя творы перакладзены на розныя мовы. Цікава, калі б Пэпі — Доўгая панчоха была створана ў нас, ці стала б яна шэдэўрам, які ведае ўвесь свет? Бо там з гэтай кніжкай шмат працавалі піяршчыкі, выпускалі каляровую прадукцыю, майкі, кепкі. А ці здольныя мы хоць бы на сваім, нацыянальным узроўні раскруціць такія вобразы? У нас ёсць героі не горшыя за Пэпі. Ёсць цудоўныя кніжкі, якія выйшлі за апошні час. Сярод іх можна згадаць «Прыгоды Мішкі Пік-пік» Людмілы Рублеўскай, «Каляровую затоку» Пятра Васючэнкі, «Прыгоды маленькай машынкі» Наталлі Бучынскай», «Казкі астранаўта» Раісы Баравіковай і шмат чаго. Думаю, калі б з нашымі кнігамі пачаць працаваць, то ў шмат якіх з нашых герояў быў бы поспех. А ў нас нават мульцікі не здымаюцца, няма сучасных перадач пра беларускіх пісьменнікаў. Вы запытайцеся сёння, у тых, хто сцвярджае, што нічога ў нашай літаратуры няма: «што з таго, што за апошні час вы чыталі, вас уразіла?». Адказу не будзе. У літаратуры арыентуюцца адзінкі, таму што мы жывём у імклівым часе, спяшаемся, падумаць няма калі, чытаць тым больш.

У 90-я гады, калі намаганні былі скіраваны на вывучэнне роднай мовы, беларускія кнігі выходзілі накладам у 70 тысяч асобнікаў і аснoўны тыраж сыходзіў за два тыдні. Цяпер самыя вялікія тыражы, пра якія можна марыць, — 2-3 тысячы, а гэта значыць кнігі патрапяць далёка не ва ўсе крамы і бібліятэкі. Таму многія людзі, якія і хочуць выхоўваць дзетак пабеларуску, нават і не ведаюць, што такая літаратура ёсць. Калі ж беларускія кніжкі трапляюць у неабыякавыя рукі, яны захопліваюць людзей. Так, у класах, дзе працуюць зацікаўленыя настаўнікі, дзеці як пластылін, з іх ляпі што заўгодна, яны разумеюць і любяць сваю мову, сваю краіну.

— Мне давялося падарожнічаць па Галандыі, найбольш уразіла, што шараговы галандзец ведае мінімум 4 мовы, а хто з вышэйшай адукацыяй — 6, і пры гэтым свая мова ў іх на належным узроўні, сваё шануецца і паважаецца. Мне хацелася б звярнуцца да чытачоў, якія абіраюць газету на роднай мове, падзякаваць ім за тое, што яны ёсць і пажадаць у новым годзе светлага аптымізму. Ёсць цэлая супольнасць людзей, якія апякуюцца над тым жа, што і яны, — рупліўцы роднага слова, родных традыцый. Роднае слова — гэта носьбіт духоўных каштоўнасцяў, таму яно вельмі важнае. А тым, хто ў новым годзе гэта толькі зразумее, — проста сілаў і натхнення быць беларусамі. Я думаю, што гэта вельмі трывожны факт, што ЮНЕСКА абвясціла беларускую мову ў шэрагу моў пад пагрозай знікнення. Калі вясёлка ззяе на небе, яна прыгожая ў сваёй шматколернасці. Няхай гэтая шматколернасць захоўваецца. У нашых сілах гэта зрабіць не толькі дзеля прыгажосці, але і дзеля памяці пра тых папярэднікаў, якія ішлі да нас па зямлі, сярод агульнага няхай кожны згадае сваіх дзядулю,бабулю, маці, бацьку.

### Чароўны дэсерт

Цікава, а ці здольныя беларусы зрабіць маленькі цуд? Для саміх сябе? Калі вам неабыякавая беларуская літаратура, калі вы хочаце, каб яна развівалася, — чытайце пабеларуску, набывайце нашы цудоўныя добрыя кніжкі сабе і сваім сябрам. Захапіце з сабой, калі выправіцеся кагосьці віншаваць з калядкамі.

Так з планам дзеянняў на год разабраліся. Але што рабіць, калі на носе святы? Пэўныя падказачкі — зборнікі з вершамі, сцэнарамі, песнямі выдадзеныя ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». Толькі выйшла з друку кніжка «Новы год», дзе ёсць як пераклады знакамітых навагодніх песенек, так і новыя беларускія тэксты (такія ж беларускія дапаможнікі створаны і да святаў 23 лютага і 8 Сакавіка). Сваімі прапановамі па сустрэчы зімовых святаў падзялілася і Алена Масла.

— Новы год — гэта свята, якое вымагае цудаў, калісьці іх дарылі нам нашы бацькі, пасля мы рабілі для сваіх дзяцей. Я сама з Міёршчыны, і мае дзеці на гэтае свята не дазвалялі сядзець у горадзе, мы заўсёды ехалі ў Мілашова, таму што там ходзіць сапраўдны Дзед Мароз. Мы сядзелі за святочным сталом, пасля хадзілі коўзацца на возера. Дзед Мароз нам запальваў чароўную ялінку ў двары, а падарункі падкідваў пад вугал хаты, грукаў у вокны і наогул ён быў вялікі прыдумляльшчык. Мае дзеці падраслі, але таямнічасць, казка захавалася і яны здольныя ствáрыць яе для кагосьці малодшага. Калі я была студэнткай, распачала яшчэ адну традыцыю: пераапранацца ў Дзядулю Мароза і хадзіць у хаты, дзе ёсць дзеці, а таксама ў нас была традыцыя віншаваць аднавяскоўцаў, бо ў вёсках шмат адзінокіх людзей.

Казачніца ўпэўненая, што цуд — гэта тое, што мы робім сваімі рукамі. Прычым стварáць яго можна не толькі для сваіх блізкіх, але і проста для ўсіх, хто апынаецца побач. А вось вам і некаторыя рэцэпты цудаў, узятыя з яе кнігі «Каляды з Хроснай». Дарэчы, гэту казку можна прачытаць на сайце «Нашы дзеткі».

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

### ЧАРОЎНАЯ СУМЕСЬ ДЛЯ САЛОДКІХ СНЯЖЫНАК

***Вам спатрэбіцца:*** *паўшклянкі цукровай пудры, яечны бялок, некалькі крышталікаў лімоннай кіслаты альбо кропелька эсэнцыі воцату, а таксама каструля, драўляная лыжка, шпрыц для кандытарскіх вырабаў альбо мяшэчак. І, вядома ж, цярпенне і добры настрой.*

**Прыгатаванне:** У сухую каструлю разбіць бялок і энергічна мяшаць (але не ўзбіваць), патрошкі чайнай лыжачкай дасыпаць цукровую пудру. Потым дадаць крышталікі лімоннай кіслаты (альбо воцат) і перамешваць яшчэ дзве хвіліны. Гатовая сумесь павінна быць кіпенна-белай, эластычнай і не вельмі густой. Шпрыц або мяшэчак для кандытарскіх вырабаў напоўніць чароўнай сумессю і, пакрысе выціскаючы яе, «маляваць» сняжынкі на блясе, злёгку змазанай алеем. Лініі рабіць дастаткова тоўстымі, часцей перакрыжоўваючы іх — для трываласці. Дайце сняжынкам падсохнуць, а пасля ўпрыгожвайце імі ёлку і частуйце сяброў.

### ЯК ЗРАБІЦЬ ШТУЧНЫЯ ЗОРНЫЯ КАМЕНЬЧЫКІ

*Калі вам у садок не трапіла ніводна зорачка, якая кацілася з неба, і ў вас няма незвычайных каменьчыкаў, зрабіце іх самі!*

Для гэтага развядзіце ў вадзе фарбы — акварэльныя або гуашавыя. Каляровую вадзіцу разліце па формачках для лёду або ў формачкі з-пад цукерак у каробках. Зрабіце пяцелькі з нітак — як для ёлачных упрыгажэнняў — і адным канцом апусціце ў кожную ячэйку з каляровай вадой. Формачкі выстаўце на мароз на двор, або змясціце ў лядоўню. Праз некалькі гадзін у вас будзе шмат рознакаляровых ледзяшкоў. Развесьце іх у двары на дрэвах ці кустах. А тыя, што без нітачак, рассыпце проста на снег. Гэта вельмі прыгожа! Нібы зорачкі падалі — і ў галінках дрэва заблыталіся, прасыпаліся долу...

### СТАЛОЎКА ДЛЯ ПТУШАК

Простае, але вельмі важнае заданне для ўсіх, хто хоча стаць добрым чараўніком.

Паелі самі — падумайце пра тых, каму зімой цяжка здабыць сабе корм. Пасыпце птушкам крошак, зернетка, для сінічак павесце кавалачак сала. А з чаго зрабіць просценькія кармушкі — мы ўжо расказалі. У дадатак да гэтага вось вам малюнак «птушынай сталоўкі».





Фота Марыі БЕГУНКОВАЙ.

Бяседныя песні

# НАВАГОДНЯЯ СВЕЧКА

Уся планета ў навагоднюю ноч расквечваецца рознакаляровым агнём, які, успыхнуўшы на Камчатцы, Курылах, несупынный хваляй коціцца на захад, да Аляскі. А следам за іскрыста-зіхатлівым вогнівам плыве-віруе духоўная плынь — жыватворная, настоеная на любові...

У гэтую ноч, як ніколі, прагнем шчасця, шукаем яго. І чамусьці здаецца, што ў тыя пачуццёва напружаныя імгненні, калі гадзіннікавыя стрэлкі сваім зліццём-яднаннем пазначаць магутнасць духоўна-цэласнага адзінства, для нас адчыніцца казачная брамка ў чароўнае царства Шчасця. А шчасце зусім побач! Яно — у адчуванні даверу, паразумення, гармоніі. А гэта заўсёды з намі, у нас саміх. Толькі трэба ўсхвалюхнуць душу, напоўніць яе любоўю і гэтым прамяніста-светлым пачуццём ахінуць блізкіх...

Так і ў рамантычна асветленай песні «Навагодняя свечка», напісанай Леанідам Дранько-Майсюком і Мікалаем Сацурам пятнаццаць гадоў таму для ансамбля «Сябры».

### Навагодняя свечка

**Верш Леаніда Дранько-Майсюка**
**Музыка Мікалая Сацуры**

*Дамы стомлены,*
*спяць кавалеры,*
*Высыхаюць азёры віна.*
*А на нашым стале*
*два фужэры,*
*Два фужэры і свечка адна.*
Прыпеў:
*Запалі навагоднюю свечку*
*І шампанскім крышталь абудзі,*
*І, нібы на маленькую вечнасць,*
*На блакітную свечку глядзі.*

*Што нам дамы*
*і што кавалеры!*
*Залатая прайшла дауніна...*
*Ёсць у нашай*
*маленькай кватэры,*
*Ёсць усё — ад агню да віна.*
Прыпеў.
*Ах вы, дамы, і вы, кавалеры!*
*Ах, паззіі вашай струна —*
*Засталіся ад вас*
*два фужэры,*
*Два фужэры і свечка адна.*
Прыпеў.

Падрыхтаваў
**Міхась ШАВЫРКІН.**

## У год Тыгра — слова тыграм



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Каб зрабіць гэты здымак, звяздоўцам давялося правесці ля Алісінай клеткі ў 20-градусны мароз больш за гадзіну.
Вуснамі тыгрыцы: «Не трэба наіўна спадзявацца, даражэнькія, што ўсе дзверы перад вамі будуць расчыняцца імгненна. Запасайцеся ў наступным годзе цягавітасцю і цёплым адзеннем».

# РРР-МЯЎ... ці Парады ў палоску

**Хто лепш зразумее тыгра, чым яму падобныя, — разважалі мы, народжаныя па Усходнім календары ў год паласатага драпежніка, па дарозе ў Мінскі заапарк. Ды дзе там! Тыгрыца Аліса чамусьці не прыняла нас за сваіх. Больш за тое, калі няпрошаныя госці з фотаапаратам зайшлі ў яе дамок, гаспадыня пачала глуха і хрыпла рыкаць. Вольга Гурыновіч, якая даглядае драпежнікаў ажно 12 гадоў, патлумачыла, што тыгрыца такім чынам папярэджвае, што мы знаходзімся на яе тэрыторыі. А гэта — святое.**

— Разумная, ганарлівая, з характарам, — апісвае паласатую прыгажуню **заатэхнік першай катэгорыі Эла РАБАВА**.

— І як яна праяўляе свой характар?

— Самі ж бачыце, рыкае, калі нешта не падабаецца. Многія наведвальнікі лічаць, што раз яны заплацілі грошы, то ім усё дазволена. Напісана «жывёла кусаецца», «за лінію не заходзіць», а яны ўсё адно лезуць. Трывае Аліса, трывае, а пасля, як здадуць нервы, выцягнецца ў рост чалавека і пачынае рыкаць. Відовішча, паверце, не для слабанервовых.

***Вуснамі тыгрыцы: «Людзі, будзьце чалавечнымі, часцей стаўце сябе на месца іншых».***

* * *

Усе жывёлы, народжаныя ў няволі, больш за ўсё на свеце баяцца адкрытай прасторы. Амурская тыгрыца, якая ў васьмімесячным узросце трапіла ў Мінскі заапарк з перасоўнага расійскага цырка «Кубань», таксама не выключэнне. Аднойчы, выйшаўшы з клеткі, яна перажыла самы вялікі стрэс у сваім жыцці. Вярнуцца назад, вядома ж, не здагадалася. Замест гэтага, перапужаная, больш за суткі хавалася ў зарасніках хмызнякоў на тэрыторыі заапарка. Яшчэ больш страху нагналі супрацоўнікі міліцыі, выратавальнікі і работнікі заапарка, якія ў паніцы наладзілі аблаву на бедную тыгрыцу.

— Было такое адчуванне, што адну котку лавіў увесь горад, — кажа **намеснік дырэктара Мінскага заапарка Наталля ЛЕБЕДЗЕВА.** — Ведаеце, Аліса, чаго не скажаш пра людзей, у гэтай няпростай сітуацыі паводзіла сябе стала для свайго ўзросту. Дзякуй Богу, усё скончылася паспяхова.

***Вуснамі тыгрыцы: «Не панікуйце і ў любой нестандартнай сітуацыі захоўвайце спакой».***

* * *

Завіталі карэспандэнты «Звязды» і на тыгрыную кухню. Нам пашанцавала: якраз у гэты час работніцы рыхтавалі Алісе абед. Здзівіла, што яны абразалі з костачак увесь лой, пакідаючы толькі мяса.

— Гэта робіцца для таго, каб наша котка не пакутавала ад атлусцення, — тлумачыць Эла Рабава. — Гэта на волі тыгры могуць пераварваць любую страву і заставацца ў зайздроснай форме. У заапарку ж драпежнікі страчваюць у разы менш энергіі.

— Ці часта хварэе Аліса?

— Я не сказала б. Ведаеце, калі жывёлу корміш добра і правільна, то яна хварэе менш. За дзень Аліса з'ядае 7-8 кілаграмаў мяса, якое нарыхтоўваюць работніцы. У вызначаныя дні ласуем малачком, даём яйка па рацыёне. Але больш за ўсё наша дзяўчынка радуецца жывым трусам і марскім свінкам. Адным словам, прыроджаны інстынкт паляўнічага даецца ў знакі.

***Вуснамі тыгрыцы: Не пераядайце і памятайце, што здаровая ежа, здаровае цела і здаровы дух — панацэя ўзаемазвязаныя.***

* * *

Зараз Алісе 8 гадоў. Самы час падумаць пра дзяцей. Але пакуль пра кавалера даводзіцца толькі марыць...

— Мы з ахвотай разводзілі б тыграў, — кажа Наталля Лебедзева. — Гэта было б вельмі высакародна, бо амурскі тыгр занесены ў Чырвоную кнігу. Але, на жаль, адсутнасць самца не дазваляе гэтага рабіць.

— Дык у чым праблема? Набудзьце.

— Усё не так проста, як здаецца. Мы не першы год стаім на чарзе на набыццё самца, але пакуль глуха. Іх вельмі мала ў свеце. Акрамя таго, пакуль мы не пабудуем новы вялікі вальер, пра самца можна забыцца, бо тыгры — ярыя індывідуалісты, разам яны жыць не змогуць. Нават у прыродзе самец і самка сустракаюцца толькі ў момант размнажэння. У найбліжэйшы час мы плануем расшырыць вальер Алісы, а пасля будзем думаць і пра другі.

Новае жыллё з месяца на месяц з'явіцца і ў **Мераса**, якога 14 гадоў таму прывезлі ў Гродна з Каўнаскага заапарка.

— Па тэлебачанні чула, што ў вашага тыгра хутка з'явіцца сяброўка? — запыталася я ў **дырэктара Гродзенскага заапарка Цэліны ПАГЯРЫЛЫ**.

— Не, пакуль мы пра гэта не думаем. Цяпер у нас ідзе рэканструкцыя заапарка. У прыватнасці, у тыгра ў студзені —лютым з'явіцца новы вальер. Ён будзе недзе разоў у дзесяць большы за цяперашні. Што ж датычыцца тыгрыцы, то са з'яўленнем новага вальера мы не выключаем такой магчымасці.

***Вуснамі тыгрыцы: стаўце перад сабой пераважна рэальныя мэты, але і не забывайцеся, што мары падаткамі не абкладаюцца. Будуйце новае жыллё, пашырайце старое. Тым жа, хто вырашыў папоўніць колькасць тыграў у Беларусі (дзяцей, якія народзяцца ў 2010 годзе) — сцяг у рукі. Мы вам будзем толькі ўдзячныя.***

*— Як вы думаеце, у 2010 годзе Аліса прынясе вам поспех? — пацікавілася ў работнікаў заапарка на развітанне.*

— Несумненна. У нас што ні год, то поспех. Вунь паглядзіце, якія сёлета быкі сядзяць (*усміхаецца*). Усё ў нас было цудоўна. І будзе. Галоўнае — настроіцца на тыгрыную хвалю.

**Надзея ДРЫЛА.**

### ЦІКАВА ВЕДАЦЬ

**1. На шкуры тыгра больш чым сто палос, і няма двух тыграў з аднолькавымі палосамі.**

**2. Калі тыгра пагаліць, то палосы на шкуры ўсё адно застануцца.**

**3. Тыгры здольныя сваім нізкачастотным рыканнем уводзіць ахвяру ў стан трансу.**

**4. Клыкі ў тыгра могуць вырасці да 7 сантыметраў і без праблем перакусваюць хрыбет любой жывёлы на зямлі.**

**5. У тыграў вельмі моцныя звязкі і сухажыллі лапаў. Былі выпадкі, калі тыгр заставаўся стаяць нават пасля таго, як быў застрэлены.**

**6. Сліна ў тыграў антысептычная. Вельмі зручна, калі даводзіцца залізваць раны.**

**7. Амурскі тыгр адлюстраваны на сцягу і гербе, а таксама на многіх геральдычных сімвалах гарадоў і раёнаў Прыморскага края.**

**8. У Кітаі забойцу амурскага тыгра чакае смяротнае пакаранне, бо там разам з драконам і вялікай пандай ён з'яўляецца неафіцыйным сімвалам краіны.**

**9. Усе вядомыя белыя тыгры — бенгальскія. Страта колеру выклікана рэцэсіўным генам.**

**10. Амурскі тыгр занесены ў Чырвоную кнігу.**

Грынпіс

# ПРА ТЫГРА З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

**Сімвал 2010 года не адгукаецца на «кыс-кыс», мае штотыдзень разгрузачны дзень і з'яўляецца ўзорам спакою.**

У Магілёўскім заасадзе — святочная мітусня. Дзеці і іх бацькі адразу спяшаюцца да вальера, упрыгожанага навагоднімі гірляндамі, цацкамі і віншаваннямі. Яго гаспадар, усурыйскі тыгр Арцём, як жывёльны сімвал наступнага года карыстаецца вялікай увагай.

Праўда, пераважнай большасці магілёўцаў за некалькі гадоў удалося пабачыць толькі тыгрыную лытку. Сапраўдныя шчаслівчыкі (а іх мала) назіралі нават кавалак вусатай пысы і хвост! Таму што **Арцём — начны драпежнік, і ўдзень, у час напльву наведвальнікаў, тыгр спакойна спіць**. Прычым спіць так, што ні гучныя крыкі, ні нават грукі па жалезе, ды ўвогуле любыя гукавыя правакацыі не падымуць яго.

Вось і цяпер: у невялікай драўлянай хатцы на сене мерна дыхае нешта прыгожа-паласатае. Пакуль небяспечная жывёліна салодка спіць, разам з заатэхнікам Святланай Кісялёвай мы ўзгадваем гісторыю Арцёма.

— Нашаму тыгру 11 гадоў, а прыехаў ён у Магілёў з Маскоўскага цырка, — расказвае Святлана. — Мы яго бачым шторанічы, калі прыходзім на працу. Арцём тады гуляе і ляжыць на бярвёнах, такі прыгожы, важны, галаву падыме. Удзень яго можна назіраць толькі ў час абеду, калі ён пакідае сваю хатку і пераходзіць у сталоўку.

Святочнымі цукеркамі на прутах, нават калі б яны не былі цацачнымі, Арцём зусім не цікавіцца: **тыгры не любяць салодкага**. Як і, прабачце, сасісак, якія, мы спадзяваліся, зацікавяць тыгра. Такія прысмакі можна аддаць суседзям Арцёма: цукеркі — мядзведзю Федзьку, а астатняе знішчыць неспакойная воўчая пара Гель і Ліза.

— Наш тыгр з'ядае штодня 8 кілаграмаў ялавічыны, свежай і без прыпраў, — тлумачыць заатэхнік. — У панядзелак у яго разгрузачны дзень: мы даём Арцёму толькі 3 літры малака, куды разбіваем адно курынае яйка. Не, такая дыета зусім не злуе жывёліну. Мне падаецца, што яму нават падабаецца. І правільна, таму што ў дзікай прыродзе тыграм не штодня ўдаецца есці мяса.

Хоць Арцём і не гуляе на волі ў тайзе, у заасадзе кажуць, што раней ён жыў у пекле, а цяпер — у раі.

— Таму што ў Маскоўскім заапарку маладога тыгра трымалі ў клетцы крыху болей за памер самой жывёліны, — заявіў дырэктар Буйніцкага аграрлесатэхнічнага каледжа Георгій Маліноўскі. — Я, шчыра кажучы, забараніў бы ўсе гэтыя шоу і звярынцы, дзе здзекуюцца з прыгожых жывёл.

Менавіта Георгій Маліноўскі і назваў новага жыхара заасаду Арцёмам. Стваральнік заасаду, дзе праходзяць практыку ўсе навучэнцы каледжа, ён завёў традыцыю праз імёны ачалавечваць жывёл. Імя Арцём у Георгія Мікалаевіча асацыюецца са знаёмымі з савецкага дзяцінства героямі рэвалюцыі, мужнасцю, смеласцю і сілай.

— Ой, ён нібыта вялікі коцік, — замілавана кажа заатэхнік Святлана. — **Вочы ў яго добрыя.** Але калі махнуў бы сваёй магутнай лапай, наўрад ці што засталося б цэлае і жывое. **Кіпцюры нібыта брытвы.** Так што ў клетку з тыграм я ніколі не хаджу, а толькі ў спецыяльным памяшканні пад незадаволенае рыканне я аглядаю яго зубы, вочы, хвост, лапы, шэрсць. Арцём абсалютна здаровы!

**Сяброўка Арцёма — шэрая котка Машка,** якая даўно жыве ў заасадзе і, падобна на тое, адчувае сябе як мінімум вартаўніцай. Яна спакойна наведваецца ў клетку з тыграм, робіць інспекцыю, частуецца рэштай яго ежы і нават адпачывае. Але Арцём ніколі не ганяе Машку: усё ж такі з адной кашэчай сям'і.

Пакуль мы размаўлялі пра тыгрыныя звычкі, а фотакарэспандэнт імкнулася адлюстраваць хоць бы соннага тыгра, Арцём нечакана расплюшчыў вока. Можа, яго пабудзілі фотаўспышкі? Ці ён адчуў, як ім шчыра захапляюцца? Так ці інакш, але тыгр выглянуў з хаткі, склаў лапы, прыняў велічную позу і падарыў чытачам «Звязды» выдатную фотасесію!

**Тыгр — неверагодна прыгожы. Носік ружовы з чорным кантам, а вочы жоўтыя, мядовага колеру.** Глядзіць на нас, пазяхае.

— Цікава, з якога пункту гледжання ён нас разглядае: з сяброўскага альбо ўсё ж з мяснога?

Ён ніколі не адгукаецца на «кыс-кыс», не мурлыкае, а толькі зрэдку фырчыць. **Калі задаволены і сыты — ходзіць расслабленай паходкай па вальеры.** Паводле традыцыі Магілёўскага заасаду, у святы жывёла, якая з'яўляецца сімвалам новага года, атрымлівае падвоены рацыён.

**Якім будзе наступны год, калі браць пад увагу характар магілёўскага тыгра Арцёма?** Падаецца, што спакойны, без рэзкіх зрухаў і вялікіх канфліктаў. Гэта жывёла ведае сабе кошт і не мітусіцца з-за дробязяў. Людзям можна навучыцца ў тыгра горда трымаць галаву і без страху глядзець на няпросты свет. Тым, хто хоча дабіцца большага і заняць больш важнае месца ў жыцці, верагодна, будзе спрыяць удача ў год Тыгра. Галоўнае — забяспечыць нармальнае харчаванне і сытае жыццё. З Новым годам!

**Ілона ІВАНОВА.**

Фота Ірыны САВОСІНАЙ.



Арцём жадае беларусам спакойнага новага года.

# АРАНЖАВЫ НАСТРОЙ - 2010

**Тыгр Мароз і Тыгурка з Магілёўскага раёна ўразілі публіку яркімі касцюмамі і энергічнай навагодняй праграмай.**

**Святлана Церашкова,** прывабная брунетка з модным стрыжкай, апранае парык з ярка-жоўтымі локанамі і аранжавую шапку з сімпатычнымі тыгрынымі вушкамі і канчаткова **пераўтвараецца ў Тыгурку**, актуальны навагодні персанаж.

Белая барада — гэта бадай што адзіная традыцыйная рыса гаспадара Новага 2010 года: **Канстанцін Касцюкоў** у плюшавым касцюме з палоскамі і белай грудкай **называе сябе Тыграм Марозам**.

— Якое адрозненне ад звычайнага Дзеда Мароза? — перапытвае Канстанцін. — У зарадзе бадзёрасці, які нясе ў сабе яркі аранжавы колер.

— Снягурачка — унучка Дзеда Мароза, а Тыгурка — унучка Тыгра, таму яна больш жвавая, энергічная, — тлумачыць Святлана.

У вольны ад выканання святочных абавязкаў час гэта жанчына вучыць дзяцей спяваць: у Буйніцкай школе Святлана кіруе вакальным ансамблем «Апельсін» — без аранжавага, заўважце, зноў не абышлося! Канстанцін займаецца турызмам у раённым фізкультурна-спартыўным клубе. Ідэю зрабіць тыгрыную пару нарадзілі і паспяхова ажыццявілі ў Магілёўскім раённым цэнтры пазашкольнай працы.

Напярэдадні Новага года Тыгр Мароз і Тыгурка перамаглі ў рэспубліканскім конкурсе «Ёлка-фэст-2009», а па вяртанні дадому са сталіцы актыўна бяруць удзел у навагодніх святах. Сёння — на ёлцы ў сельскай школе, заўтра — у сацыяльным прытулку. Прымаюць на ўра! Асабліва што датычыцца агульнага святочнага рыку ў гонар сімвала нового года.

Аднак экзатычныя Тыгр Мароз і Тыгурка ў рэальным жыцці маюць вельмі **традыцыйныя планы на навагоднюю ноч**:

— Для мяне пах Новага года — **гэта express кактэйль з яліны, мандарынаў і шампанскага,** — прызнаецца Канстанцін.

Яму найбольш запомнілася сустрэча 2008 года: напярэдадні малады чалавек ажаніўся і сустракаў свята ўдваіх з маладой каханай жонкай. Гаворыць, што сумна ім не было, але сёлета да іх далучацца цешча і іншыя сваякі — будзе яшчэ весялей.

Да навагодняга набору яшчэ трэба дадаць **бенгальскія агні**, здабытак беларускага святочнага стала апошняга дзесяцігоддзя — **ананас**, а вось савецкую навагоднюю спадчыну ў выглядзе салаты **«аліўе»** магілёўцы замяняюць на пекінскую капусту. Можа, есці ўначы не вельмі карысна для арганізма, але год Тыгра, пагадзіліся Святлана і Канстанцін, трэба абавязкова сустракаць з мясам. Мужчына аддае перавагу свіным адбіўным, а калега лічыць, што **бульба з катлетамі** — абавязковая святочная страва беларусаў.

Святлана мяркуе сесці за святочны стол разам са сваімі дзецьмі: старэйшы сын Багдан хутка збяжыць да сяброў, а маці разам з 8-гадовай Машай **будуць глядзець навагоднія тэлевізійныя праграмы і, калі не будзе лужынаў і дажджу, выйдуць да яліны ў двор**.


Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

Падарункі да Новага года, шчыра прызнаюцца суразмоўцы, не будуць грандыёзнымі. Закрыццё года і перадсвяточная мітусня не пакідаюць шмат часу на шопінг. Таму пад ёлку Святлана пакладзе салодкія прысмакі і іншыя прыемныя дробязі, а Канстанцін дасць жонцы права выбраць жаданую сумачку. Сам малады чалавек, па сакрэце, разлічвае на новую флэшку (і тут перадае жонцы прывітанне!), таму што ўсе старыя скраў і прыхаваў недзе за плінтусам любімы кот Мішэль.

Тыгр Мароз і Тыгурка **без вялікіх шкадаванняў развітваюцца з 2009 годам і яго крызіснымі трывогамі**.

— Я чакаю, што новы год будзе па-сапраўднаму добрым, — гаворыць Святлана. — **Хочацца добрага заробку і нармальнага надвор'я**.

— Вельмі хочацца сапраўднай снежнай і марознай зімы, — дадаў Канстанцін. — Але самае галоўнае — здароўе. **Свіному грыпу недарэчы гаспадарыць у год Тыгра**. Жадаю, каб не было расчараванняў і непрыемнасцяў, а кожнаму з людзей было добра па-свойму.

Калі казаць зусім шчыра, то Новы год перад тэлевізарам — зусім не мяжа мараў Тыгра Мароза і Тыгуркі. Святлана хоча сустрэць калі-небудзь Новы год на цёплым марскім узбярэжжы і ўразіць тамтэйшую публіку звонкай песняй пра салодкую ягаду. Канстанцін, наадварот, аддаў бы перавагу снежнай і марознай Скандынавіі.

Можа, хто падумае, што гэта наўрад ці спраўдзіцца? Але ўсё залежыць ад настойлівасці і настрою.

— Спакойна і ўпэўнена ісці да сваёй мэты — вось такі ў маім разуменні тыгрыны характар, — заўважыў Канстанцін. — Таму трэба весялей глядзець у будучыню!

— Усе праблемы як прыйдуць, так і пойдуць, — вучыць Святлана. — Трэба імкнуцца думаць пра добрае — тады будзе спакайней на душы. Дрэнныя думкі і скаргі — гэта туга і дэпрэсія. Калі думаеш пра добрае, то на працы і ў сям'і добра, і людзі навокал добрыя.

**— Мы жадаем усім яркага аранжавага настрою!**

— І няхай захоўвае Бог і лёс нашу краіну Беларусь ад бедаў і нягодаў!

**Ілона ІВАНОВА.**

## «Крышталь» трымае высокую планку

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Мінск Крышталь» — самае буйное ў Беларусі прадпрыемства па вытворчасці алкагольнай прадукцыі. У 2009 годзе адзін з лідараў у сваёй галіне зрабіў чарговы захад у сваім развіцці — пачаў разліў шатландскага віскі. Пакуль нельга сказаць, ці хутка заваюе гэтая прадукцыя сваю адпаведную нішу на айчынным рынку, аднак сам факт такога смелага кроку па-добраму ўражвае: быў бы тавар, а пакупнік знойдзецца.

Сёння РУП «Мінск Крышталь» — гэта магутнае сучаснае, тэхнічна забяспечанае прадпрыемства, на якім перадавыя тэхналогіі гарманічна спалучаюцца з непахіснымі традыцыямі вытворчасці алкагольных напояў, натуральная сыравіна і арыгінальная рэцэптура служаць выдатнаму смаку і высокай якасці прадукцыі, якая выраблена. На сёння на прадпрыемстве працуюць звыш 1,5 тысячы энергічных і адказных спецыялістаў, сапраўдных прафесіяналаў сваёй справы, якія прывыклі ўкладваць у сваю работу часцінку душы, разумеючы, што толькі прадукт, выраблены ад чыстага сэрца, будзе мець поспех у спажыўцоў. На прадпрыемстве выпуск алкагольных вырабаў складае больш як 100 найменняў, сярод якіх — шырокі спектр гарэлкі, лікёра-гарэлачных вырабаў, каньякоў, брэндзі, вінаў вінаградных, вінаў пладовых, вады пітной, крухмалу, чыпсаў, кісялю, крупаў.

Прадпрыемства забяспечвае 40 % патрэбнасцяў унутранага рынку алкагольных напояў. Высока цэніцца прадукцыя «Крышталя» і за мяжой: у ЗША, Канадзе, Германіі, Латвіі, Літве, Эстоніі, Турцыі, Арменіі, Польшчы, Кітаі, В'етнаме, Грузіі, Абхазіі, Ізраілі, Азербайджане, Гвінеі. На працягу больш як ста гадоў якасць прадукцыі кампаніі застаецца стабільна высокай, а смак бездакорным, дзякуючы чаму інтарэс да прадукцыі «Крышталь» не слабее. Прадпрыемства мае вядомыя ва ўсім свеце брэнды: гэта гарэлка «Белая Русь», «Мінская Крышталь», «Крышталь Прэзент», «Крышталь Эталон», «Хлебнае віно», настойка горкая «Белавежская», бальзам «Беларускі». З кожным годам на прадпрыемстве ўдасканальваецца матэрыяльна-тэхнічная база, укараняецца новае абсталяванне і сучасныя тэхналогіі.

**Кар. «Звязды».**



УНП 600013329

# ЯК МЫ ПРАРЫВАЛІСЯ Ў БЕЛАРУСКІ ШОУ-БІЗНЭС



Новы скандальны беларускі гурт HandmadE (злева направа): саліст Яўген ВАЛОШЫН, бубнач Іван МАХНОВІЧ, кіраўнік і гітарыст Андрэй МАРКУЦ, акардэаніст Максім КВЯТКОЎСКІ. А прадзюсер, Глеб ЛАБАДЗЕНКА, фатаграфуе.

**Карэспандэнты «Звязды» Яўген ВАЛОШЫН і Глеб ЛАБАДЗЕНКА атрымалі заданне выбіцца ў беларускія артысты. За некалькі месяцаў яны з дапамогай прафесійных музыкаў запісалі песню ў найлепшай якасці і знялі кліп на беларускім тэлебачанні. Пасля Новага года ўсё гэта пойдзе ў эфір. Гэты артыкул можа стаць практычным дапаможнікам для тых, хто таксама марыць зрабіцца артыстам беларускай сцэны.**

Дыджэі з нашых радыёстанцый дагэтуль ляяцца: з песнямі некаторых нашых артыстаў толькі па кароўніках з гастролямі ездзіць. У эфір FM-станцый такое ставіць сорамна, музыка гучыць, як заезджаная пласцінка з бабулінага грамафона. Такое вы, напэўна, чулі шмат ад каго. Хоць мне некаторыя спявачкі вельмі падабаюцца. Напрыклад, Ганна Шаркунова. Асабліва як апране спадніцу і напамадзіць вусны. Таму з рознымі дыджэямі я не згодны. Паспрабавалі б самі стварыць мегахіт, каб паненкі на дыскатэках скакалі, не шкадуючы сілаў.

— Валошын! Трэба ратаваць шоу-бізнэс! Час ідзе, а новых саладухаў не з'яўляецца! — палымяна вяшчаў карэспандэнт Лабадзенка, пастукваючы далоней па гарачым італьянскім пяску.

Прыкладна пра гэта мы размаўлялі ў верасні за піцілітровай пляшкай віна з карэспандэнтам і паэтам Глебам Лабадзенкам на беразе Міжземнага мора ў мястэчку Кастэльфузана.

*— Валошын! Трэба ратаваць шоу-бізнэс! Час ідзе, а новых саладухаў не з'яўляецца!* — палымяна вяшчаў карэспандэнт Лабадзенка, пастукваючы далоняй па гарачым італьянскім пяску. *— Я напішу верш, ты — музыку, і праспяваеш. У цябе голас больш звонкі.*

Назаўтра была складзена кампазіцыя пра шчымлівае каханне, якую першым паслухаў наш курортны сябар нігерыец Прынц Іма.

*— Зэт із грэйт!* — прамовіў Іма пасля праслухоўвання песні і працягнуў па-англійску: *— Не спыняйцеся, вас чакае поспех. Гэта я вам кажу! Калі б быў ваш канцэрт, я б ведаеце куды купіў білет? Не на балкон, не на бельэтаж, а на самы першы рад!*

Прынц Іма — шырокай душы чалавек, вегетарыянец, нават камара забіць баіцца. Такі грамадзянін благога не параіць. У Беларусь мы вярталіся шоу-бізнэсменамі-пачаткоўцамі.

### «Гэта ўзровень! Пугачова ў параўнанні з табой — нішто!»

Калі Іму нашы песні ляглі на душу, то ці ацэняць іх звычайныя беларусы? І перш-наперш я праспяваў пад гітару новаспечаныя хіты мужыкам у сваім гаражным кааператыве. Якраз ладзілася карпаратыўная вечарына — адзначалі Дзень нарадзінаў аднаго аўтамеханіка.

*— Ого!* — вынес вердыкт старшыня гаражнага кааператыва дзядзька Слава. *— Гэта ёсць мастацтва, трасца мне ў бок! Гэта, Жэка, узровень! Я б Пугачову да цябе нават на падпеўкі не пусціў.*

— Толькі менш рэпаў рабі, больш спявай, зацягнута, пранікнёна, каб душа разгарнулася, а потым загарнулася, — раіў яшчэ адзін музычны крытык з гаража Міхалыч. — У цябе вялікая будучыня.

Але ці ёсць сэнс сунуцца на вялікую сцэну без свайго ўласнага гурта?

*— Вядома, не!* — навучаў карэспандэнт Лабадзенка. *— Трэба, каб барабаны былі, некалькі гітар, труба, а лепш піяніна. І тады Дарафееву з гуртом «Топлес» дакладна перагонім.*

Шукаць музыкаў мы выправіліся ў Ліцэй БДУ. Яго я калісьці скончыў і ведаў, што менавіта тут працуе аўтарытэтны гітарыст Андрэй Яраслававіч Маркуц — першы беларускі кампазітар, які запісаў альбом свайго рок-гурта з сімфанічным аркестрам. Да таго ж мы ведалі, што Андрэй Маркуц прадае свае песні за мяжу, часта іграе як сесійны музыка, служыў у савецкім войску. Біяграфія — хоць гімны складай. Карацей, калі рабіць мегапраект, то толькі з такім вопытным чалавекам. Яго і прызначылі начальнікам па музычнай частцы. Андрэй Маркуц у сваю чаргу прыцягнуў у новы гурт яшчэ двух цудоўных музыкаў — акардэаніста Максіма Квяткоўскага і вельмі роўнага бубнача Івана Махновіча. Карацей, такія музыкі, што нават братам Калдунам не сніліся.

Назваць гурт карэспандэнт Лабадзенка прапанаваў па-замежнаму — HandmadE, што ў літаратурным перакладзе на беларускую — «эксклюзіў». Каб любы Саша Нема ведаў, што мы не «два прытопы, тры прыхлопы» прыйшлі паказваць, а цэлае мастацтва.

Рэпеціравалі каля месяца, і вось прыйшоў час выступаў. Але як пра сябе заявіць на шырокую аўдыторыю?

### «Вы далі газу! Але ганарару не атрымаеце»

Найперш папрасілі сяброў з музычнага сайта «Тузін гітоў» (music.fromby.net) надрукаваць пра нас артыкул, у якім размясцілі свае фотаздымкі, запісы з рэпетыцыяў. Праз сайт на нас пачалі выходзіць арганізатары канцэртаў. Вось вам і інтэрнэт!

Першыя канцэртныя прапановы прыйшлі з суседняй Літвы. Дарогу і пражыванне нам злёту ўзяліся кампенсаваць. Што ж, для першага разу дастаткова. На наш дэбютны канцэрт, які адбыўся ў віленскім клубе Pogo, набілася некалькі сотнь чалавек. Клуб быў маленькі і ўтульны, таму не тое што яблыку—мандарыну не было дзе ўпасці. Палова аўдыторыі — гэта беларускія студэнты, якія навучаюцца ў Літве і прыйшлі на канцэрт з-за тугі па Бацькаўшчыне.

Больш за ўсё публіцы спадабаліся песні пра каханне, зоркі і беларускія зімы. Высветлілася, што пад нашу музыку і патанчыць можна. Таму да другога канцэрта, які адбыўся ў віленскім клубе Artistiko яшчэ праз адзін месяц, я асабіста напісаў некалькі танцавальных кампазіцый. Адна з іх — «Энергі». Хто не ведае, гэта такі модны танец. У песні апавядаецца пра міліцыянера, які пайшоў на дыскатэку, падпіў і стаў чапіцца да бялявых паненак.

*— Ачу!* — дзякавалі арганізатары канцэрта. *— Вы далі газу! Але ганарару не атрымаеце. Замест гэтага прапаноўваем вам запісаць песні на нашай студыі...*

Прапанова была прынятая, студыйных запісаў у нас на той момант не было.

Пасля гурт **HandmadE** атрымаў яшчэ некалькі канцэртных прапаноў. У канцы зімы едзем выступаць у Маскву. Яшчэ адна сяброўчка занесла рэпетыцыйныя запісы варшаўскаму арганізатару канцэртаў — і туды нас запрасілі выступіць на адзін з літоўскіх фестываляў.

Было выступленне і ў Беларусі, на адной з карпаратыўных вечарын у клубе «Панарама». Знаёмыя спартсмены адзначалі ў снежні Дзень нарадзінаў свайго клуба «Патрыёт» і запрасілі нас выступіць як самы патрыятычны малады гурт.



Кадры з нашага мегакліпа на песню «Вуліца-дым».

І ўсё ж на Бацькаўшчыне нас больш нікуды не клікалі. Хоць я напісаў новыя хіты — «Беларусь — гэта рай!» і «Наркотыкі — гэта зло!» Нават яны не паўплывалі на рост папулярнасці. Што тут сказаць? Ці то канцэртнае жыццё ў нас, як у першабытнай пячоры, ці то за кожным кустом сядзіць нядобразычлівец, які не пускае на сцэну нас — ідэйна правільны гурт. Зразумелі мы і яшчэ адну істотную праблему: без якасных запісаў дарога ў шоу-бізнэс закрытая.

### Як запісаць песню, каб гучала па-еўрапейску?

Запісаўшы скопам некалькі кампазіцый на літоўскай студыі, мы зразумелі, што дзеля такой важнай справы часам мала і аднаго месяца.

*— Тут ты няшчыра праспяваў, тут прахрыпеў, а тут не патрапіў у ноту,* — крытыкаваў карэспандэнт Лабадзенка. *— Што сказаў бы Аляксей Хлястоў? А трэба, каб кожны сабе нашу музыку замест будзільніка паставіў. Каб і мая бабуля гэта слухала, парнаграфіяй не называла. Каб суседка Валечка ў плэер запампавала, задавальненне атрымлівала, у метро станцыі блытала.*

Павыціраўшы горкія мужчынскія слёзы пасля такіх слоў, мы ўсім гуртом выправіліся ў аўтарытэтную музычную студыю. Гадзіна запісу там каштуе 45000 беларускіх рублёў. Якасць — еўрапейская. Песню «Вуліца-дым» паклалі на гук за тры дні.

**ДЗЕ МОЖНА ПАСЛУХАЦЬ ПЕСНІ ГУРТА HANDMADE?**

*Усе студыйныя кампазіцыі гурта і ўзгаданы ў артыкуле кліп выстаўлены на блогу карэспандэнта Лабадзенкі — labadzenka.by. А ўвогуле мы чакаем запрашэнняў і гатовыя выступаць для беларусаў па ўсёй краіне. І абяцаем, што гэта будзе не якое-небудзь фіфі-рыфі, а сапраўднае шоу.*

Наступны этап — скампанаваць усе запісаныя інструменты ў адно цэлае. Працэс называецца звядзеннем. Ніводзін з варыянтаў беларускіх майстроў нам не падышоў, усё выходзіла неяк няўцямна, непразрыста. Знаёмы беларускі басіст Косцік з гурта IQ48 параіў нам гукарэжысёра з Польшчы. А гэта маэстра Сяргей Лабандзіеўскі па мянушцы Шлёма.

*— Раней Шлёма жыў у Мінску, беларускамоўным*


Так мы запісвалі вакал на моднай студыі.

*робіць зніжкі,* — рэкламаваў басіст Косцік гукарэжысёра. *— Вельмі творчы чалавек, багемны, спіць да дванаццаці гадзін дня. А ведалі б вы, як выконвае працу! Майкл Джэксан — і той пазайздросціў бы, зямля яму пухам!*

— Думала — будзе горш, — ацэньвала кліп свецкая львіца Люся Лушчык, праглядаючы яго на ноўтбуку. — Нясіце яго на музычны канал, калі што, я дапамагу. Сюжэт, трэба сказаць, просты, але колеркарэкцыя зроблена нармальна.

Запісы перадалі Шлёме цягніком, і праз месяц песня была гатовая.

### Як зняць нармальны кліп за малыя грошы?

Студыйны запіс — гэта добра, але, як разумееце, без кліпа ў сучасным шоу-бізнэсе будзеш смактаць лапу. Маладзёны гадзінамі прырастаюць да тэлевізараў, глядзяць музычныя каналы і забываюцца пра ўсё на свеце. Чым, як не кліпам іх замбіраваць?

*— На тэлеканале «Лад» у мяне ёсць знаёмы, Толік Вечар, наш вядомы кліпмейкер, трэба яму патэлефанаваць,* — выказаў ідэю Андрэй Маркуц.

Ужо праз два тыдні пасля тэлефанавання кліп-брыгада з праграмы «Прасоўванне» вывезла нас на сталічную вуліцу Кастрычніцкую, дзе ў свой час здымалі расійскі фільм «Стылягі». Узялі ў арэнду рэтрамабіль — Газ 1967 года выпуску. На ім мы і каталіся па вуліцы Кастрычніцкай большую частку кліпа.

*— А яшчэ мы будзем выкарыстоўваць недзіцячыя спецэфекты,* — паабяцала вядучая праграмы Аксана Вечар. *— Здымем горад і павялічым хуткасць у 2000 разоў. На гэты фон выражам вас.*

Карацей, атрымаўся поўны Галівуд, Мадонна заплача. Кліп знялі за тры гадзіны, змантаравалі за некалькі дзён.

*— Хоць спецэфекты гэтыя выглядаюць несучасна, але для першага кліпа падыдзе,* — ацаніў карэспандэнт Лабадзенка. *— Я тут з дзяўчаткамі пазнаёміўся ў Акадэміі мастацтваў, яны таксама гатовыя зняць нам кліп. Ім усё адно трэба дыпломныя работы выконваць. Але гэта справа ўжо наступнага года.*

Прэзентацыя нашага першага кліпа «Вуліца-дым» адбылася ў канцы лістапада на «Ладзе» ва ўзгаданай перадачы «Прасоўванне». Як высветлілася, паглядзелі прэзентацыю нават у вёсцы Ямпаль Рэчыцкага раёна, дзе жыве мая бабуля. Значыць, механізмы шоу-бізнэсу пачалі спрацоўваць.

*— Думала — будзе горш,* — ацэньвала кліп свецкая львіца Люся Лушчык, праглядаючы яго на ноўтбуку. *— Нясіце яго на музычны канал, калі што, я дапамагу. Сюжэт, трэба сказаць, просты, але колеркарэкцыя зроблена нармальна.*

Такім чынам, уваходзіны ў беларускі шоу-бізнэс атрымаліся. А наступны год дэсант «Звязды» пачне са штурму радыёстанцый і тэлеканалаў. Беражыцеся, Іскуі Абалян і Паліна Смолава!

**Яўген ВАЛОШЫН.**

**У ЯКІЯ ГРОШЫ НАМ АБЫШЛІСЯ ЎВАХОДЗІНЫ Ў ШОУ-БІЗНЭС?**

*Запіс і звядзенне песні на 3 хвіліны 20 секунд — 1189000 рублёў.*

*Кліп (набыццё правоў+арэнда рэтрамабіля) — 986000 рублёў.*

*Калі пра гэтыя грашовыя ўкладанні чуюць іншыя музыкі, то называюць іх рэкордна малымі.*

# СУСТРЭНЕМСЯ Ў 2010-м!



## СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.28 | 15.57 | 7.29 |
| Віцебск — | 8.26 | 15.39 | 7.13 |
| Магілёў — | 8.19 | 15.47 | 7.28 |
| Гомель — | 8.07 | 15.52 | 7.45 |
| Гродна — | 8.42 | 16.14 | 7.32 |
| Брэст — | 8.34 | 16.23 | 7.49 |

**Месяц**
*Поўня ў 21.14.*
*Месяц у сузор'і Рака.*

**Імяніны**
**Пр.** *Зоі, Мадэста, Марка, Міхаіла, Сімяона.*
**К.** *Меланії, Сільвестра.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.


І Дзеду Марозу бывае холадна...




## 31 снежня

*Дзве даты*

**1918 год** — у Смаленску VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП (б), на якой прысутнічалі 174 дэлегаты ад Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай, Смаленскай, Віленскай і Чарнігаўскай губерняў, абвясціла сябе І з'ездам камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі і прыняла пастанову аб стварэнні Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі.



**1879 год** — амерыканскі вынаходнік Томас Эдысан упершыню прадэманстраваў электрычную лямпачку напальвання.

*Цытата дня:*

***«Нават у кампаніі двух чалавек я абавязкова знайду, чаму ў іх павучыцца. Іх станоўчыя якасці я пастараюся пераняць, а на іх недахопах сам буду вучыцца».***

**Канфуцый (551—479 да н.э.), кітайскі філосаф.**

# «ЗА ТЫХ, ХТО ПОРУЧ!»

## КАЛЯДНАЯ ГІСТОРЫЯ

Да новага года застаецца не так многа часу, і ўжо ясна, што наўрад ці паспее здарыцца нешта такое, каб я сказала: «О, гэта быў самы шчаслівы год майго жыцця!»

У нейкі час мне наогул стала здавацца, што гэта вельмі кепскі год. І для мяне, і для ўсіх маіх знаёмых. Я нават падзялілася гэтым уражаннем з сяброўкай.

— А не трэба было рабіць гатычную вечарынку на Новы год! — быў мне адказ.

Сапраўды, 31 снежня ў мяне сабраліся людзі ў чорным. Жанчыны, мужчыны, нават маленькія дзеці... Тады гэта здавалася смешным, ці, як сёння кажуць, прыкольным, а вось калі пачаліся непрыемнасці... Калі пачаліся непрыемнасці, я паглядзела на гэта зусім іншымі вачыма.

«Усё!» — клялася сабе я некалькі месяцаў. — «У гэтым годзе ніякай чарнаты! Толькі пазітыў, самыя яркія колеры, якія сімвалізуюць здароўе і багацце...»

І вось, з набліжэннем Калядаў, я стала задумвацца, які колер самы шчаслівы...

Іду па вуліцы і сама сабою пра гэта разважаю. І тут — упс! — сустракаю сваю аднакурсніцу. І не проста сустракаю, а ў тую ж хвіліну згадваю, што менавіта з ёю сустракала 2009 год!

Гэта значыць, я з вялікай кампаніяй сустрэла Новы год па расійскім часе — у чорным, а пасля — ужо з іншай невялікай кампаніяй — наш, беларускі Новы год. І ў 24.00 я была не ў чорным! Я была ў белым з чорным узорам.

І адразу ж 2009-ы падаўся мне ўжо не такім змрочным. А нават вельмі светлым, хоць і з плямкамі цемры...

Дзіўна, але я абсалютна забылася на тое, што сустрэла Новы год два разы, з дзвюма рознымі сяброўкамі! Я бачу гэтаму толькі адно тлумачэнне — лёсы маіх сябровак настолькі падобныя, што аб'яднаныя для мяне ў адну гісторыю.

...Выйшлі замуж яны рана, у дваццаць, за такіх жа маладых хлапцоў. І каханне было, і маладосць, і дзеткі нарадзіліся, а вось жа не склалася. Дзяўчаты былі амбітныя, актыўныя, худыя... А хлопцы, якраз наадварот — ленаватыя, без агню, такія сабе цельпукі.

Розніца тэмпераментаў была навідавоку, ды і жыць даводзілася ў бацькоў... Карацей, распаліся гэтыя шлюбы хутка, хоць і без асаблівых скандалаў. Жыццё пацякло далей. Дзяўчаты пакідалі свае ранейшыя працы ў школе, і забыўшыся на адукацыю, сталі менеджарамі — дзе яшчэ знайсці грошы на ўласнае жытло, як не ў бізнэсе?

Адна марыла пра ўласную кватэру, другая — дабудаваць пакой у бацькоўскім доме. Але грошы збіраліся марудна — калі ты працуеш на чужога чалавека, то колькі б ты ні пахаў, ні круціўся, грошы не прыбываюць... Толькі праз пэўны час сустрэлі яны мужчынаў сваёй мары. Мужчынаў, якія дапамаглі ім і з працай, і з жытлом. Мужчыны былі б ідэальныя, каб не адна акалічнасць — у іх ужо былі жонкі і дзеці. Так, яны былі на добрае дзесяцігоддзе старэйшыя за маіх сяброваk, таму было б дзіўна, каб у такіх цудоўных мужчынаў дый не было сем'яў!

І сем'янінамі яны былі адметнымі. Купляюць, напрыклад, што-небудзь у хату маім дзяўчатам — і сабе ў дом бяруць такое ж. Гэтая акалічнасць вельмі весяліла маіх сяброваk. Хоць якое тут вяселле, калі чалавек з табой цэлы дзень, а на ноч едзе да жонкі?

Спачатку яны перажывалі, плакалі, а пасля не тое, каб прызвычаіліся, а проста не мелі часу, каб перажываць. Дзеці растуць, рамонты ідуць, толькі паспявай працаваць! Бо «мужчыны мары» хоць і дапамагалі, аднак і на шыі ў сябе сядзець не дазвалялі —- там ужо былі жонкі з дзецьмі. І сталі мае дзяўчаты self made woman — жанчынамі, якія зрабілі сваё жыццё. З цягам часу мужчыны ім сталі ў цяжар, бо тут працы поўна, па доме клопатаў, дзеці школы заканчваюць... А кавалерам трэба ўвага, пяшчота, разуменне. Ды і з узростам яны здаравейшымі не сталі, балячкі замучылі. І рады б сяброўкі вызваліцца, ды ўдзячнасць не дазваляе.

Толькі жыццё — рэч хітрая, тут такія павароты лёсу, што і не прыдумаеш! Адзін з мужчын захварэў, ды так страшна, што і расказваць не хочацца... А як толькі стала ясна, што справы яго дрэнь, жонка яго з дому і выгнала. Раптам высветлілася, што яна ўсе гэтыя гады была ў курсе яго любоўнай гісторыі, але вось цяпер якраз знайшла час яму пра гэта сказаць... Так што памірaў мужчына на руках у сваёй каханкі, якая на дабро яго і падтрымку не забылася.

А другі мужчына жывы. Толькі крызіс з'еў увесь яго невялікі бізнэс. А як справа ўсяго яго жыцця разбурылася, стала руйнавацца і здароўе. Як у чалавека, які ўсё жыццё працаваў, здаў у яго хрыбетнік. Ні падняцца, ні сесці, масаж ды абязбольвальныя. І з жонкай тая ж гісторыя! Каму ж трэба інвалід у хаце? Вось і адсялілі яго ў асобную невялікую кватэру, дзе некалі жылі яго бацькі. Сяброўка ў другую кантору пайшла працаваць, таму ёй цяпер яшчэ і лекі купляць...

...Але ж гэта калядная гісторыя, і яна не можа скончыцца дрэнна! Таму давядзецца мне расказаць яе далей, прамінуўшы мараль... Сяброўкі мае з нецярпеннем чакаюць Новага года. Ніколі не здагадаецеся чаму! Таму што на свята прыйдуць да іх дзяцей былыя мужы!

За той час, што жаночая палова гэтай гісторыі віла гнёзды, мужчынская частка паспела апярыцца, вырасці, стаць самастойнымі, завесці свой бізнэс! І нават пахудзець! Цяпер яны сталі цікавымі мужчынамі ў самым росквіце сілаў, за іх увагу змагаюцца маладзенькія дзяўчаты, якім сёння трэба крэпкае надзейнае плячо... А хто казаў, што яны на ўсё жыццё застануцца інфантыльнымі? Так што цяпер мае сяброўкі занятыя прыдумляннем святочных убораў — а раптам атрымаецца ў іх па другому разу ўвайсці ў адну і тую ж раку...

Так што, дарагія мае чытачкі, менш углядайцеся ў святочныя люстэркі! Разглядайце тых, хто сёння поруч з вамі! Можа той, хто сёння здаецца вам гадкім качанём, і ёсць тым непараўнальным мужчынам Мары. Тым, з кім варта правесці ўсе астатнія гады свайго жыцця. Тым, хто раздзеліць з вамі не толькі бліскучую паласу вашага жыцця, але і тую, на якой будуць непазбежныя плямкі.

**Ганна КІСЛІЦЫНА.**

**ЗВЯЗДА**
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
**ЗАСНАВАЛЬНІКІ:**
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.
**Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года.**

**Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:** І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

**НАШ АДРАС**: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**ТЭЛЕФОНЫ**: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

**ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ:**
**тэл./факс:** 287 17 79,
***e-mail:*** reklama@zvyazda.minsk.by.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».**
**ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.**
**220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**
**Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32345. Індэкс 63850.**
**Зак. № 7120. Нумар падпісаны ў 19.30.**
**М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**
**П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**